





ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

XVI—XVIII стст.

7

КАРАЛІ ПОЛЬСКІЯ І ВЯЛІКІЯ КНЯЗІ ЛІТОЎСКІЯ

Вятыны

Аўгуст III (1733—1763)

Аўгуст II Моцны (1697—1706, 1709—1733)

Станіслаў Аўгуст Панятоўскі (1764—1795)

Станіслаў Ляшчынскі (1704—1709)

Ян III Сабескі (1674—1696)

Міхаіл Карыбут Вішнявецкі (1669—1673)

Вазы

Уладзіслаў IV (1632—1648)

Ян II Казімір (1648—1668)

Жыгімонт III (1587—1632)

Стафан Баторый (1576—1586)

Генрых Валуа (1573—1574)

Ягайлавічы

Жыгімонт II Аўгуст (1548—1572)

Аляксандр (1492—1506)

Жыгімонт I Стары (1506—1548)

Казімір

АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ў канцы XVI ст.

Маштаб 1:4 500 000
(у 1 см 45 км)



ПАДЗЕЛЫ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ



ВІЛЬНЯ Сталіцы дзяржаў

Магілёў Іншыя населеныя пункты

Граніцы дзяржаў у пачатку 1772 г.

Рэчы Паспалітай напярэдадні падзелаў

паміж ВКЛ і Каралеўствам Польскім; залежных дзяржаў

Тэрыторыі Рэчы Паспалітай, якія адышлі

	да Аўстрыі	да Прусіі	да Расіі
паводле першага падзелу (1772 г.)			
паводле другога падзелу (1793 г.)			
паводле трэцяга падзелу (1795 г.)			

Тэрыторыі Асманскай імперыі і яе васалаў, якія адышлі

да Аўстрыі да Расіі

Гады далучэння тэрыторый

1772 да Аўстрыі

1772 да Прусіі

1772 да Расіі

Месцы і даты стварэння

1767 Слуцкай канфедэрацыі

1767 Торуньскай канфедэрацыі

1768 Барскай канфедэрацыі

1792 Таргавіцкай канфедэрацыі

К Прыняцце Канстытуцыі 3 мая 1791 г.

Абвяшчэнне акта паўстання 24 сакавіка 1794 г.

Тэрыторыі, ахопленыя паўстаннем 1794 г. пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі

Сучасная граніца Рэспублікі Беларусь

Лічбамі пазначаны: 1 — курфюрства Саксонія; 2 — Крымскае ханства (васал Асманскай імперыі)

Маштаб 1:6 500 000
(у 1 см 65 км)

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ
XVI—XVIII стст.

Вучэбны дапаможнік
для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Пад рэдакцыяй
кандыдата гістарычных навук дацэнта *В. А. Вароніна*,
кандыдата гістарычных навук дацэнта *А. А. Скеп'ян*

Дапушчана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2017

Правообладатель Издательский центр БГУ

УДК 94(476)"15/17"(075.3)
ББК 63.3(4Беи)я72
Г51

А ў т а р ы:
В. А. Варонін — § 1—6, 16, 18;
А. А. Скеп'ян — § 7—15, 17, 19, 22—24, 29;
А. У. Мацук — § 20—21, 25—28;
В. В. Краўчанка — метадычнае забеспячэнне

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (дацэнт кафедры, кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А. У. Любы*);
магістр гістарычных навук, старшы выкладчык кафедры гісторыі і турызму ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт» *Я. У. Глазырын*; прафесар кафедры гісторыі Беларусі і ўсходніх славян установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова», кандыдат гістарычных навук, прафесар *П. Ф. Дзмітрачкоў*; настаўнік вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 56 г. Мінска» *П. М. Гламбоцкі*

Гісторыя Беларусі, XVI—XVIII стст. : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул.
Г51 сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. А. Варонін [і інш.] ; пад рэд. В. А. Вароніна, А. А. Скеп'ян. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2017. — 214 с. : іл.
ISBN 978-985-553-442-7.

УДК 94(476)"15/17"(075.3)
ББК 63.3(4Беи)я72

ISBN 978-985-553-442-7
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2017

Правообладатель Издательский центр БГУ

Прадмова

Дарагія сябры! Вучэбны дапаможнік, які вы трымаеце ў руках, прысвечаны багатаму на падзеі перыяду ў гісторыі Беларусі. Памятайце, што навука гісторыя не проста захоўвае памяць пра тое, што было. Яна стварае падмурак для далейшага развіцця народаў і краін. Таму пры засваенні гэтага прадмета самае важнае — разуменне сутнасці падзей, а не завучванне дат. У гісторыі ўсё мае свае прычыны і наступствы, і нават адзін чалавек можа паўплываць на ход найважнейшых падзей у развіцці краіны.

Увесь змест вучэбнага дапаможніка падзелены на чатыры раздзелы, якія адпавядаюць храналагічным перыядам развіцця беларускіх зямель у XVI—XVIII стст. Раздзелы складаюцца з параграфаў і заканчваюцца паўторна-абагульняльным урокам. Звярніце ўвагу на спецыяльныя значкі — піктаграмы. Яны дапамогуць вам лепш арыентавацца ў матэрыяле вучэбнага дапаможніка. Скарыстайцеся таблічкай значкоў, каб даведацца, што яны абазначаюць.

Кожны з параграфаў заканчваецца пытаннямі і заданнямі. Ёсць яны і ў тэксце. Паспрабуйце адказаць на пытанні. Гэта дазволіць вам лепш запомніць прачытаны матэрыял, зразумець дзеянні гістарычных асоб і падзеі той эпохі.

Найважнейшыя імёны выдзелены ***тлустым курсівам***, даты і паняцці — **тлустым шрыфтам**. Для таго каб вам было лягчэй з імі працаваць, выпішыце ў сшытак іх вызначэнні з тэрміналагічнага слоўніка і храналагічнай табліцы ў канцы вучэбнага дапаможніка. Вам трэба ведаць іх на памяць. Каб ваша карціна гістарычных падзей была больш поўнай, раім звярнуць увагу таксама на паняцці і даты, выдзеленыя *курсівам*.

Картасхемы, размешчаныя ў вучэбным дапаможніку, і карты ў атласе дапамогуць вам лепш разабрацца ў гістарычнай геаграфіі. Таксама ў іх утрымліваецца дадатковы матэрыял па тэмах. Гэтая інфармацыя можа спатрэбіцца вам пры адказе на пытанні пасля параграфаў.

Звесткі пра падзеі вы зможаце атрымаць таксама з гістарычных крыніц. Вытрымкі з іх прыводзяцца ў вучэбным дапаможніку. Памятайце, што гістарычныя крыніцы адлюстроўваюць асаблівасці светапогляду людзей таго часу. І таму мова і стыль дакументаў адрозніваюцца ад сучасных. У вучэбным дапаможніку вы знойдзеце біяграфіі гістарычных асоб. Дадатковыя звесткі пра іх, а таксама пра падзеі вы можаце пашукаць на розных электронных рэсурсах, у тым ліку размешчаных на нацыянальным адукацыйным партале. Яны дазволяць вам выканаць заданні са значком *, якія

Правообладатель Издательский центр БГУ

патрабуюць выкарыстання дадатковых крыніц інфармацыі ці носяць творчы характар.

Скарыстайцеся табліцай «Асноўныя даты і падзеі XVI—XVIII стст.». Яна дапаможа вам лепш запомніць даты і падзеі гэтага перыяду. З дапамогай спісу рэкамендаванай літаратуры і электронных рэсурсаў вы зможаце падрыхтаваць паведамленні, больш даведацца пра гісторыю свайго краю. Для лепшага разумення гісторыі Беларусі звяртайцеся і да іншых прадметаў: сусветнай гісторыі, геаграфіі, беларускай літаратуры. Мы спадзяёмся, што азнаямленне з гэтым гістарычным перыядам падштурхне вас да больш глыбокага і падрабязнага яго вывучэння.

 — Прапаноўвае ўспомніць раней вывучаны матэрыял ці паняцце

 — Канцэнтруе вашу ўвагу на галоўнай інфармацыі, якую вы атрымаеце з матэрыялу параграфа

 — Абазначае заданні да карты ў атласе ці картасхемы ў вучэбным дапаможніку

 — Звяртае ўвагу на пытанні і заданні пасля параграфаў, накіраваныя на замацаванне вучэбнага матэрыялу


10-11 — Рэкамендуе звярнуцца да хрэстаматыі (*Белазаровіч В. А.* Гісторыя Беларусі: другая палова XVI — канец XVIII ст.: 8-ы клас: хрэстаматыя: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі. Мазыр, 2015)

 — Цікавыя і займальныя звесткі пра гістарычныя падзеі

 — Дадатковы матэрыял, размешчаны на электронным адукацыйным рэсурсе «Гісторыя Беларусі. 7 клас» (нацыянальны адукацыйны партал http://e-vedy.adu.by)

 — QR-коды дазволяць праверыць свае веды пры дапамозе смартфона ці планшэта

 — Наведайце славутыя мясціны і музеі (іх спіс вы знойдзеце на нацыянальным адукацыйным партале http: //e-vedy.adu.by)

 — Азнаёмцеся з біяграфіяй гістарычнай асобы

Правообладатель Издательский центр БГУ



Беларускія землі ў першай палове XVI ст.



Раздзел I

Першая палова XVI ст. стала пераломнай эпохай для беларускіх зямель. Сярэднявечча адыходзіла ў мінулае, пачынаўся Новы час. Шматлікія пераўтварэнні значна змянілі аблічча краіны, надалі ёй больш сучасныя рысы. Перайначыліся эканоміка, культура, грамадства, сістэма кіравання дзяржавай. Беларускія землі сталі месцам, дзе сутыкаліся і ўзаемадзейнічалі заходнія і ўсходнія традыцыі. Глыбокі след пакінулі і войны з суседнімі дзяржавамі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 1. Развіццё дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага

Якія органы ўлады і дзяржаўныя пасады існавалі ў Вялікім Княстве Літоўскім у XV ст.?

Як змяніўся дзяржаўна-палітычны лад ВКЛ?

Сістэма кіравання дзяржавай. У канцы XV — першай палове XVI ст. Вялікае Княства Літоўскае (ВКЛ) было адной з самых магутных дзяржаў Еўропы. У яго склад уваходзілі сучасныя беларускія, літоўскія, украінскія і заходнія расійскія землі. Вялікае Княства распасціралася ад Балтыйскага мора да прычарнаморскіх стэпаў. Беларускія землі знаходзіліся ў самым цэнтры дзяржавы і былі добра развітым краем. Менавіта па гэтых прычынах яны займалі ў Вялікім Княстве Літоўскім вельмі важнае месца. Многія значныя падзеі ў гісторыі дзяржавы адбываліся менавіта на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

На беларускіх землях пражывала пераважна ўсходнеславянскае насельніцтва, праваслаўнае паводле веравызнання. У той час яно звалася рускім. Землі ВКЛ, якія калісьці належалі Старажытнай Русі, таксама называлі рускімі. Яны мелі надзвычай важнае значэнне для дзяржавы. Гэта было замацавана ў поўнай яе назве — Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае.

Знайдзіце на карце атласа Літву, Русь і Жамойць. Якія яшчэ гістарычныя землі ўваходзілі ў склад ВКЛ?

Вялікім Княствам было вельмі складана кіраваць. Яно падзялялася на *ваяводствы*, землі-намесніцтвы, удзельныя княствы і іншыя тэрытарыяльныя адзінкі. Права ў розных частках краіны даволі моцна адрознівалася. Агульнадзяржаўнае заканадаўства было яшчэ слаба распрацавана.

Успомніце, на якіх умовах у ВКЛ увайшлі Полацкая і Віцебская землі.

Уладаром дзяржавы быў вялікі князь, які насіў таксама тытул *гаспадар*. Да канца XV ст. ён меў вельмі моцную ўладу. Яна распаўсюджвалася практычна на ўсю сістэму кіравання, а таксама на

Правообладатель Издательский центр БГУ

войска і суд. Менавіта вялікі князь прызначаў людзей на розныя дзяржаўныя пасады *(урады)*. Гэтыя людзі называліся *ўраднікамі*. Яны павінны былі верна і старанна служыць гаспадару, выконваючы самыя розныя яго даручэнні. Можна вылучыць тры ўзроўні гэтых кіроўных пасад: агульнадзяржаўны (цэнтральны), прыдворны і мясцовы. Кожны ўраднік меў сваё кола абавязкаў.

Самымі значнымі пасадамі агульнадзяржаўнага ўзроўню ўлады былі канцлер, гетман, падскарбі земскі і маршалак земскі. *Канцлер* кіраваў канцылярыяй і распараджаўся вялікай дзяржаўнай пячаткай. Яна ставілася на ўсе найважнейшыя дакументы. *Гетман* камандаваў войскам. *Падскарбі земскі* адказваў за дзяржаўны скарб. *Маршалак земскі (найвышэйшы)* арганізоўваў працу і сачыў за парадкам на пасяджэннях велікакняжацкай Рады і сойма.

Свае асобныя пасады існавалі пры велікакняжацкім двары. У лік гэтых пасад уваходзілі маршалак дворны, падскарбі дворны, велікакняжацкі сакратар і некаторыя іншыя. І агульнадзяржаўныя, і прыдворныя ўраднікі ўваходзілі ў склад велікакняжацкай Рады. Яе называлі таксама **Панамі-Радай**.

Прадстаўнікамі вялікага князя на той ці іншай тэрыторыі дзяржавы былі яго *намеснікі*. Яны кіравалі гэтымі тэрыторыямі, адказвалі за іх абарону, чынілі суд над мясцовымі жыхарамі. Існавалі розныя віды намесніцтваў. Самымі ганаровымі з іх былі ваяводствы. Адпаведна, на самай высокай прыступцы па сваёй уплывовасці стаялі



▲ Ключ



▲ Пячатка



▲ Булава

? *Вызначце, якім ураднікам належалі гэтыя рэчы.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Знайдзіце на картасхеме на першым форзацы цэнтры ваяводстваў і даты іх утварэння.

ваяводы. Напачатку XVI ст. адразу некалькі беларускіх намесніцтваў былі пераўтвораны ў ваяводствы: Віцебскае, Полацкае, Новагародскае. Ніжэй стаялі *старасты* і *дзяржаўцы*. Намеснікам вялікага князя дапамагалі ўраднікі, якія выконвалі розныя спецыяльныя абавязкі.

Абмежаванне ўлады вялікага князя. У канцы XV ст. пачалі адбывацца важныя змены ў дзяржаўна-палітычным ладзе Вялікага Княства Літоўскага. Да гэтага часу правы велікакняжацкай Рады не былі дакладна вызначаны і не замацоўваліся ў законах. Вялікі князь мог пазбавіць месца любога з яе членаў. Іх парады не былі для гаспадара абавязковымі. Канчатковае рашэнне па ўсіх пытаннях прымаў менавіта ён. Паны-Рада былі незадаволены такім сваім падпарадкаваным становішчам. Яны пачалі патрабаваць змен, якія павялічылі б іх уплыў у жыцці дзяржавы. І гэта ажыццявіў новы вялікі князь — *Аляксандр* (гады кіравання *1492—1506*).

У **1492 г.** Аляксандр выдаў **прывілей**, якім пашыраў і замацоўваў правы велікакняжацкай Рады. Так, вялікі князь абяцаў не прызначаць нікога на пасады без узгаднення з Радай. Ён абавязваўся не здымаць нікога з пасад без даказанай віны. Гаспадар мусіў адпраўляць паслоў у замежныя краіны толькі са згоды Паноў-Рады. Акрамя таго, ён не мог цяпер аднаасобна пераглядаць судовыя рашэнні, якія прыняў супольна з Радай. Наступнікі Аляксандра яшчэ больш пашырылі правы радных паноў. Гэта было зроблена, напрыклад, у прывілеі 1506 г. і **Статуце Вялікага Княства Літоўскага 1529 г.** Усе пералічаныя новаўвядзенні аслабілі ўладу вялікага князя. Фактычна ён страціў магчымасць аднаасобна прымаць важныя дзяржаўныя рашэнні.



▲ Старонка Статута ВКЛ 1529 г.

Узрастанне ролі Паноў-Рады і сойма. У выніку гэтых пераўтварэнняў у канцы XV — пачатку XVI ст. адбылося канчатковае афарм-

Правообладатель Издательский центр БГУ

ленне Рады. У яе склад увайшлі ўсе вышэйшыя ўраднікі агульнадзяржаўнага і прыдворнага ўзроўняў, ваяводы і найважнейшыя намеснікі і старасты. Таксама ў гэты орган улады ўключаліся каталіцкія біскупы і некаторыя князі — напрыклад, Алелькавічы-Слуцкія. У ім вылучалася вузкае кола з пяці асоб, якія ўтваралі так званую найвышэйшую раду. З яе членамі гаспадар абмяркоўваў самыя важныя і сакрэтныя дзяржаўныя справы.

Склад велікакняжацкай Рады

Найвышэйшая рада Віленскі біскуп, віленскі ваявода, троцкі ваявода, віленскі кашталян, троцкі кашталян			
Каталіцкія біскупы	Ваяводы, найважнейшыя намеснікі і старасты	Канцлер, маршалкі, падскарбіі, гетман	Князі

? *Чаму менавіта гэтыя ўраднікі ўвайшлі ў склад велікакняжацкай Рады? Патлумачце свой адказ.*

На працягу першай паловы XVI ст. значэнне Паноў-Рады ўзрастала. У гэты час вялікія князі літоўскія былі адначасова і польскімі каралямі. Яны часта і падоўгу адсутнічалі ў Княстве, і тады дзяржавай кіравала велікакняжацкая Рада. Яна займалася пытаннямі абароны, вырашала фінансавыя справы, чыніла суд. Паны-Рада таксама выбіралі, хто з прадстаўнікоў паноўнай дынастыі Ягайлавічаў стане вялікім князем. Так былі абраны і Аляксандр, і яго пераемнікі. Але роля Рады пачала змяншацца з ростам значэння сойма.

Агульнадзяржаўны (вальны) **сойм** складваўся ў першай палове XVI ст. Праўда, соймы збіраліся ў Вялікім Княстве яшчэ ў XV ст. Але ў той час яны склікаліся даволі рэдка. Нагодамі для гэтага былі, напрыклад, абранне новага вялікага князя і унія з Польшчай. На сойм мог прыехаць тады любы шляхціц. Аднак галоўнае слова належала ў тыя часы вялікаму князю і Панам-Радзе.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Сойм 1505 г. Гравюра пачатку XVI ст.

? *Хто, на вашу думку, паказаны на гравюры? Як вы лічыце, што сімвалізуюць гербы зямель, адлюстраваныя на выяве?*

Аднак сітуацыя паступова мянялася, правы сойма пашыраліся. На гэта моцна паўплываў прыклад Польшчы і шматлікія войны, якія давялося весці Вялікаму Княству Літоўскаму. На польскіх соймах шляхта была ўжо сур'ёзнай сілай, і пра гэта выдатна ведалі ў Вялікім Княстве. Акрамя таго, у ваенны час кіраўніцтва дзяржавы ніяк не магло абысціся без падтрымкі шляхты.

Успомніце, што такое паспалітае рушэнне. Хто складаў яго аснову?

З ліста канцлера ВКЛ Альбрэхта Гаштаўта ў Польшчу

…І соймы нашы праходзяць зусім па-іншаму: што вырашаецца гаспадаром і Панамі-Радай, тое шляхта абавязкова бярэцца выконваць. Бо мы запрашаем шляхту на нашы соймы як бы дзеля гонару, а на самай справе дзеля таго, каб усім было вядома тое, што мы вырашаем…

Як Альбрэхт Гаштаўт патлумачыў неабходнасць удзелу шляхты ў пасяджэннях сойма?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Ужо ў *1511 г.* ***Жыгімонт I Стары*** (гады кіравання *1506—1548*) загадаў, каб для ўдзелу ў вальных соймах абіраліся па два шляхціцы ад *павета*. Такі парадак стаў нормай і замацаваўся надоўга. Прыкладна ў той жа час у дзяржаве пачалі склікацца мясцовыя шляхецкія з'езды. Яны выбіралі паслоў на агульнадзяржаўны сойм. Таксама яны маглі прымаць мясцовыя законы. Паступова шляхта пачала патрабаваць удзелу ў вырашэнні ўсіх важных праблем. На соймах сталі разглядацца пытанні, якія былі звязаны з нясеннем ваеннай службы, палітычным і гаспадарчым жыццём. Там абмяркоўваліся і прымаліся новыя законы, зацвярджаліся новыя падаткі і інш.

Большасць вальных соймаў праходзіла ў сталіцы дзяржавы — Вільні. Але яны збіраліся таксама ў іншых гарадах. На тэрыторыі Беларусі соймы асабліва часта праводзіліся ў Берасці (цяпер Брэст) і Гародні (цяпер Гродна). У іх працы прымалі ўдзел не толькі шляхціцы. На пасяджэнні запрашалася таксама каталіцкае, а часам і праваслаўнае духавенства. Там прысутнічалі і мяшчане буйны́х гарадоў, такіх як Вільня і Полацк. Але ўсё ж вальны сойм быў прадстаўнічым органам менавіта шляхецкага саслоўя. Яно складала большасць яго ўдзельнікаў. З ростам значэння шляхты ў дзяржаве павялічвалася і значэнне сойма.

У канцы XV — першай палове XVI ст. у дзяржаўна-палітычным ладзе Вялікага Княства Літоўскага адбыліся важныя змены. Ён набыў новыя, больш адпаведныя свайму часу рысы. Былі закладзены асновы ўзаемадзеяння трох самых важных асяродкаў улады ў дзяржаве. Імі сталі вялікі князь, Паны-Рада і вальны сойм.







1. Чаму Вялікае Княства Літоўскае было складанай для кіравання дзяржавай?
2. Патлумачце, якімі правамі і паўнамоцтвамі валодала велікакняжацкая Рада да і пасля 1492 г.
3. Прывядзіце не менш за два доказы таго, што ў першай палове XVI ст. роля шляхты ўзрасла.

Правообладатель Издательский центр БГУ

4. Як палітыка вялікіх князёў паўплывала на змены дзяржаўнага ладу ВКЛ? Патлумачце свой адказ.
5. Якія палітычныя сілы найбольш уплывалі на ўнутрыпалітычнае жыццё ВКЛ у першай палове XVI ст.?
6. Складзіце ў сшытку табліцу «Сістэма кіравання ВКЛ у першай палове XVI ст.».

Узроўні дзяржаўнай службы	Агульнадзяржаўны	Прыдворны	Мясцовы
Органы ўлады і службовыя пасады			
Паўнамоцтвы			

§ 2. Палітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага



Калі і на якіх умовах была заключана Крэўская унія?



Якія праблемы паўсталі перад Вялікім Княствам Літоўскім у пачатку XVI ст.?

Стасункі з Польшчай і адстойванне ВКЛ незалежнасці. У 1492 г. памёр вялікі князь літоўскі *Казімір Ягайлавіч*, які быў адначасова і польскім каралём. Польскае каралеўства выбрала сабе асобнага караля, а Вялікае Княства Літоўскае — свайго вялікага князя. Ім стаў Аляксандр, сын Казіміра. Асабістая *унія* (саюз) паміж Вялікім Княствам і Польшчай на нейкі час была разарвана. Аднак ужо ў 1501 г. дзве дзяржавы зноў вырашылі заключыць унію. Вялікі князь літоўскі Аляксандр быў абраны польскім каралём. Аднаўляючы саюз, кожная з дзяржаў імкнулася дасягнуць сваіх мэт. Вялікае Княства Літоўскае разлічвала на ваенную падтрымку Польшчы ў цяжкай вайне з Ма-

Правообладатель Издательский центр БГУ

сквой. Польшча ж імкнулася захаваць і ўзмацніць свой уплыў на Вялікае Княства. З 1501 г. ВКЛ і Польшча ўвесь час знаходзіліся ў асабістай уніі. Усе вялікія князі літоўскія былі адначасова і каралямі польскімі.

Тым не менш адносіны паміж саюзнымі дзяржавамі складваліся няпроста. Польшча лічыла, што менавіта яна будзе першынстваваць у гэтым саюзе. ВКЛ настойвала на тым, што саюзнікі павінны мець роўныя правы. Вялікае Княства доўгі час упарта і паспяхова адстойвала сваю незалежнасць. Яно мела ўласную сістэму ўлады і кіравання, дзяржаўны скарб і грошы, войска, законы, праводзіла самастойную знешнюю палітыку. Праўда, ВКЛ узгадняла з Польшчай свае дзеянні ў дачыненні іншых краін.



▲ Аляксандр Казіміравіч. Гравюра XVI ст.

Як вы лічыце, чаму ВКЛ даводзілася ўзгадняць сваю знешнюю палітыку з Польшчай?

Унутрыпалітычная сітуацыя. З канца XV ст. усё большы ўдзел у палітычным жыцці Вялікага Княства Літоўскага сталі прымаць знатныя вяльможы — паны. Многія з іх уваходзілі ў склад велікакняжацкай Рады. Здаралася, што яе члены не маглі прыйсці да згоды і канфліктавалі паміж сабой. Адзін з такіх вострых канфліктаў прывёў да *мяцяжу М. Глінскага*.

Напачатку XVI ст. князь ***Міхаіл Глінскі*** быў адной з самых значных асоб у дзяржаве. Ён займаў пасаду дворнага маршалка вялікага князя Аляксандра і ўваходзіў у склад Рады. Дзякуючы свайму досведу і здольнасцям М. Глінскі меў вялікі ўплыў на кіраўніка дзяржавы. Гэта выклікала незадавальненне іншых радных паноў. Новы вялікі князь Жыгімонт I Стары пазбавіў М. Глінскага пасад і месца ў Радзе. Глінскі палічыў гэта несправядлівым і незаконным. Разам з двума сваімі братамі ён у **1508 г.** узняў мяцеж супраць Жыгімонта.

Як вы думаеце, чаму М. Глінскі мог лічыць сваё адхіленне ад пасад незаконным?

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Жыгімонт I Стары. Медаль. 1527 г.

Кіраўнікі мяцяжу не мелі дакладна акрэсленай мэты і прадуманага плана дзеянняў. Яны спрабавалі дзейнічаць у розных частках ВКЛ, але галоўныя падзеі адбываліся на беларускіх землях. Цэнтрам дзеянняў першапачаткова стаў горад Тураў — уладанне М. Глінскага. Для таго каб пашырыць кола сваіх прыхільнікаў, лідар мяцяжу Глінскі абвясціў сябе абаронцам праваслаўнага насельніцтва. Але гэта не схіліла праваслаўных на яго бок. Не атрымаўшы дапамогі ад жыхароў Вялікага Княства, браты Глінскія пачалі шукаць яе за мяжой. Яны накіравалі сваіх прадстаўнікоў да вялікага князя маскоўскага Васіля III, крымскага хана і малдаўскага ваяводы. Васіль III нават прыслаў Глінскім на дапамогу войскі. Нягледзячы на гэта, атрады Глінскіх не атрымалі ніводнага значнага ваеннага поспеху. У выніку яны былі разбіты, а самі Глінскія разам з найбліжэйшымі паплечнікамі перабеглі ў Маскву.

Мяцеж М. Глінскага паказаў, што праваслаўнае насельніцтва захоўвала вернасць цэнтральнай уладзе. У выніку Жыгімонт I Стары стаў часцей прызначаць на высокія дзяржаўныя пасады прадстаўнікоў знатных праваслаўных родаў. Адным з іх быў князь Канстанцін Астрожскі. Ён зрабіў выдатную кар'еру і ў канцы жыцця займаў пасаду троцкага ваяводы, адну з самых высокіх у дзяржаве.

Барацьба з Вялікім Княствам Маскоўскім. У канцы XV ст. пачалі абвастрацца стасункі паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Вялікім Княствам Маскоўскім. Казімір Ягайлавіч надаваў мала ўвагі справам на ўсходзе. Тым часам Вялікае Княства Маскоўскае ўзмацнілася і ператварылася ў магутную дзяржаву. Вялікі князь маскоўскі Іван III заявіў свае правы на спадчыну Старажытнай Русі. Ён абвясціў сябе гасударом усёй Русі. З гэтага часу Вялікае Княства Маскоўскае прынята называць таксама Рускай дзяржавай. Намер Івана III аб'яднаць пад сваёй уладай усю Русь прама пагражаў Вялікаму Княству Літоўскаму.

Выкажыце сваё меркаванне, чаму гэта пагражала ВКЛ.

Правообладатель Издательский центр БГУ

У канцы XV — першай палове XVI ст. паміж дзвюма суседнімі дзяржавамі адбылося некалькі войнаў. Яны моцна змянілі палітычную карту Усходняй Еўропы на карысць Масквы. Самай няўдалай для



▲ Войны ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім у першай палове XVI ст.

? *На падставе картасхемы і тэксту параграфа прасачыце, як мянялася тэрыторыя ВКЛ у першай палове XVI ст.*

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Канстанцін Астрожскі. *Невядомы мастак*. XVIII ст.

Вялікага Княства Літоўскага стала вайна **1500—1503 гг.** У выніку гэтай вайны яно страціла велізарныя тэрыторыі на ўсходзе, у тым ліку раён Гомеля. Адной з галоўных падзей вайны **1512—1522 гг.** стала **бітва пад Оршай**, якая адбылася **8 верасня 1514 г.** У ходзе гэтай бітвы войска ВКЛ, узмоцненае польскімі атрадамі, разграміла значна большую армію маскоўскіх ваявод. Вялікая заслуга ў атрыманай перамозе належала выдатнаму палкаводцу князю К. Астрожскаму.



Канстанцін Астрожскі (каля 1460—1530) — ваенны і палітычны дзеяч, гетман ВКЛ, прадстаўнік старажытнага праваслаўнага княжацкага роду. У 1500 г. у бітве на р. Вядрошы трапіў у маскоўскі палон, але праз сем гадоў уцёк на радзіму. Праславіўся шматлікімі перамогамі над татарамі. Валодаў вялікай колькасцю маёнткаў, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі. Шмат зрабіў для падтрымкі праваслаўнай царквы ў ВКЛ.

З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі патлумачце, што садзейнічала перамозе войска ВКЛ у бітве пад Оршай.

Аршанская бітва належыць да ста самых значных бітваў еўрапейскай гісторыі. У ёй з абодвух бакоў удзельнічала некалькі дзясяткаў тысяч чалавек. У гэтай бітве войска ВКЛ атрымала самую вялікую сваю перамогу ў змаганні з Рускай дзяржавай.

Бітва пад Оршай стала істотным ваенным поспехам Вялікага Княства Літоўскага. Але яна не прынесла яму перамогі ў вайне, якая працягвалася яшчэ восем гадоў. Незадоўга да Аршанскай бітвы ВКЛ страціла буйны́ горад Смаленск, які перайшоў пад уладу Масквы. Вайна **1534—1537 гг.** была адзінай, што распачалася па ініцыятыве

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Бітва пад Оршай 1514 г. Фрагмент карціны XVI ст.

Вялікага Княства Літоўскага. Ніводзін з бакоў не атрымаў у ёй вырашальнай перамогі, але ВКЛ удалося вярнуць Гомель.

Абарона ад нападаў крымскіх татараў. У канцы XV ст. пагоршыліся стасункі Вялікага Княства Літоўскага і з Крымскім ханствам. Усё часцей ВКЛ сутыкалася з татарскімі нападамі, мэтай якіх было рабаванне маёмасці і захоп палонных. Наладзіць добрую абарону ад імклівай татарскай конніцы было вельмі складана. Таму даводзілася ўвесь час здабываць весткі з поўдня і быць гатовымі ісці ў пагоню за ворагам. У пачатку XVI ст. сітуацыя стала асабліва небяспечнай. Амаль штогод татары рабавалі паўднёвыя і цэнтральныя беларускія землі. Яны даходзілі да Слуцка, Менска і нават яшчэ далей на поўнач. Абарона Слуцка ад татараў стала асновай сюжэта фільма «Анастасія Слуцкая», які быў зняты ў 2003 г.

5 жніўня 1506 г. войска ВКЛ пад камандаваннем М. Глінскага разграміла татараў у цяжкай бітве пад Клецкам. Усе палонныя былі

Правообладатель Издательский центр БГУ



◀ Помнік на месцы Клецкай бітвы

? *Чаму асобнае месца ў помніку адведзена ўшанаванню М. Глінскага?*

вызвалены, а большая частка татарскага войска знішчана. Згодна з паведамленнем летапісу, «мала іх [татараў] вельмі да Арды дайшло». Клецкая бітва была слаўнай перамогай і значным вайсковым поспехам Вялікага Княства Літоўскага. Пасля гэтага татарскіх нападаў на беларускія землі стала менеў. Але цалкам спыніць іх удалося толькі ў сярэдзіне XVI ст.

Такім чынам, у канцы XV — першай палове XVI ст. ВКЛ сутыкнулася з сур'ёзнымі праблемамі ва ўнутранай і знешняй палітыцы. Мяцеж М. Глінскага не меў падтрымкі насельніцтва і быў задушаны. Да сярэдзіны XVI ст. урад здолеў спыніць татарскія напады на беларускія землі. Але войны з Рускай дзяржавай прывялі да страты вялікіх тэрыторый на ўсходзе.

1. У якія гады не існавала асабістай уніі паміж ВКЛ і Польшчай?
2. Складзіце апавяданне пра мяцеж М. Глінскага паводле плана: а) прычыны; б) калі і дзе адбываўся; в) вынікі.
3. Складзіце схему «Знешнепалітычныя праціўнікі ВКЛ у першай палове XVI ст.». Якія задачы стаялі перад кіраўнікамі Княства ў гэты час?

Правообладатель Издательский центр БГУ

4. Вызначце прычыны ваенных канфліктаў ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім. Чым тлумачыў вялікі князь маскоўскі Іван III сваё права на беларускія і ўкраінскія землі?
5. Намалюйце ў сшытку «стужку часу», адзначце на ёй асноўныя знешнепалітычныя падзеі першай паловы XVI ст. Зрабіце выснову аб міжнародным становішчы ВКЛ у вызначаны час.
6. З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі складзіце невялікія паведамленні пра К. Астрожскага і М. Глінскага.

§ 3. Гаспадарчае развіццё

Назавіце асноўныя гаспадарчыя заняткі сельскіх і гарадскіх жыхароў да XV ст. Што такое магдэбургскае права?

У чым заключаліся асаблівасці развіцця гарадоў і мястэчак? Што такое фальварак?

Стан сельскай гаспадаркі. У першай палове XVI ст. асновай эканомікі беларускіх зямель заставалася сельская гаспадарка. Яе асноўнымі галінамі па-ранейшаму былі раслінаводства і жывёлагадоўля. Самымі пашыранымі відамі збожжа былі азімае і яравое жыта, авёс, ячмень, пшаніца. Ураджай шмат у чым залежаў ад якасці зямлі і таго, як апрацоўвалі глебу. У першай палове XVI ст. на беларускіх землях існавалі тры асноўныя *сістэмы земляробства*: лядная (падсечна-агнявая), абложная і папарная. Самай прагрэсіўнай была папарная сістэма. Яна існавала ў той час у дзвюх формах. Больш даўняй і простай формай было *двухполле*, а больш сучаснай і дасканалай — *трохполле*.

У гэты час у сялянскай гаспадарцы гадаваліся коні, каровы, свінні і іншая свойская



▶ Малюнак XVIII ст.

Успомніце, чым адрозніваліся паміж сабой двухполле і трохполле. Як вы думаеце, якая сістэма земляробства паказана на малюнку? Абгрунтуйце свой адказ.

Правообладатель Издательский центр БГУ



◀ Старонка дакумента XVIII ст.

? *Як вы думаеце, як называецца промысел, паказаны на малюнку?*

жывёла і птушка. Ад сучасных яны адрозніваліся меншымі памерамі. Таму жывёлагадоўля не прыносіла такой колькасці прадуктаў, як зараз. Сельская гаспадарка не заўсёды магла забяспечыць сялян неабходнымі харчовымі запасамі. З гэтай прычыны, як і раней, вялікае месца ў жыцці вяскоўцаў займалі промыслы. Вельмі высока цаніліся мёд і воск. Іх у вялікіх аб'ёмах вывозілі за мяжу, а таксама спажывалі ў самой краіне. Поруч з бортніцтвам пачалося развядзенне і свойскіх пчол.

З вайсковай уставы 1507 г.

А хто пасячэ дрэва з пчоламі, таго… на шыбеніцу. А хто разбурыць борць, тады заплаціць паўкапы [30 грошаў], а штрафу пану гетману таксама паўкапы грошаў.

Як вы лічыце, чаму за знішчэнне дрэў з борцямі было прызначана такое жорсткае пакаранне? Знайдзіце адказ у тэксце параграфа.

Правообладатель Издательский центр БГУ

У XV ст. у краінах Заходняй Еўропы хутка раслі цэны на збожжа. Таму на ўсходзе Еўропы стала выгадна вырошчваць хлеб і прадаваць яго на захад. Так у Вялікім Княстве Літоўскім з'явіліся **фальваркі** — гаспадаркі феадалаў, у якіх вырошчвалі збожжа на продаж.

Фальваркі пачалі з'яўляцца на беларускіх землях яшчэ ў XV ст. Але значнае іх пашырэнне адбылося толькі ў наступным стагоддзі. Першыя фальваркі ўзніклі на захадзе беларускіх зямель, па цячэнні Заходняга Буга і Нёмана. Менавіта па гэтых рэках зручна было сплаўляць збожжа на захад, да партовых гарадоў Балтыйскага мора. Да таго ж мясцовая глеба была больш урадлівай. Спачатку ў фальварках вырошчвалі збожжа для вывазу за мяжу. Але пазней яно стала пастаўляцца і на ўнутраны рынак, для ўласных патрэб краіны. Гэта значна паскорыла развіццё яе эканомікі.

Фальварак складаўся з жылога дома шляхціца-землеўладальніка і розных гаспадарчых пабудоў. Да фальварка належалі таксама зямельныя ўгоддзі, і ў першую чаргу ралля. У полі і пры двары працавалі сяляне. Яны маглі выконваць самыя розныя павіннасці, але галоўнай стала адпрацовачная — *паншчына*. Такое вядзенне гаспадаркі атрымала назву *фальваркава-паншчыннай сістэмы*.

Развіццё гарадоў. У першай палове XVI ст. насельніцтва беларускіх гарадоў было адносна нешматлікім. Яно складала не больш за 15 % ад агульнай колькасці жыхароў краіны. Але значэнне гарадоў у гаспадарчым жыцці беларускіх зямель было дастаткова вялікім. Менавіта гарады выступалі галоўнымі цэнтрамі такіх важных і перспектыўных галін эканомікі, як рамяство і гандаль.



▲ Шляхі папаўнення насельніцтва гарадоў

Правообладатель Издательский центр БГУ

Немалое значэнне ў развіцці беларускіх гарадоў мела наданне ім **магдэбургскага права**. Часта разам з яго набыццём гарады атрымлівалі важныя эканамічныя правы і прывілеі. Гэта былі, напрыклад, бяспошлінны гандаль і права правядзення кірмашоў. Улада разлічвала, што з атрыманнем магдэбургскага права рамёствы і гандаль у гарадах будуць развівацца хутчэй. А гэта, у сваю чаргу, павялічыць прыбыткі скарбу. І ў канцы XV — пачатку XVI ст. беларускія гарады пачалі адзін за адным атрымліваць прывілеі на магдэбургскае права. Сярод іх былі *Полацк (1498), Менск (1499), Новагародак* (цяпер Навагрудак, *1511*).

Назавіце беларускія гарады, якія атрымалі магдэбургскае права яшчэ раней.

Адначасова гарады атрымлівалі асобныя органы ўлады і кіравання.



▲ Органы кіравання ў гарадах з магдэбургскім правам

*Пры дапамозе схемы ахарактарызуйце сістэму кіравання горадам. *А як цяпер называецца кіраўнік горада?*

З'яўленне мястэчак. Гарады былі цэнтрамі буйнога міжнароднага і абласнога гандлю. Яны стаялі на асноўных гандлёвых шляхах, і дзейнасць іх пашыралася на вялікія тэрыторыі. Для абслугоўвання ж мясцовых рынкаў на беларускіх землях яшчэ ў XV ст. пачалі ўзнікаць *мястэчкі*. Галоўнай іх прыкметай было рэгулярнае правядзенне таргоў

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Гаспадарчыя заняткі жыхароў мястэчак

і *кірмашоў*. Невялікія таргі праводзіліся штотыдзень у суботу ці нядзелю. Буйнейшыя ж кірмашы адбываліся некалькі разоў на год, звычайна па вялікіх царкоўных святах. Праўда, жыхары мястэчак не толькі гандлявалі. У іх былі і іншыя гаспадарчыя заняткі.

Першыя мястэчкі з'явіліся на захадзе беларускіх зямель. Сярод іх былі Відзы (XV ст.) і Іказнь (1504) на Браслаўшчыне, Будслаў у Ашмянскім павеце (1504). З цягам часу мястэчкі занялі вельмі важнае месца ў эканамічным жыцці краіны. Менавіта праз іх адбываўся абмен таварамі паміж горадам і вёскай. Мястэчкі хутка развіваліся, а многія з іх атрымалі магдэбургскае права. Яны вельмі доўгі час выконвалі немалую ролю ў гаспадарцы краіны. Мястэчкі праіснавалі на беларускіх землях да XX ст.

Рамесная вытворчасць. Рамёствы развіваліся практычна ва ўсіх тыпах паселішчаў: у вёсках, гарадах, мястэчках. Але самай дасканалай і разнастайнай была прадукцыя гарадскога рамяства. Каб сачыць за якасцю сваіх вырабаў і лепш іх прадаваць, рамеснікі згуртоўваліся тут у прафесійныя аб'яднанні. У першай палове XVI ст. яны называліся на беларускіх землях брацтвамі і сотнямі, а пазней — *цэхамі*.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Ганчар. Гравюра. XVI ст.

? *На аснове малюнка складзіце невялікае апавяданне пра працу ганчара.*

Большасць беларускіх рамеснікаў выраблялі прадукцыю з мясцовай сыравіны. Таму вельмі распаўсюджанымі былі такія спецыяльнасці, як ганчар, каваль, слесар, цясляр, гарбар, шавец.

Важным паказчыкам развіцця рамеснай вытворчасці была яе спецыялізацыя. Чым больш існавала прафесій, тым лепшымі былі вырабы адпаведных рамеснікаў. У першай палове XVI ст. працэс спецыялізацыі рамёстваў ішоў вельмі хутка. У беларускіх гарадах налічваліся ўжо дзясяткі рамесніцкіх прафесій. Так, напрыклад, у Полацку ў гэты час іх было больш за трыццаць.

Гандлёвыя сувязі і віды гандлю. У першай палове XVI ст. у гандлі беларускіх зямель адбыліся важныя перамены. Хутка павялічвалася колькасць новых гандлёвых паселішчаў — мястэчак. Моцна змяніўся і стаў больш разнастайным асартымент тавараў. У некалькі разоў павялічыўся вываз лесу і збожжа на захад. І, наад-

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Манеты ВКЛ: пенязь і паўгрошак. 1-я палова XVI ст.

варот, паменшылася значэнне футраў і воску, якія раней былі асноўным таварам, што вывозіўся ў заходнім напрамку. У Рускую дзяржаву везлі ў асноўным тканіны заходнееўрапейскай вытворчасці, металы, соль, прадметы раскошы. Беларускія гарады актыўна гандлявалі таксама са сваімі паўночнымі і паўднёвымі суседзямі. Увогуле ж, у міжнародным гандлі беларускія землі па-ранейшаму выконвалі ролю пасрэднікаў.



▲ Перавозка тавараў. Разьба на дне бочкі

Дзякуючы росту гарадоў і з'яўленню мястэчак актывізаваўся ўнутраны гандаль. Ён адбываўся і паміж абласцямі краіны, і на мясцовым узроўні. Жыхары ўсё больш уцягваліся ў таварна-грашовыя адносіны. Грошы сталі абавязковым атрыбутам гаспадарчага жыцця практычна ўсіх груп насельніцтва. Адпаведна, натуральная гаспадарка пачала адыходзіць у мінулае.

Што такое натуральная гаспадарка?

Такім чынам, у першай палове XVI ст. гаспадарчае развіццё беларускіх зямель прыкметна паскорылася. Гэтаму паспрыялі ўзнікненне ў краіне фальваркаў і пашырэнне яе ролі ў міжнародным гандлі. Усё гэта прыводзіла да развіцця таварна-грашовых адносін, росту гарадоў і ўзнікнення новага тыпу паселішчаў — мястэчак.

Правообладатель Издательский центр БГУ

1. Складзіце схему «Гаспадарчыя заняткі сялян у першай палове XVI ст.».
2. Растлумачце значэнне паняцця «фальваркава-паншчынная сістэма». Назавіце прычыны ўзнікнення фальваркаў на беларускіх землях.
3. Як вы разумееце выказванне: «Менавіта за гарадскімі сценамі яны маглі ўдыхнуць паветра волі, бо траплялі пад абарону магістрата»? Якія людзі і якія гарады маюцца на ўвазе?
4. Пры дапамозе тэксту вызначце прычыны ўзрастання ролі мястэчак з першай паловы XVI ст.

5*. Уявіце сябе на тагачасным кірмашы. Пералічыце тавары, якія вы маглі б там убачыць. Складзіце дыялог паміж пакупніком і замежным гандляром, выкарыстоўваючы матэрыял параграфа.

§ 4. Змены ў грамадстве

Што такое саслоўе? Які дакумент паклаў пачатак заканадаўчаму афармленню прыгоннага права ў Вялікім Княстве Літоўскім?

Як змянілася становішча розных груп і пластоў насельніцтва беларускіх зямель?

Становішча сялянства. У першай палове XVI ст. самым шматлікім саслоўем беларускага грамадства заставалася сялянства. Вяскоўцы-земляробы складалі ў той час каля 85% ад агульнага насельніцтва краіны. Але на сацыяльнай лесвіцы яны займалі самую ніжнюю прыступку. Сялянства мела вельмі абмежаваныя правы, якія да таго ж увесь час скарачаліся. Напрыклад, сяляне не маглі распараджацца сваёй зямлёй: прадаваць яе, закладаць, абменьваць. Лічылася, што яны атрымалі гэтую зямлю ад пана-землеўладальніка і таму самім сялянам яна не належыць.

Пералічыце галоўныя павіннасці сялян.

Дзяржаўная ўлада разглядала сялян пераважна як рабочую сілу. Яны абавязаны былі выконваць працоўныя павіннасці і забяспечваць краіну прадуктамі. Таксама вялікія князі літоўскія раздавалі зямлю разам з сялянамі прадстаўнікам прывілеяваных

Правообладатель Издательский центр БГУ



▶ Селянін і пан. Гравюра. XVI ст.

? *Вызначце, хто на малюнку пан, а хто селянін. Як вы лічыце, пра што яны маглі размаўляць? *Складзіце дыялог.*

саслоўяў, і ў першую чаргу шляхце. Сяляне не жадалі ператварацца ў шляхецкіх прыгонных. Яны, як маглі, супраціўляліся гэтаму. Здаралася, што ў змаганні за сваю свабоду яны даходзілі нават да велікакняжацкага суда.

Сялянскае саслоўе было неаднародным. Яно складалася з розных груп, якія даволі моцна адрозніваліся паміж сабой. Адзін з падзелаў сялян на групы грунтаваўся на тым, якія падаткі і павіннасці яны неслі. У адпаведнасці з гэтым вылучаліся групы сялян-слуг, даннікаў, цяглых і інш. Ніжэй за астатніх стаялі цяглыя сяляне, якія неслі цяжкую павіннасць — паншчыну. Другі падзел грунтаваўся на тым, ці быў селянін свабодным ці, наадварот, несвабодным.



▲ Катэгорыі сялян і працэс фарміравання прыгоннага сялянства

Правообладатель Издательский центр БГУ

З судовай справы 1542 г. сялян вёскі Грыцкі Ваўкавыскага павета з землеўладальнікам

У статуце земскіх правоў напісана, што, калі які чалавек пражыве ў свайго пана дзесяць гадоў, ён ужо мае быць вотчычам.

Як вы думаеце, пра які працэс сведчыць гэты дакумент?

У першай палове XVI ст. паскорыўся працэс *запрыгоньвання сялянства*. Гэта было звязана з узнікненнем фальваркава-паншчыннай сістэмы. Фальваркавыя гаспадаркі патрабавалі залежных сялян, якія б там працавалі. Таму ўладальнікі фальваркаў імкнуліся зрабіць прыгоннымі свабодных сялян, што жылі на іх землях. Важным этапам у заканадаўчым афармленні прыгоннага права стаў Статут ВКЛ 1529 г. Згодна з яго нормамі, прыгонным рабіўся селянін, які пражыў на зямлі феадала 10 гадоў.

У склад прыгоннага сялянства ў рэшце рэшт увайшлі прадстаўнікі ўсіх яго груп: і свабодных, і несвабодных.

Складванне мяшчанскага саслоўя. Прыступкай вышэй за сялян на сацыяльнай лесвіцы стаялі *мяшчане* — жыхары гарадоў і мястэчак. Яны мелі ўжо значна большыя правы і магчымасці. Так, напрыклад, ім была гарантавана асабістая свабода. Акрамя таго, яны мелі права перасялення ў любы іншы населены пункт — горад ці вёску. Найважнейшай падзеяй для складвання мяшчанскага саслоўя было наданне гарадам магдэбургскага права. З гэтага моманту ўсе жыхары такіх гарадоў па законе станавіліся роўнымі паміж сабой. Акрамя таго, па сваіх правах яны пачыналі выразна адрознівацца ад вяскоўцаў-сялян.

Тым не менш мяшчанскае саслоўе таксама мела свой унутраны падзел. Ён залежаў ад сферы дзейнасці і маёмаснага становішча чалавека. Ніжэйшы пласт гарадскога насельніцтва складаўся з так званых *чорных людзей*. Гэта былі найбяднейшыя гарадскія жыхары: грузчыкі, дробныя гандляры, рамесныя вучні. Пераважная большасць мяшчан належала да сярэдніх пластоў — *паспольства*. Гэта былі гандляры і рамеснікі. Вярхі гарадскога грамадства складалі найбагацей-

Правообладатель Издательский центр БГУ

▶ Мешчанін і мяшчанка. Гравюра XVI ст.



? *Як вы думаеце, прадстаўнікі якога пласта мяшчанства намаляваны на гравюры? Абгрунтуйце свой адказ.*

шыя купцы, майстры-рамеснікі і мяшчане-землеўладальнікі. Звычайна менавіта яны ўваходзілі ў *магістрат*.

Мяшчане былі актыўным пластом грамадства. Яны ўплывалі на самыя розныя галіны жыцця краіны. І часам гэты ўплыў быў значным. Мяшчане буйны́х гарадоў удзельнічалі ў працы агульнадзяржаўных соймаў. Частка іх несла вайсковую службу. Купцы і іншыя гандляры шмат падарожнічалі, у тым ліку за мяжу. Каб лепш весці свае справы, мяшчане імкнуліся набыць адукацыю. Многія з іх былі пісьменнымі. У выніку самыя здольныя прадстаўнікі мяшчанскага саслоўя дасягалі немалых поспехаў. І гэта нягледзячы на тое, што ў дзяржаве панавала шляхта.

Фарміраванне агульнашляхецкага саслоўя, яго правы і прывілеі. З самага пачатку свайго існавання *шляхта* мела прывілеяванае становішча ў Вялікім Княстве Літоўскім. Яна была галоўнай сацыяльнай апорай вялікіх князёў. Асноўным абавязкам шляхты перад дзяржавай з'яўлялася вайсковая служба. Шляхецкае апалчэнне — *паспалітае рушэнне* — доўгі час было галоўнай ваеннай сілай краіны. За нясенне ваеннай службы шляхціцы атрымлівалі ад вялікіх князёў літоўскіх зямельную ўласнасць — маёнткі. Гэтыя ўладанні былі той эканамічнай базай, на якой грунтавалася палітычная моц шляхты.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Герб — гэта знак прыналежнасці да нейкага роду. У яго выяве былі зашыфраваны звесткі пра паходжанне чалавека, яго родных, тытул. Гербы складаліся паводле спецыяльных правіл. Кожная фігура і яе колер мелі сваё значэнне. На малюнку ў цэнтры размешчаны герб бацькоўскага роду. На астатніх палях паказаны гербы маці, бабулі і прабабуль.



▲ Шляхецкі герб

Як і ў іншых саслоўях, існаваў унутраны падзел шляхты. Ён грунтаваўся на розных прыкметах. Так, напрыклад, вялікае значэнне мела паходжанне. Вельмі высока стаяла тытулаваная *знаць — князі*. У першай палове XVI ст. княжацкі тытул па-ранейшаму з'яўляўся прэстыжным. Але лёс княжацкіх родаў склаўся па-рознаму. Некаторыя з іх засталіся ля вяршыняў улады, захавалі і нават павялічылі сваё багацце. Гэта, напрыклад, Астрожскія і Алелькавічы-Слуцкія. Іншыя ж княжацкія дынастыі (Друцкія, Лукомскія, Свірскія) здрабнелі і сышлі з гістарычнай арэны.

Ужо ў XVII ст. князі Свірскія збяднелі да такой ступені, што вымушаны былі самі працаваць на зямлі. Суседзі-сяляне пасмейваліся з іх: «Шуміць дуброва — едзе князь па дровы».

У адпаведнасці з колькасцю зямлі і залежных сялян вылучаюць дробную, сярэднюю і буйну́ю шляхту. Найбуйнейшую шляхту нярэдка называюць таксама *магнатамі*. Да іх належалі, напрыклад, прадстаўнікі такіх родаў, як Кезгайлы, Гаштаўты, Радзівілы, Глябовічы. Яны валодалі тысячамі сялян, многімі вёскамі і нават цэлымі гарадамі. Тыя магнаты, якія займалі высокія дзяржаўныя пасады, верхаводзілі ў палітычным жыцці краіны. Але юрыдычна ўсе шляхціцы — і небагаты ўладальнік малой вёскі, і магнат — былі роўнымі паміж сабой.

Правообладатель Издательский центр БГУ

▶ Шляхціц. Малюнак XVII ст.



? *Па якіх прыметах зразумела, што на малюнку паказаны шляхціц?*

Да сярэдзіны XVI ст. саслоўе шляхты ўжо амаль склалася. Разам з прывілеяваным становішчам яно набыло яшчэ адну сваю важную рысу — замкнёнасць. Прадстаўнікам іншых груп насельніцтва стала вельмі складана прабіцца ў гэтае саслоўе. Атрымаць шляхецтва можна было толькі ад вялікага князя літоўскага.

Духавенства. Прывілеяванай сацыяльнай групай з'яўлялася і духавенства — служыцелі царквы. Яно было нешматлікім па колькасці, але вельмі ўплывовым. Рэлігія адыгрывала вялікую ролю ў тагачасным грамадстве, а царква карысталася велізарным аўтарытэтам. Менавіта гэтым тлумачыцца той факт, што духавенства мела моцны ўплыў на насельніцтва. Праваслаўнае духавенства падзялялася на чорнае і белае. Да *чорнага духавенства* належалі манахі, а да *белага духавенства* — прыходскія святары. Падобны падзел існаваў і ў Каталіцкім касцёле. Галоўным абавязкам святароў і манахаў была служба Богу, малітва. Але яны праяўлялі сябе і ў іншых галінах. Так, нямала духоўных асоб былі выдатнымі мысліцелямі, асветнікамі і дзеячамі культуры свайго часу.

Назавіце імёны такіх асоб — на беларускіх землях і за мяжой.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Праваслаўныя манахі



▲ Каталіцкі манах-дамініканец

Такім чынам, да сярэдзіны XVI ст. на беларускіх землях склалася саслоўная структура, уласцівая феадальнаму грамадству. У цэлым яна нагадвала сацыяльны падзел у іншых краінах Усходняй і Цэнтральнай Еўропы.

1. Складзіце схему «Саслоўі беларускага грамадства першай паловы XVI ст.». Якія з іх належалі да прывілеяваных, а якія — да непрывілеяваных?
2. Чаму шляхта была зацікаўлена ў паскарэнні запрыгоньвання сялянства?
3. Чым мяшчане адрозніваліся ад сялян у сваіх правах? Ці можна сялян і мяшчан у ВКЛ аб'яднаць у адно — трэцяе — саслоўе?
4. Якімі важнымі прывілеямі валодала шляхта? Якія павіннасці яна несла?
5. Да якога саслоўя вы жадалі б належаць, калі б жылі ў XVI ст.? Патлумачце свой адказ.

6*. Прыдумайце і намалюйце знак або герб свайго роду з дапамогай тэксту параграфа. Растлумачце, што ён значыць. Для чаго і ў якіх сітуацыях яго можна выкарыстаць?

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 5. Царква і рэлігія

Якія рэлігіі былі пашыраны ў Вялікім Княстве Літоўскім да канца XV ст.?

Што было асаблівага ў рэлігійным развіцці беларускіх зямель? Як складваліся ўзаемаадносіны паміж прадстаўнікамі розных вераванняў у гэты час?

Становішча Праваслаўнай царквы. У першай палове XVI ст., як і раней, большасць жыхароў беларускіх зямель вызнавалі праваслаўную веру. Праваслаўныя складалі большую частку насельніцтва і ва ўсім Вялікім Княстве Літоўскім. Але становішча Праваслаўнай царквы і яе вернікаў моцна залежала ад пазіцыі вялікіх князёў літоўскіх. Кіраўнікі ВКЛ разумелі, што ўціск праваслаўных можа прывесці да вялікіх унутраных канфліктаў. Таксама ён можа стаць прычынай абвастрэння стасункаў з суседзямі, і асабліва з праваслаўнай Масквой.

Калі адбылося хрышчэнне беларускіх зямель?

Па карце атласа вызначце, на якіх землях было пашырана праваслаўе, а на якіх — каталіцтва.

У першай палове XVI ст. вялікія князі літоўскія ў цэлым спрыяльна ставіліся да Праваслаўнай царквы. Яны пацвердзілі яе ранейшыя правы і нават надалі новыя. Напрыклад, правы Праваслаўнай царквы былі замацаваны ў абласных прывілеях Полацкай і Віцебскай землям.

З абласнога прывілея Жыгімонта I Старога Полацкай зямлі 1511 г.

Перш за ўсё мы не будзем прысвойваць цэрквы Божыя і царкоўныя маёнткі, якія ўваходзяць у дом Божы Святога Сафея, і ў дом Божы Святога Спаса, і ў іншыя дамы царкоўныя.

Як вы думаеце, што называлі царкоўным домам?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Беларускія землі займалі вельмі важнае месца ў сістэме Праваслаўнай царквы Вялікага Княства Літоўскага. Мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі меў свае рэзідэнцыі не толькі ў Кіеве і Вільні, але таксама ў Новагародку і Менску. А другое месца пасля мітрапаліта ў царкоўнай іерархіі займаў полацкі архіепіскап.

У Вялікім Княстве Літоўскім у той час было шмат праваслаўнай шляхты і нават магнатаў. Яны апекаваліся Праваслаўнай царквой, будавалі новыя храмы і манастыры. Праваслаўныя магнаты нярэдка займалі высокія пасады, карысталіся павагай і даверам вялікіх князёў літоўскіх. Так, Канстанцін Астрожскі вельмі падтрымліваў Праваслаўную царкву і пабудаваў на свае грошы шмат храмаў. Новагародскі

Якімі яшчэ спосабамі вернікі маглі падтрымліваць сваю царкву?



▲ Прачысценская царква ў Вільні — у XVI ст. кафедральны храм праваслаўных мітрапалітаў ВКЛ

Правообладатель Издательский центр БГУ

намеснік Аляксандр Хадкевіч у 1498 г. заснаваў *Супрасльскі манастыр* на Падляшшы (цяпер тэрыторыя Польшчы). У далейшым ён стаў адным з самых славутых праваслаўных манастыроў у краіне.

Праваслаўная царква ў Вялікім Княстве Літоўскім імкнулася захаваць старажытныя духоўныя і культурныя традыцыі народа. Яна забяспечвала іх перадачу ад старых да новых пакаленняў.

Каталіцкі касцёл на беларускіх землях. Каталіцтва было пашырана ў асноўным на паўночным захадзе сучаснай Беларусі. Тут пражывала шматлікае балцкае насельніцтва. Менавіта яно ў свой час прыняло хрысціянства паводле каталіцкага абраду.

З якога часу пачалося пашырэнне каталіцтва ў ВКЛ? Што, на вашу думку, магло спрыяць гэтаму працэсу?



▲ Кляштар бернардынцаў у Вільні. Пачатак XVI ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Паступова ў каталікоў Вялікага Княства пачалі складвацца ўласныя традыцыі. У тым ліку з'явіліся свае асабліва шанаваныя святыя. Такім стаў каралевіч Казімір — другі сын Казіміра Ягайлавіча, які праславіўся сваім набожным жыццём. Ён памёр у 1484 г. у Гародні і неўзабаве стаў шанавацца як нябесны заступнік Вялікага Княства Літоўскага і дынастыі Ягайлавічаў. У 1602 г. каралевіч Казімір быў уключаны ў лік святых.

**Якіх яшчэ мясцовых святых шануюць хрысціяне ў Беларусі?*

Каталікі складалі меншую частку насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага. Але менавіта яны панавалі ў палітычным жыцці гэтай дзяржавы. Прытрымліваліся каталіцтва вялікія князі літоўскія. Яго вызнавалі таксама прадстаўнікі самых багатых і ўплывовых магнацкіх родаў: Кезгайлы, Радзівілы, Гаштаўты. Каталіцкі касцёл карыстаўся вялікай падтрымкай дзяржавы. Каб узмацніць пазіцыі каталіцкай канфесіі, вялікія князі літоўскія засноўвалі на тэрыторыі Беларусі касцёлы і манастыры (кляштары), перадавалі ім землі. У першай палове XVI ст. тут ужо існаваў шэраг кляштараў некалькіх манаскіх ордэнаў. Напрыклад, аўгусцінцы мелі свой кляштар у Берасці, францысканцы — у Пінску, бернардынцы — у Полацку.

З дапамогай карты атласа вызначце, да якіх яшчэ біскупстваў акрамя Віленскага належалі беларускія землі.

Менавіта праз пасрэдніцтва Каталіцкага касцёла і вернікаў-каталікоў беларускія землі зазнавалі заходнія ўплывы. Дзякуючы гэтаму адбывалася абнаўленне самых розных сфер жыцця. Напрыклад, з'явіліся новыя мастацкія стылі, набывала папулярнасць прагрэсіўная заходнееўрапейская адукацыя.

Спроба правядзення царкоўнай уніі. Праваслаўная царква і Каталіцкі касцёл займалі няроўнае становішча ў Вялікім Княстве Літоўскім. Розным было і становішча іх вернікаў. Напрыклад, праваслаўная шляхта была абмежавана ў правах. Усё гэта стварала глебу для канфліктаў і было сур'ёзнай праблемай дзяржавы. Вялікія князі літоўскія неаднаразова спрабавалі вырашыць праблему

Правообладатель Издательский центр БГУ

міжрэлігійных адносін. А самы лепшы спосаб яны бачылі ў заключэнні уніі (саюзу) паміж цэрквамі.

Успомніце, калі была заключана Флярэнтыйская унія.

У чарговы раз да ідэі уніі звярнуўся вялікі князь літоўскі Аляксандр. Здавалася, што ў *1498 г.* для гэтага склалася зручная сітуацыя. Новаабраны праваслаўны мітрапаліт Іосіф I Балгарыновіч пагадзіўся перайсці ва унію. Але вельмі хутка высветлілася, што ідэя уніі паранейшаму не мае падтрымкі сярод праваслаўных вернікаў. Даведаўшыся пра планы Аляксандра, некаторыя пагранічныя праваслаўныя князі адмовіліся яму служыць. Яны перайшлі на бок Масквы. Іван III скарыстаў момант, абвясціў сябе абаронцам праваслаўных і распачаў вайну супраць заходняга суседа. Так унутраная справа Вялікага Княства Літоўскага перарасла ў кровапралітны міждзяржаўны канфлікт. У выніку Аляксандр спыніў свае дзеянні на карысць уніі.

Нехрысціянскія рэлігіі. Хрысціяне складалі абсалютную большасць насельніцтва беларускіх зямель. Але прыкметнае месца займалі таксама супольнасці, прадстаўнікі якіх вызнавалі іншыя рэлігіі.



▲ Сінагога ў Слуцку. XVIII ст. Мастак *Я. Кругер*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Адной з такіх супольнасцяў былі яўрэі, якія са старажытных часоў вызнавалі *іўдаізм*. Яны прыйшлі з захаду Еўропы праз Польшчу. Яўрэі сяліліся пераважна ў гарадах. Іх першыя *кагалы* (абшчыны) з'явіліся ў Гародні і Берасці. Яўрэйскае насельніцтва хутка расло і рассялялася па краіне. Да сярэдзіны XVI ст. яўрэі жылі ўжо ў большасці буйны́х гарадоў Вялікага Княства Літоўскага. Сярод гэтых гарадоў былі Новагародак, Пінск, Менск, Полацк.

З дапамогай карты атласа назавіце іншыя гарады, у якіх у першай палове XVI ст. з'явіліся яўрэйскія абшчыны.

Вялікія князі літоўскія спрыялі прытоку яўрэйскага насельніцтва з-за мяжы і яго рассяленню па тэрыторыі дзяржавы. Яны рабілі гэта ў асноўным па фінансавых меркаваннях. Багатыя яўрэі пазычалі ім вельмі буйны́я сумы грошай. А з усяго яўрэйскага насельніцтва дзяржава спаганяла падаткі, якія ў разы перавышалі падаткі з хрысціян.

Якія яшчэ прычыны маглі падштурхнуць улады да падтрымкі перасялення яўрэяў?

Татары-мусульмане былі паселены вялікім князем Вітаўтам у Літве і прылеглых паўночна-заходніх раёнах сучаснай Беларусі. Аднак татарскія паселішчы і абшчыны з цягам часу з'явіліся і ў іншых мясцовасцях — напрыклад, пасля 1506 г. у Клецку. Татары перасяляліся ў Вялікае Княства як вымушана, так і добраахвотна.

Успомніце, якая падзея адбылася ў 1506 г. у раёне Клецка.

праваслаўе	каталіцтва	іўдаізм	іслам
царква	касцёл	сінагога	мячэць
святар	ксёндз	равін	імам

▲ Канфесіі, іх храмы і святары

? *Храмы якіх канфесій ёсць у вашай мясцовасці? Знайдзіце ў тэксце параграфа пацвярджэнне таго, што ВКЛ было шматканфесійнай дзяржавай.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Нярэдка прадстаўнікі гэтага народа мелі магчымасць вярнуцца ў стэпы, і некаторыя сапраўды вярталіся. Але для вялікай іх часткі беларускія землі сталі новай радзімай. Татары даволі хутка страцілі родную мову, але затое вельмі цвёрда трымаліся сваёй рэлігіі — *ісламу*.

Першая палова XVI ст. была спрыяльным часам для ўсіх канфесійных абшчын, якія існавалі ў той час на беларускіх землях. Яны мірна жылі побач, ніякіх значных канфліктаў на рэлігійнай глебе ў краіне не адбывалася.







1. Чым вы можаце пацвердзіць ці абвергнуць думку, што першая палова XVI ст. была спрыяльным часам для Праваслаўнай царквы ў ВКЛ?
2. У чым праяўлялася прывілеяванае становішча Каталіцкага касцёла?
3. Як вялікія князі літоўскія спрабавалі вырашыць праблему ўзаемаадносін Каталіцкага касцёла і Праваслаўнай царквы?
4. Пры дапамозе тэксту параграфа вызначце, чаму вялікія князі літоўскія былі зацікаўлены ў рассяленні на сваёй тэрыторыі яўрэяў. Як, на вашу думку, гэта магло ўплываць на эканамічнае развіццё ВКЛ?
5. Прывядзіце прыклады канфесійнай палітыкі вялікіх князёў літоўскіх. Ці магчыма назваць яе верацярпімай? Свой адказ растлумачце.

§ 6. Культура



Якімі былі асноўныя рысы заходнееўрапейскага Рэнесансу? Што такое гуманізм?



Што было асаблівага ў культуры Адраджэння на беларускіх землях? У чым выключнае значэнне дзейнасці беларускага першадрукара Францыска Скарыны?

Пашырэнне Адраджэння (Рэнесансу) і яго праявы ў культуры. У XIV ст. у Італіі пачалася еўрапейская эпоха **Адраджэння**. У першай палове XVI ст. яна прыйшла на землі ВКЛ і пакінула свой моцны адбітак у культуры беларускіх зямель. Але рэнесансавая культура мела на беларускіх землях свае асаблівасці.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Назавіце, хто належаў да буржуазіі.

Падумайце, чым абумоўлівалася гэтая асаблівасць.



▲ Старонка беларускай рукапіснай кнігі XVI ст.

? *Як вы лічыце, чаму рукапісныя кнігі былі такімі дарагімі? *Скарыстайцеся ілюстрацыяй як узорам і афармеце адзін сказ у стылі XVI ст.*

У Заходняй Еўропе ідэі Адраджэння ўспрымаліся і распаўсюджваліся ў першую чаргу буржуазнымі коламі. На беларускіх землях, як і ў большасці краін усходу Еўропы, было па-іншаму. Ідэі Адраджэння ўспрынялі тут у асноўным вялікакняжацкі двор, магнаты і шляхта.

Рэнесансавая культура на беларускіх землях усё яшчэ была моцна звязана з царквой. Помнікаў свецкага мастацтва і літаратуры з'явілася тут не так шмат. У архітэктуры доўга адчуваліся ўплывы сярэднявечнай готыкі. Зварот да антычных традыцый не меў на беларускіх землях такога значэння, як на поўдні Еўропы. Тым не менш ідэі Адраджэння атрымалі ў Вялікім Княстве Літоўскім прызнанне і папулярнасць.

Найбольш яскрава гэта праявілася ва ўзрастанні цікавасці да адукацыі і навукі, перайманні заходнееўрапейскага ладу жыцця.

Ідэі Адраджэння хутка пашыраліся, у тым ліку дзякуючы новай тэхнічнай вынаходцы — кнігадрукаванню. У выніку кніга перастала быць прадметам раскошы і стала больш даступнай для многіх людзей.

Францыск Скарына — беларускі першадрукар, гуманіст і асветнік. Цэнтральнай постаццю Адраджэння на Беларусі быў ***Францыск Скарына*** *(каля 1490 — каля 1551)*. Аднак гэтая асоба мае значэнне не толькі ў межах Беларусі. Скарына — постаць агульнаеўрапейскага маштабу. Гэта не толькі беларускі, але і ўсходнеславянскі

Правообладатель Издательский центр БГУ

першадрукар. Ён быў пачынальнікам друкарскай справы ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Ф. Скарына нарадзіўся ў Полацку ў сям'і купца. Сваю выдавецкую дзейнасць ён распачаў у Празе, дзе на працягу 1517—1519 гг. выдаваў асобнымі кнігамі *Біблію*. Першая з іх — «Псалтыр» — выйшла ў свет **6 жніўня 1517 г.** Гэты дзень лічыцца пачаткам беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. Праца Скарыны была каласальнай. Яму даводзілася займацца і арганізатарскай дзейнасцю, і перакладамі, і непасрэдна наборам тэкстаў. Першадрукар быў таксама аўтарам прадмоў і пасляслоўяў да свайго славутага выдання. У прадмове да галоўнай для кожнага хрысціяніна кнігі ён абвяшчаў, што робіць гэта «Богу ко чти и людем посполитым к доброму научению». Скарына аддаваў належную пашану Богу, але думаў у першую чаргу пра людзей. Менавіта ім ён адрасаваў свае прадмовы і пасляслоўі.

Да якога саслоўя належаў Ф. Скарына?

Каго ў першай палове XVI ст. называлі людзьмі паспалітымі?

Як вы думаеце, чаму Ф. Скарыну лічаць гуманістам?



▲ Ф. Скарына. Гравюра. 1517 г.



▲ Тытульны ліст Бібліі Ф. Скарыны.1517 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Скарына жадаў праславіць не толькі сваё імя, але і тое месца, дзе нарадзіўся. Нездарма ён кожны раз падкрэсліваў на тытульных лістах сваіх кніг, што паходзіў «из славнаго града Полоцька». Любоў да роднай зямлі была для знакамітага палачаніна сапраўды вялікай каштоўнасцю.

Праз нейкі час Ф. Скарына пакінуў Прагу і вярнуўся на радзіму. Тут ён працягнуў сваю друкарскую дзейнасць. У Вільні Скарына выдаў у 1522 г. «Малую падарожную кніжку», а ў 1525 г. — «Апостал». Ён стараўся зрабіць свае кнігі як мага больш даступнымі для чытача. Яны адрозніваліся адносна невялікім коштам і мелі выдатнае мастацкае афармленне. Скарына імкнуўся, каб яго выданні былі напісаны на зразумелай чытачу мове. Яна спалучала рысы старабеларускай і царкоўнаславянскай моў.

Як вы лічыце, у чым праявіўся патрыятызм Ф. Скарыны? Што б вы зрабілі, каб праславіць сваю краіну?

Літаратура. Эпоха Адраджэння стала часам стварэння многіх выдатных літаратурных твораў. Яны ўвайшлі ў гісторыю і беларускай, і агульнаеўрапейскай літаратуры. Узніклі ці адрадзіліся пасля вялікага перапынку цэлыя жанры айчыннай літаратуры, напрыклад, паэтычныя.

Выдатным узорам паэзіі на лацінскай мове была *«Песня пра зубра»* ***Міколы Гусоўскага***. Гэта паэма была напісана ў Рыме, а выйшла ў свет у 1523 г. у Кракаве. Меркавалася, што яна павінна ўразіць заходняга чытача апавяданнем пра дзікую прыроду Вялікага Княства Літоўскага. Але ў выніку «Песня пра зубра» стала гімнам усёй гэтай краіне, яе народу і слаўнай гісторыі. Яшчэ адной лацінамоўнай паэмай была «Пруская вайна» Яна Вісліцкага. Яна была прысвечана падзеям Вялікай вайны 1409—1411 гг. Але асабліва падрабязна і ўзнёсла аўтар апісаў векапомную Грунвальдскую бітву.

Калі адбылася Грунвальдская бітва? Якое значэнне яна мела для беларускіх зямель?

Увогуле, гістарычнае пісьменства было ў той час вельмі папулярным. Яно перажывала свой новы ўздым. У першай палове XVI ст. былі створаны самыя яскравыя помнікі *беларуска-літоўскага летапісання*.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Яны распавядалі пра гісторыю Вялікага Княства Літоўскага. У гэтых творах можна прачытаць і апавяданні пра рэальныя гістарычныя падзеі, і прыгожыя паэтычныя легенды. Таму летапісы можна лічыць адначасова помнікамі як гістарычнага пісьменства, так і мастацкай літаратуры.

Культавае і абарончае дойлідства. Новая эпоха прынесла новыя павевы і ў архітэктуру. Для першай паловы XVI ст. было асабліва характэрна будаўніцтва *цэркваў абарончага тыпу*, ці храмаў-крэпасцяў. Яны выконвалі не толькі рэлігійную, але і абарончую ролю. Толькі на землях ВКЛ у заходніх — гатычным і рэнесансавым — стылях будаваліся праваслаўныя храмы. Гэта было яшчэ адной унікальнай рысай архітэктуры беларускіх зямель.



◀ Міхайлаўская царква ў Сынкавічах

▶ Царква Раства Багародзіцы ў Мураванцы



? *Як вы лічыце, чаму храмы, якія будаваліся на беларускіх землях у канцы XV — першай палове XVI ст., называюць храмамі-крэпасцямі?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Напачатку XVI ст. была створана Міхайлаўская царква ў Сынкавічах (Зэльвенскі раён Гродзенскай вобласці). Гэты выдатны помнік гатычнага дойлідства мае свае характэрныя рысы: чырвоны колер цагляных сцен, гранёная форма вежаў, высокі двухсхільны дах. Але прайшло зусім няшмат часу, і будынкі сталі набываць усё больш рэнесансавых рысаў. Гэта добра відаць на прыкладзе царквы Раства Багародзіцы ў Мураванцы (Шчучынскі раён Гродзенскай вобласці). Яна была пабудавана паміж 1516 і 1524 гг. Гэты храм мае скругленыя абрысы, а ўпрыгожаны ён выбеленымі паясамі і нішамі, што ўласціва рэнесансавай архітэктуры. Прыкладна ў той самы час магнат Юрый Ільініч пачаў будаваць дзівосны Мірскі замак. У яго абліччы можна прасачыць рысы як гатычнага, так і рэнесансавага стыляў.



▲ Святы Дзмітрый. Фрэска Дабравешчанскай царквы Супрасльскага манастыра

Выяўленчае мастацтва. У першай палове XVI ст. пачало набываць новыя рысы і выяўленчае мастацтва. Друкаваная кніга запатрабавала новага спосабу стварэння ілюстрацый. Так з'явілася *гравюра на дрэве*. Менавіта ў гэтай тэхніцы выкананы ілюстрацыі да ўсіх старадрукаў той эпохі. Кнігадрукаванне было выдатнай і вельмі важнай вынаходкай. Але яно не прывяло да імгненнага знікнення рукапіснай кнігі. Яна выкарыстоўвалася на беларускіх землях яшчэ вельмі доўга. Больш за тое, у XVI ст. майстэрства вырабу і афармлення рукапісных кніг дасягнула вельмі высокага ўзроўню. Гэта відаць, у прыватнасці, па пісьме і малюнках, якія выконваліся з вялікім мастацкім густам.

Беларускія землі мелі сваю даўнюю традыцыю фрэскавых роспісаў. Праўда, з XVI ст. іх захавалася няшмат. Адметным стылем вылучаюцца *фрэскі* Дабравешчанскай царквы Супрасльскага манастыра. Яны былі створаны ў 1557 г. групай мастакоў на чале з майстрам Нектарыем, выхадцам з Сербіі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

На эпоху Адраджэння прыпаў пачатак фарміравання *беларускай школы іканапісу*. Яна спалучыла мясцовыя і візантыйскія царкоўна-культурныя традыцыі з павевамі заходнееўрапейскага Рэнесансу.

Культура беларускіх зямель першай паловы — сярэдзіны XVI ст. развівалася пад вызначальным уплывам еўрапейскага Рэнесансу. Гэтая эпоха на тэрыторыі нашай краіны была нядоўгай. Тым не менш Адраджэнне пакінула вельмі глыбокі след ва ўсіх сферах культурнага жыцця.

1. Пералічыце асаблівасці культуры Адраджэння на беларускіх землях. Як вы лічыце, чым яны былі абумоўлены?
2. З дапамогай тэксту параграфа прывядзіце доказы таго, што Ф. Скарына быў першадрукаром, асветнікам, пісьменнікам.
3. Назавіце характэрныя рысы літаратуры эпохі Адраджэння.
4. З дапамогай ілюстрацый і тэксту параграфа вызначце, чым адрозніваліся паміж сабой архітэктурныя помнікі гатычнага і рэнесанснага стыляў.

5*. Падрыхтуйце віртуальную экскурсію «Помнікі архітэктуры канца XV — першай паловы XVI ст. на беларускіх землях».

Падагульненне да I раздзела

I. Адкажыце на пытанні пры дапамозе картаў атласа, картасхем і тэксту вучэбнага дапаможніка.

1. Землі якіх сучасных краін уключала ў сябе Вялікае Княства Літоўскае ў першай палове XVI ст.? З якімі краінамі яно межавала?

2. Дзе адбыліся асноўныя бітвы на беларускіх землях падчас войнаў Вялікага Княства Літоўскага з Рускай дзяржавай і крымскімі татарамі?

3. Дзе былі заснаваны першыя мястэчкі на тэрыторыі сучаснай Беларусі? Як іх з'яўленне паўплывала на эканамічнае развіццё беларускіх зямель?

4. У басейнах якіх рэк з'явіліся першыя фальваркі на беларускіх землях? Назавіце прычыны іх узнікнення.

5. Дзе былі пабудаваны храмы абарончага тыпу на беларускіх землях у першай палове XVI ст.? З якімі мэтамі гэта было зроблена?

Правообладатель Издательский центр БГУ

II. Успомніце, якія падзеі адбыліся ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ў першай палове XVI ст. Складзіце крыжаванку з выкарыстаннем наступных дат: 1500—1503, 1506, 1508, 1514, 1517, 1522, 1525, 1529, 1534—1537.

III. Размяркуйце гістарычныя паняцці і з'явы першай паловы XVI ст. па слупках: 1) палітычнае развіццё; 2) эканамічнае развіццё; 3) культурнае развіццё. Растлумачце свой адказ.



IV. Вызначце ролю ў гісторыі беларускіх зямель першай паловы XVI ст. наступных асоб: вялікія князі літоўскія Аляксандр і Жыгімонт I Стары, М. Глінскі, Ф. Скарына, К. Астрожскі, М. Гусоўскі, Я. Вісліцкі. Дайце кароткія звесткі пра іх дзейнасць пры дапамозе тэксту параграфаў.

V. Назавіце вынікі наступных падзей і працэсаў для развіцця беларускіх зямель у першай палове XVI ст.: 1) барацьба ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім і крымскімі татарамі; 2) мяцеж М. Глінскага; 3) складванне фальваркава-паншчыннай сістэмы; 4) з'яўленне мястэчак; 5) пашырэнне Адраджэння.

VI. Складзіце пры дапамозе параграфаў вучэбнага дапаможніка апавяданне «Асноўныя кірункі рэфармавання дзяржаўнага ладу ў ВКЛ у першай палове XVI ст.».

VII. Прывядзіце не менш за пяць доказаў таго, што перыяд першай паловы XVI ст. магчыма назваць «На хвалі Адраджэння».

VIII. Пачніце складаць табліцу «Палітыка кіраўнікоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XVI—XVIII стст.».

Манарх	Гады кіравання	Падзеі ўнутранай палітыкі	Падзеі знешняй палітыкі	Эканамічныя пераўтварэнні	Культурныя змены

Правообладатель Издательский центр БГУ



Беларускія землі ў сярэдзіне XVI — першай палове XVII ст.





Раздзел II

Напачатку эпохі Новага часу беларускія землі сталі адной з частак новага дзяржаўнага ўтварэння — Рэчы Паспалітай абодвух народаў. Яна ўзнікла пад ціскам цяжкіх унутраных і знешніх супярэчнасцяў шляхам аб'яднання ВКЛ і Каралеўства Польскага. Унія дзвюх краін абумовіла з'яўленне ўнікальнай сістэмы дзяржаўнага кіравання. Новая краіна з годнасцю выйшла са шматлікіх ваенных канфліктаў і здолела пашырыць свае межы. На новы ўзровень выйшла эканамічнае і культурнае развіццё беларускіх зямель. Але гэты бурлівы час прынёс і канфлікты, у першую чаргу рэлігійныя.

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 7. Лівонская вайна

Якімі былі стасункі паміж ВКЛ і Тэўтонскім і Лівонскім ордэнамі? Як змяніліся адносіны паміж ВКЛ і ўсходнім суседам у першай палове XVI ст.?

У чым былі прычыны палітычных канфліктаў паміж краінамі ў другой палове XVI ст.? Як ваенныя сутыкненні змянілі межы і міжнароднае становішча дзяржаў?

Барацьба за Балтыку. У другой палове XVI ст. абвастрылася барацьба за кантроль над Балтыйскім морам. Асноўнымі саперніка́мі за панаванне ў гэтым рэгіёне сталі Швецыя, Данія, Польшча, ВКЛ і Расійская дзяржава. Тры апошнія краіны не мелі зручнага выхаду да мора. Гэта стрымлівала развіццё іх эканомікі і знешняга гандлю. Той, хто кантраляваў Балтыйскае ўзбярэжжа, атрымліваў і палітычныя перавагі. Таму кожная з краін імкнулася замацаваць гэты рэгіён за сабою. Самай слабай з іх была Лівонія (ці Інфлянты, Ліфляндыя), якая ўяўляла сабой саюз з 6 дзяржаў. Сярод іх першынстваваў рыцарскі Лівонскі ордэн. За кантроль над эканамічна развітымі землямі Лівоніі і яе парта́мі і разгарнулася асноўная барацьба.

Знайдзіце на картасхеме на с. 51 пацвярджэнне таго, што ВКЛ і Расійская дзяржава не мелі зручнага выхаду да мора.



▲ Дзяржавы, якія супрацьстаялі ў Лівонскай вайне 1558—1561 гг.

Ваенныя дзеянні былі распачаты ў студзені **1558 г.** Расійскай дзяржавай. Яе войскі здолелі хутка захапіць Нарву, Дэрпт (цяпер Тарту). Узнікла пагроза захопу імі найбуйнейшых партоў у Прыбалтыцы: Рэвеля (цяпер Талін) і Рыгі. Да таго ж частка эстонскіх зямель адышла да Данії. У выніку магістр Лівонскага ордэна звярнуўся па дапамогу да Вялікага Княства Літоўскага.

Правообладатель Издательский центр БГУ

З «Хронікі» Мацея Стрыйкоўскага

У год 1561 новы ліфляндскі магістр [кіраўнік ордэна] і арцыбіскуп, і рыжане прыехалі да караля ў Вільню і там аддалі каралю гэтую Ліфляндскую зямлю і саміх сябе ў абарону і апеку, і прысягу выканалі.

На падставе ўрыўка з дакумента апішыце шлях далучэння Лівоніі да ВКЛ і абавязкі бакоў.



5—8



Згодна з падпісаным у выніку перамоў дагаворам Лівонскі ордэн як духоўна-рыцарская арганізацыя прыпыніў існаванне. На яго землях былі створаны свецкія дзяржавы на чале з герцагамі. Яны разам з Рыгай пераходзілі пад уладу ВКЛ. Аднак жыхары Рэвеля прысягнулі на вернасць Швецыі, якая стала прэтэндаваць і на іншыя эстонскія землі.

Вялікі князь літоўскі і кароль польскі *Жыгімонт II Аўгуст* (гады кіравання *1548—1572*) запатрабаваў ад расійскага цара Івана IV Грознага вывесці свае войскі з Лівоніі. Гэта стала прычынай таго, што цар вырашыў нанесці ўдар па ВКЛ. У 1562 г. расійскія войскі здзейснілі паходы на Мсціслаў, Шклоў, Копысь, Оршу і Віцебск.

Страта Полацка. У студзені **1563 г.** амаль усё расійскае войска на чале з царом Іванам IV рушыла пад Полацк. Здабыццё горада дазваляла расійскім войскам кантраляваць гандлёвы шлях па Заходняй Дзвіне і навакольныя землі. Горад быў узяты ў аблогу. 60-тысячнай арміі супрацьстаяў гарнізон з 3,5 тыс. чалавек, якім кіраваў полацкі ваявода Станіслаў Давойна. Полацк, нягледзячы на свае памеры і багацце, быў слаба падрыхтаваны да абароны.

Мацей Стрыйкоўскі так апісваў абарону Полацка: «Давойна ваявода загадаў спаліць пасады і іх умацаванні. Чэрні і простага люду 20 000 з замка выгнаў. Усё гэта было на руку царскаму войску... Яно змагло прыцягнуць вялікія гарматы пад самы замак. Страляючы без перапынку, яны падпалілі замак, так што 40 [участкаў] сцен згарэла. А людзей, якія тушылі замак, са стрэльбаў пазабівалі». Гэта зрабіла далейшую абарону горада практычна немагчымай.

Праз два тыдні аблогі, 15 лютага, горад здаўся. Нягледзячы на абяцанні Івана IV Грознага, многія з палонных абаронцаў былі

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Узяцце Полацка войскамі Івана IV Грознага ў 1563 г. Гравюра. XVI ст.

? **На падставе тэксту параграфа і гравюры складзіце апавяданне пра абарону Полацка ад імя абаронцы горада.*

вывезены ў Расію. Каталіцкія манахі і яўрэі былі забіты, а сам горад разбураны. Войска ВКЛ, высланае на дапамогу Полацку, было разбіта пад Глыбокім. Згодна з умовамі часовага перамір'я войскі ВКЛ не мелі права набліжацца да Полацка.

Ход вайны ў 1564—1570 гг. Ваенныя дзеянні аднавіліся ў наступным годзе, аднак цяпер расійскія войскі пацярпелі шэраг няўдач. У **студзені 1564 г.** у бітве на р. Ула (каля Чашнікаў) войскі ВКЛ на чале з гетманам *Мікалаем Радзівілам Рудым* разбілі расійскія войскі і спынілі іх прасоўванне ў глыб тэрыторыі ВКЛ. Ваенная кампанія Івана IV Грознага была сарвана. Аднак і кіраўніцтва ВКЛ не здолела развіць поспех.



▲ Дзяржавы, якія супрацьстаялі ў гады Лівонскай вайны ў 1564—1570 гг.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Лівонская вайна. I этап

? *На падставе картасхемы, схем і тэксту параграфа вызначце, якія краіны далучыліся да супрацьстаяння. Як вы мяркуеце, чаму крэпасці і замкі, паказаныя на картасхеме, былі пабудаваны менавіта на поўначы беларускіх зямель?*

Спробы вызваліць Полацк і перанесці ваенныя дзеянні за межы дзяржавы скончыліся няўдачай. Вайна набыла зацяжны характар. У 1566—1569 гг. на захопленых царом землях Полаччыны быў пабудаваны ланцуг расійскіх крэпасцяў. У адказ пачалі будаўніцтва новых замкаў і ўлады ВКЛ.

Цяжкая вайна, якая ўскладнялася ўнутранымі супярэчнасцямі, вымушала ВКЛ шукаць саюзнікаў. Адным з іх стала Швецыя, якая афіцыйна абвясціла вайну Расіі. Аднак яе дапамогі аказалася

Правообладатель Издательский центр БГУ

недастаткова. У 1569 г. прадстаўнікі ВКЛ былі вымушаны заключыць міждзяржаўную унію з Польшчай, што прывяло да з'яўлення Рэчы Паспалітай. У 1570 г. было падпісана перамір'е з Масквой, якое завяршыла першы этап вайны для ВКЛ. Ваенныя ж дзеянні паміж Расіяй і Швецыяй працягваліся далей.

Паходы Стафана Баторыя. Ям-Запольскае перамір'е. Ваенныя дзеянні паміж Рэччу Паспалітай і Расійскай дзяржавай аднавіліся ў *1577 г.* на лівонскіх землях. На гэты момант уся Лівонія, акрамя Рыгі і Рэвеля, знаходзілася пад кантролем расійскіх войскаў. Барацьба ішла з пераменным поспехам. Пералом у вайне адбыўся дзякуючы ўдалым дзеянням новага *манарха* ў Рэчы Паспалітай Стафана Баторыя (гады кіравання *1576—1586*). Асноўнай умовай яго абрання на трон стала вяртанне захопленых Расійскай дзяржавай зямель.



▲ Стафан Баторый

Стафан Баторый (1533—1586) — выдатны палкаводзец, адзін з самых паспяховых манархаў у Рэчы Паспалітай. Імкнуўся да ўмацавання каралеўскай улады, але пры ім пашыраліся і правы шляхты. Дзякуючы яго палітыцы пазіцыі каталіцтва на беларускіх землях значна ўзмацніліся. Сваёй асноўнай рэзідэнцыяй кароль выбраў Гародню, дзе праводзіў шмат часу. Там ён перабудаваў замак. Зараз у ім размешчаны музей.

У ліпені 1579 г. Стафан Баторый на чале 40-тысячнага войска рушыў пад Полацк. Яго задачай было вярнуць захопленыя землі і перанесці ваенныя дзеянні на тэрыторыю праціўніка. Расійскі гарнізон у Полацку на працягу 20 дзён супраціўляўся войску Рэчы Паспалітай. Драўляныя ўмацаванні горада былі падпалены, і 30 жніўня **1579 г.** войска Стафана Баторыя ўвайшло ў Полацк.

У 1580—1581 гг. войскі Рэчы Паспалітай замацавалі свае поспехі. Яны вярнулі тэрыторыі, страчаныя ў пачатку 1560-х гг., і пачалі займаць землі Расійскай дзяржавы. Пераможнае шэсце Стафана Баторыя

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Лівонская вайна. II этап

было спынена няўдалай 5-месячнай аблогай Пскова. Недахоп харчавання і боепрыпасаў, незадавальненне вайной у самой Рэчы Паспалітай вымусілі караля пайсці на перамовы. Планы далейшага паходу на Ноўгарад і Маскву так і не былі рэалізаваны.

Рэч Паспалітая выйшла пераможцай з Лівонскай вайны. У **студзені 1582 г.** пасля доўгіх перамоў паміж Рэччу Паспалітай і Расійскай дзяржавай было падпісана **Ям-Запольскае перамір'е** на 10 гадоў. Да ВКЛ вярнуўся Полацк. Рэч Паспалітая таксама замацавала за сабою паўднёвую частку Лівоніі з Рыгай. Канчаткова Лівонская вайна скончылася заключэннем перамір'я ў **1583 г.** паміж Швецыяй і Расійскай дзяржавай. Шведы атрымалі паўночную

Правообладатель Издательский центр БГУ

Прасачыце змены тэрыторыі Рэчы Паспалітай падчас Лівонскай вайны на картасхеме на с. 53. Як вы ацэньваеце значэнне гэтага міру для беларускіх зямель?

частку сучаснай Эстоніі. У далейшым прэтэнзіі Швецыі і Рэчы Паспалітай на валоданне ўсімі лівонскімі землямі стануць прычынай шматлікіх войнаў.

Вайна значна змяніла расстаноўку палітычных сіл ва Усходняй Еўропе. З'явілася новае дзяржаўнае ўтварэнне — Рэч Паспалітая. Расія была значна аслаблена. Яна страціла ўсе занятыя землі і выхад да Балтыйскага мора. Пацярпелі многія раёны абедзвюх дзяржаў, а іх памежныя землі абязлюдзелі. Аднак далучэнне новых тэрыторый да ВКЛ знішчыла перашкоды для руху па Заходняй Дзвіне. У выніку аб'ём знешняга гандлю беларускіх зямель павялічыўся ў тры разы. Гэта ў далейшым паспрыяла іх паспяховаму эканамічнаму развіццю.

1. Назавіце прычыны Лівонскай вайны.
2. Растлумачце, якія абставіны прывялі да знікнення Лівонскага ордэна.
3. Намалюйце ў сшытку «стужку часу» і адзначце на ёй найбольш важныя падзеі Лівонскай вайны.
4. Складзіце схему «Адмоўныя і станоўчыя вынікі Лівонскай вайны для Рэчы Паспалітай».
5*. Як бы вы адказалі на анлайн-апытанне: «Якім чынам і дзе можна было б ушанаваць памяць пра Лівонскую вайну на тэрыторыі Беларусі»? Растлумачце сваю пазіцыю.

§ 8. Утварэнне Рэчы Паспалітай

Што такое унія? Узгадайце уніі, якія былі заключаны паміж ВКЛ і Польшчай. На якіх умовах і калі яны былі заключаны?

Якімі былі прычыны стварэння Рэчы Паспалітай? На якіх умовах аб'ядналіся дзве дзяржавы?

Перадумовы і прычыны ўтварэння Рэчы Паспалітай. Лівонская вайна абвастрыла ўнутраныя праблемы ВКЛ. Шляхта, якая была асновай войска, жадала больш уплываць на палітычнае

Правообладатель Издательский центр БГУ

жыццё ў краіне. Але да рэальнага кіравання дзяржавай яе не дапускалі. У дзяржаве ўлада па-ранейшаму знаходзілася ў руках Паноў-Рады. Шляхціцы ВКЛ спадзяваліся атрымаць такія ж правы, як польская шляхта, аб'яднаўшыся з заходняй суседкай. Таму распрацоўка праекта чарговай уніі з Польшчай знайшла нямала прыхільнікаў у абедзвюх дзяржавах. Каб спрасціць сістэму кіравання дзяржавай і ўлагодзіць шляхціцаў, у *1563—1566 гг.* Жыгімонтам II Аўгустам былі праведзены рэформы.



Жыгімонт II Аўгуст (1520—1572) — апошні манарх з дынастыі Ягайлавічаў. Быў абраны вялікім князем літоўскім і каралём польскім яшчэ пры жыцці свайго бацькі Жыгімонта I Старога. Ажыццявіў шэраг палітычных і эканамічных рэформаў. Праводзіў палітыку цярпімасці ў дачыненні ўсіх рэлігій. Перыяд яго кіравання стаў часам росквіту культуры ў ВКЛ. Гісторыя кахання Жыгімонта Аўгуста і Барбары Радзівіл стала сюжэтам многіх паданняў і літаратурных твораў, у тым ліку п'есы Аляксея Дударава «Чорная панна Нясвіжа».



▲ Жыгімонт II Аўгуст. Мастак *Л. Кранах Малодшы*. Сярэдзіна XVI ст.

Кірункі рэформаў

Адміністрацыйна-тэрытарыяльная	Вайсковая	Падатковая	Судовая
Утвараліся 13 ваяводстваў і 30 паветаў	Вызначалася колькасць шляхціцаў ад павета ў паспалітым рушэнні	Вызначаліся віды падаткаў і спосабы іх збору	Стваралася сістэма саслоўных і ўсесаслоўных судоў

▲ Кірункі рэформаў, праведзеных Жыгімонтам II Аўгустам

? *Як вы лічыце, якое значэнне мелі рэформы для дабрабыту дзяржавы? Якія з іх, на вашу думку, былі найбольш важнымі?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Пераўтварэнні замацоўваліся шэрагам адпаведных заканадаўчых актаў. Пашыраліся правы шляхты. Згодна з прывілеем 1563 г. усе шляхціцы-хрысціяне — і праваслаўныя, і каталікі, і пратэстанты — атрымалі аднолькавыя правы. Іх мог судзіць толькі шляхецкі суд, і ўсе яны былі роўныя перад законам. Шляхціцы атрымалі права цалкам распараджацца сваёй зямлёй. У кожным павеце быў павінен збірацца *павятовы соймік*. На ім разглядаліся мясцовыя і агульнадзяржаўныя пытанні, законапраекты, вызначаліся мясцовыя падаткі, выбіраліся па 2 паслы на вальны сойм. Канчаткова ўсе змены былі афармлены Статутам ВКЛ **1566 г.** Рэформы садзейнічалі таму, што лідары шляхты ўжо не так імкнуліся да цеснага саюзу з Польшчай.

На картасхеме на 1-м форзацы знайдзіце, у які горад ехала на соймік шляхта з вашага населенага пункта.

Для далейшага паспяховага развіцця краіны было неабходна завяршыць Лівонскую вайну. Аднак перамовы з расійскім бокам пра заключэнне перамір'я не мелі поспеху. Таму прадстаўнікі ВКЛ звярнуліся па ваенную і фінансавую дапамогу да свайго даўняга саюзніка — Польшчы. Польскія ж палітыкі пажадалі замацаваць саюз падпісаннем новай, больш цеснай, міждзяржаўнай уніі. Тады б суседнія дзяржавы аб'ядноўваў ужо не толькі адзіны манарх, але і тэрыторыя, і агульная палітыка. Такім чынам, асноўнай прычынай заключэння новай уніі стала складаная знешнепалітычная сітуацыя ВКЛ.

Люблінскі сойм. Умовы уніі сталі галоўным пытаннем на агульным Люблінскім сойме. Перамовы пачаліся ў студзені 1569 г. і цягнуліся амаль 6 месяцаў. Дэлегаты ад ВКЛ на чале з Мікалаем Радзівілам Рудым выступалі супраць самой ідэі заключэння міждзяржаўнай уніі. Яны выказваліся за заключэнне ваеннага саюзу і правядзенне агульнай знешняй палітыкі. Польскі бок настойваў на *інкарпарацыі* (уключэнні) ВКЛ у склад Каралеўства Польскага. Польскія шляхціцы жадалі атрымаць новыя землі і пасады ў ВКЛ. Пад іх ціскам Жыгімонт II Аўгуст запатрабаваў, каб паслы ад ВКЛ пагадзіліся на прапанаваныя ўмовы. У знак пратэсту частка паслоў Княства пакінула Люблін. Тады польская шляхта дамаглася ад

Правообладатель Издательский центр БГУ

Жыгімонта II Аўгуста перадачы ў склад Каралеўства Польскага Падляшша, Валыні, Кіеўшчыны і Падолля.

Ці меў права вялікі князь зрабіць гэта? Як вы лічыце, якія настроі выклікала ў грамадстве страта часткі тэрыторыі?

З выступлення Яна Хадкевіча на Люблінскім сойме 1569 г.

Найсвятлейшы, найлітасцівейшы кароль!.. Як гэта ўсё балюча, немагчыма выказаць словамі… Мы Айчыну нашу, якую сваёй крывёю і жыццямі захавалі, абаранялі тут столькі, колькі маглі. Але тое, што мы не здолелі завяршыць гэтую абарону, дык няхай будзе гэта прыпісана перашкодам, лёсу і часу. Нам даводзіцца саступаць… Трэба так правесці да канца гэтую справу, каб Княства не было ўз'яднана з няволяю і зганьбаваннем нашым і нашчадкаў нашых… Няхай акт гэты так завершыцца, каб на нас не было ніводнай плямы… бо, без усялякага сумнення, прыйдзе час, што было б вельмі балюча нам ці ўнукам нашым…

Паразважайце над прамовай Яна Хадкевіча. Ці можна яго назваць патрыётам? Патлумачце свой адказ.



▲ Люблінская унія. Мастак *Я. Матэйка*. XIX ст.

? *Абмяркуйце, які момант Люблінскага сойма адлюстраваны на карціне. Дзе, на вашу думку, намаляваны прадстаўнікі Княства? Як аўтар перадае іх стаўленне да уніі?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

На працягу сакавіка — красавіка 1569 г. шляхта гэтых зямель, акрамя мазырскай, прысягнула на вернасць Польшчы. Дзяржава страчвала каля $^{1}/_{3}$ часткі тэрыторыі. Гэта яшчэ больш аслабіла ВКЛ, якое цяпер не магло пайсці на канфлікт з Польшчай.

Прадстаўнікі ВКЛ вярнуліся ў Люблін, і сойм аднавіў сумесныя пасяджэнні. Паслы ВКЛ пратэставалі супраць дзеянняў Жыгімонта II Аўгуста і польскага боку. У выніку быў распрацаваны варыянт дагавору, з якім пагадзіліся абодва бакі.

Нарэшце **1 ліпеня 1569 г.** быў падпісаны акт Люблінскай уніі паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Каралеўствам Польскім.



▲ Акт Люблінскай уніі

Умовы аб'яднання Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага. Згодна з актам засноўвалася новае дзяржаўнае ўтварэнне — **Рэч Паспалітая абодвух народаў**: «І цяпер Каралеўства Польскае і Вялікае Княства Літоўскае ёсць адно непадзельнае цела, а таксама не асобная, але адна супольная Рэч Паспалітая, якая з дзвюх дзяржаў і нацый у адзіны народ уз'ядналася». Але пад нацыямі, ці народамі, разумеліся выключна асобы, якія мелі палітычныя правы, — шляхціцы.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Рэспубліка (лац. *res publica* — супольная справа) перакладалася на старабеларускую мову як «рэч паспалітая». Шляхціцы лічылі службу Айчыне сваёй галоўнай, супольнай справай. Афіцыйная назва дзяржавы мянялася на працягу XVI—XVIII стст. У дакументах можна сустрэць наступныя абазначэнні: «Рэч Паспалітая Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага і правінцый, якія да іх належаць», «Рэч Паспалітая абодвух народаў», «Карона польскага, літоўскага і рускіх народаў і дзяржаў, якія да іх належаць».

Манарх выбіраўся прадстаўнікамі абедзвюх дзяржаў і каранаваўся толькі ў Кракаве як кароль польскі і вялікі князь літоўскі. Вышэйшым органам улады станавіўся агульны сойм. Дазвалялася набываць маёнткі і валодаць імі падданым Польшчы ў Княстве, а жыхарам ВКЛ — у Польшчы.

Рознымі заставаліся афіцыйныя мовы: у Польшчы — лацінская, у ВКЛ — старабеларуская.



▲ Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай згодна з Люблінскай уніяй

? *Як вы лічыце, ці захавала ВКЛ сваю самастойнасць? Адказ абгрунтуйце з дапамогай схемы.*

13—16

Правообладатель Издательский центр БГУ

Люблінская унія распачала працэс аб'яднання дзвюх дзяржаў у **федэрацыю**, які скончыўся толькі ў XVIII ст. Узмацнілася культурнае, палітычнае збліжэнне шляхты, эканамічнае супрацоўніцтва ВКЛ і Польшчы. У выніку з'явілася краіна, якая адыгрывала значную ролю ў жыцці Еўропы на працягу 200 гадоў і якая паўплывала на ўсё далейшае развіццё беларускіх зямель.

1. Чаму шляхта Вялікага Княства Літоўскага імкнулася да саюзу з Польшчай?
2. Як рэформы 1560-х гг. паўплывалі на становішча шляхты ў ВКЛ?
3. У сувязі з якімі абставінамі кіроўныя колы ВКЛ пайшлі на унію з Польшчай? Прывядзіце доказы за і супраць непазбежнасці заключэння уніі.
4. Якія вынікі для ВКЛ мела Люблінская унія?

5*. Растлумачце, чаму шляхта ўкраінскіх і падляшскіх зямель не супрацівілася іх уключэнню ў склад Польскага каралеўства. Скарыстайцеся дадатковымі крыніцамі інфармацыі.

§ 9. У дзяржаве «абодвух народаў»

Якія паўнамоцтвы меў вялікі князь літоўскі ў XV — першай палове XVI ст.?

У чым была своеасаблівасць палітычнага ладу Рэчы Паспалітай? Якое месца заняло ў гэтай дзяржаве Вялікае Княства Літоўскае?



▲ Генрых Валуа. Канец XVI ст.

Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай. Сістэма кіравання Рэчы Паспалітай вызначалася ўмовамі Люблінскай уніі. Таму пасля згасання дынастыі Ягайлавічаў у 1572 г. усе наступныя манархі ў дзяржаве былі выбарнымі. Першым такім каралём польскім і вялікім князем літоўскім стаў у 1573 г. брат французскага караля *Генрых Валуа*.

Каб атрымаць трон, ён падпісаў акт, які паводле яго імя атрымаў назву *«Генрыхавыя артыкулы»*. Гэты дакумент значна абмежаваў

Правообладатель Издательский центр БГУ

17—18

каралеўскую ўладу ў дзяржаве. Ён стаў асновай палітычнага ладу Рэчы Паспалітай і гарантаваў яго нязменнасць. Манарх у Рэчы Паспалітай мог быць толькі выбарным, а не спадчынным. У дакуменце абвяшчалася свабода веравызнання для хрысціян. Манарх павінен быў утрымліваць сталае войска і не парушаць прывілеі шляхты. Ён не мог без згоды сойма абвяшчаць і спыняць вайну, уводзіць новыя падаткі, склікаць паспалітае рушэнне. Кожны кароль абавязваўся шанаваць законы дзяржавы, абараняць яе межы. Ён мусіў захоўваць шляхецкія вольнасці, не выкарыстоўваць войска супраць шляхты, выконваць свае фінансавыя абавязацельствы перад дзяржавай.

У выніку Рэч Паспалітая стала адзінай у Еўропе краінай, у якой аснову дзяржаўнага ладу складала шляхецкая дэмакратыя. Гэта значыць, што права ўдзелу ў кіраванні дзяржавай тут мела цэлае саслоўе — шляхта.

На час бескаралеўя ўлада ў Рэчы Паспалітай пераходзіла да *прымаса* — кіраўніка Каталіцкага касцёла ў Польшчы, у ВКЛ — да вышэйшых ураднікаў. Менавіта яны склікалі надзвычайны сойм. На ім вызначаліся месца, дата і ўмовы выбрання новага караля. На наступным сойме паслы выбіралі манарха з некалькіх кандыдатур. Каранацыя магла адбыцца толькі пасля прынясення прысягі на «Генрыхавых артыкулах».

Найвышэйшым органам дзяржаўнай улады ў Рэчы Паспалітай з'яўляўся агульны (вальны) сойм. Ён складаўся з *сената* і *пасольскай ізбы*. Сойм быў павінен склікацца каралём не радзей за адзін раз на два гады. У выпадку неабходнасці манарх мог збіраць надзвычайны сойм раней за вызначаны час.

Сенат складаўся са 140 найвышэйшых духоўных і свецкіх ураднікаў. З іх толькі 27 урадаў належалі прадстаўнікам Княства. Сенатары прызначаліся каралём пажыццёва. З іх ліку выбіралася 16 чалавек, якія складалі сталую раду пры каралю. Пасольская ізба з'яўлялася ніжняй палатай сойма. Ад кожнага павета ВКЛ шляхта выбірала па два паслы. Яны толькі выказвалі пазіцыю павета і галасавалі згодна з выдадзенай ім пісьмовай інструкцыяй. У пасяджэннях маглі ўдзельнічаць (але не галасаваць) і прадстаўнікі сталічных гарадоў: Кракава і Вільні. Да сярэдзіны XVII ст. усе пастановы сойма — *канстытуцыі* — прымаліся большасцю галасоў.

Правообладатель Издательский центр БГУ



◀ Вальны сойм. Гравюра. 1622 г. На рэпрадукцыі пазначаны:
1 — кароль і вялікі князь;
2 — сенатары;
3 — паслы ад паветаў

Уявіце сябе ўдзельнікам сойма і прапануйце пытанне для абмеркавання на пасяджэнні.



▲ Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай

Пры дапамозе схемы і тэксту параграфа раскажыце пра сістэму кіравання Рэчы Паспалітай. Асобна вызначце ролю ВКЛ у Рэчы Паспалітай. Ці былі прычыны для незадаволенасці сваім становішчам у шляхты ВКЛ?

Правообладатель Издательский центр БГУ

«Шляхецкая дэмакратыя». На працягу XVI—XVIII стст. шляхта набывала ўсё больш правоў і прывілеяў. Яны атрымалі назву **«залатыя шляхецкія вольнасці»** і сталі асновай дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. Большасць адрозненняў у правах шляхты ВКЛ і Польшчы былі ліквідаваны рэформамі 1560-х гг. Шляхціца і яго маёмасць нельга было арыштоўваць без рашэння суда. Шляхта выбірала манарха і была вызвалена ад падаткаў. Пры парушэнні каралём яе прывілеяў, каб дасягнуць сваіх мэт, яна мела права на стварэнне *канфедэрацый*. Закон дазваляў ёй нават узброенае выступленне супраць караля — *рокаш*.

Успомніце, якія правы шляхта ВКЛ атрымала ў выніку гэтых рэформаў.

Збліжэнне абедзвюх частак Рэчы Паспалітай спрыяла перайманню шляхтай ВКЛ польскай культуры. Запазычваліся не толькі правы і вольнасці палякаў, але і мова, звычаі, вера. Добрае валоданне польскай мовай станавілася неабходным патрабаваннем для палітычнай кар'еры. Усё гэта збліжала шляхту ВКЛ з польскай шляхтай, але аддаляла ад іншых сацыяльных пластоў ВКЛ: мяшчан і сялян, якія захоўвалі старабеларускую мову і культуру.

Намаганні ВКЛ па захаванні самастойнасці. Статут ВКЛ 1588 г. Вынікі Люблінскай уніі не задаволілі ні шляхту ВКЛ, якая не атрымала ўсяго таго, да чаго імкнулася, ні магнатаў. Роля апошніх на сойме, дзе пераважалі прадстаўнікі Польшчы, была меншай, чым у велікакняжацкай Радзе. Амаль адразу пасля падпісання Люблінскай уніі яе ўмовы сталі парушацца бакамі. У ВКЛ рэгулярна збіраліся асобныя ад Польшчы дзяржаўныя з'езды шляхты, выбіраліся кандыдатуры будучага манарха.

У 1581 г. Стафан Баторый падпісаў закон аб стварэнні асобнага ад Польшчы найвышэйшага апеляцыйнага суда. Ім стаў **Галоўны Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага**. Ён пачаў сваю дзейнасць у *1582 г.* На яго пасяджэннях разглядаліся скаргі на дзеянні мясцовых уладаў, апеляцыі на рашэнні мясцовых судоў. Спачатку пасяджэнні праводзіліся чатыры разы на год: у Вільні, Троках, Новагародку і Менску, пазней — двойчы на год.

21—23

Правообладатель Издательский центр БГУ

Важным здабыткам для ВКЛ у захаванні сваёй самастойнасці стала прыняцце Статута ВКЛ **1588 г.** Гэта быў асноўны закон дзяржавы. Важную ролю ў яго падрыхтоўцы адыгралі канцлеры Мікалай Радзівіл Руды і Астафей Валовіч.



▲ Астафей Валовіч



Астафей Валовіч (1520—1587) — канцлер ВКЛ. Вылучыўся ў дыпламатычным, ваенным і грамадска-палітычным жыцці краіны. Прымаў удзел у падрыхтоўцы Статутаў ВКЛ 1566 і 1588 гг. Адзін з прынцыповых праціўнікаў падпісання Люблінскай уніі. Апякун кальвінізму. Шчыры прыхільнік гэтай плыні пратэстантызму, ён шмат зрабіў для яе пашырэння ў ВКЛ. Акрамя таго, ён прыклаў вялікія намаганні, каб стварыць у краіне вышэйшую навучальную ўстанову. Зараз гэта Вільнюскі ўніверсітэт — першы і старэйшы на землях былога ВКЛ. У сваім завяшчанні канцлер вызваліў усіх сваіх падданых ад прыгону.

Чые інтарэсы, на вашу думку, былі найважнейшымі для канцлера ВКЛ?



◀ Першы аркуш Статута ВКЛ 1588 г.

? *Якія элементы аздаблення старонкі сведчаць пра значнасць дакумента?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Пры ўдзеле высокакваліфікаваных юрыстаў удалося падрыхтаваць выдатны помнік права. З невялікімі зменамі ён дзейнічаў на беларускіх землях на працягу 250 гадоў. Яго складальнікі кіраваліся ідэямі гуманізму і патрэбамі тагачаснага грамадства, у першую чаргу шляхты. Яго артыкулы абавязвалі манарха забяспечваць рэлігійны мір у дзяржаве. Статут замацаваў статус старабеларускай мовы як мовы дзяржаўных дакументаў. Ён забараняў усе крыніцы няволі (рабства), акрамя палону. Статут замацаваў адмежаванне асобнага прывілеяванага саслоўя — шляхты — і завяршыў працэс афармлення прыгоннага права.

Новы асноўны закон Вялікага Княства Літоўскага перагледзеў многія палажэнні Люблінскай уніі. Статут забараняў польскай шляхце набываць землі і займаць пасады ў ВКЛ, захоўваў асобныя дзяржаўныя ўстановы, войска, права і скарб Княства. Значна паспрыяў зацвярджэнню Статута ВКЛ 1588 г. сярод іншых сенатараў падканцлер ВКЛ Леў Сапега, які атрымаў выключнае права на яго друкаванне.

25—27



Леў Сапега (1557—1633) — выдатны палітычны і грамадскі дзеяч ВКЛ. Паходзіў з заможнага шляхецкага роду. Пачаў сваю кар'еру як звычайны пісар. Дзякуючы асабістым якасцям і добрай адукацыі змог стаць падканцлерам, потым канцлерам, ваяводам віленскім, вялікім гетманам. Здольны дыпламат і дасведчаны праваед, ён хутка стаў адным з найбагацейшых людзей свайго часу. На працягу жыцця двойчы мяняў веру: з праваслаўя перайшоў у кальвінізм, потым у каталіцтва.



▲ Леў Сапега

Такім чынам, Вялікае Княства Літоўскае на працягу другой паловы XVI — пачатку XVII ст. здолела захаваць сваю самастойнасць у складзе Рэчы Паспалітай. Хуткаму збліжэнню дзвюх частак Рэчы Паспалітай спрыяла фарміраванне адзінага шляхецкага саслоўя.

Правообладатель Издательский центр БГУ

1. Складзіце табліцу «Органы ўлады Рэчы Паспалітай» паводле матэрыялаў § 8—9.

Назва	Як атрымліваў уладу / Склад і спосаб фарміравання	Паўнамоцтвы
Кароль		
Сойм		
Павятовы соймік		

2. Пералічыце рысы шляхецкай дэмакратыі ў дзяржаўным ладзе Рэчы Паспалітай. Ці можна назваць яе саслоўна-прадстаўнічай манархіяй? Свой адказ абгрунтуйце.

3. Прывядзіце два-тры доказы таго, што да сярэдзіны XVII ст. у Рэчы Паспалітай шляхта стала адзіным і кіроўным саслоўем.

4. Ацаніце значэнне Статута ВКЛ 1588 г.: а) для захавання самастойнасці ВКЛ; б) для розных саслоўяў.

5*. Уявіце, што вы апынуліся ў XVI ст. Складзіце пытанні для інтэрв'ю з адным з канцлераў ВКЛ: Астафеем Валовічам ці Львом Сапегам. Пры неабходнасці выкарыстайце дадатковыя крыніцы інфармацыі.

§ 10. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст.

Як склаліся адносіны Рэчы Паспалітай з суседнімі дзяржавамі пасля Лівонскай вайны? Што такое інтэрвенцыя?

Якімі былі кірункі і дасягненні знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай?

Барацьба са Швецыяй. Перамога Рэчы Паспалітай у Лівонскай вайне прывяла да абвастрэння адносін са Швецыяй. Да таго ж у 1586 г. памёр Стафан Баторый, і Рэч Паспалітая зноў шукала караля. Пасля доўгіх ваганняў прадстаўнікі ВКЛ падтрымалі кандыдатуру шведскага прынца Жыгімонта Вазы. Выбар яго каралём дазваляў уладзіць спрэчныя пытанні з паўночным суседам і заключыць новы саюз.

Акрамя таго, чарговы прэтэндэнт на трон быў пляменнікам апошняга караля з Ягайлавічаў — Жыгімонта II Аўгуста. За падтрымку сваёй кандыдатуры новы кароль *Жыгімонт III Ваза* (гады кіравання

Правообладатель Издательский центр БГУ

1587—1632) пагадзіўся зацвердзіць Статут ВКЛ 1588 г. і мірнае пагадненне з Расійскай дзяржавай. Выхаваны шчырым каталіком, ён працягнуў палітыку абароны інтарэсаў Каталіцкага касцёла, пачатую Стафанам Баторыем.

Пасля смерці свайго бацькі ён стаў яшчэ і каралём Швецыі. Гэта прывяло да стварэння асабістай уніі Рэчы Паспалітай са Швецыяй. Кароль-каталік, які да таго ж увесь час адсутнічаў у краіне, не карыстаўся папулярнасцю ў пратэстанцкай Швецыі. Больш за тое, кароль Жыгімонт III Ваза абвясціў пра далучэнне часткі Эстоніі да Рэчы Паспалітай. У 1599 г. шведы пазбавілі Жыгімонта III трона.



▲ Жыгімонт III Ваза

Гэта стала прычынай вайны **1600—1629 гг.** са Швецыяй, да якой Рэч Паспалітая аказалася не гатовая. ВКЛ і Польшча фактычна праводзілі самастойную знешнюю палітыку. Польшча ваявала ў Малдавіі з Асманскай імперыяй. Таму супраць Швецыі было накіравана спачатку толькі малое войска ВКЛ на чале з Крыштафам Радзівілам Перуном. Шведы ў 1600 г. вельмі хутка ўзялі пад свой кантроль Эстонію і большую частку Лівоніі, акрамя Рыгі. Новы галоўнакамандуючы, вялікі гетман ВКЛ Ян Караль Хадкевіч, змог адкінуць шведаў. Самая значная перамога была ім атрымана ў бітве пад Кірхгольмам у **1605 г.**



Ян Караль Хадкевіч (1560—1621) — вялікі гетман ВКЛ. Выдатны ваенны кіраўнік і палітычны дзеяч. Ён ужыў новыя метады вядзення баявых дзеянняў, заснаваныя на выкарыстанні гусарскай кавалерыі. Дзякуючы новай тактыцы і ваеннаму таленту не аднойчы атрымліваў перамогу над праціўнікам, які нярэдка ў некалькі разоў перавышаў сілы войскаў гетмана.



▲ Ян Караль Хадкевіч

Правообладатель Издательский центр БГУ

З паэмы «Кароламахія» Крыштафа Завішы (1606)

Бітваў суровых так шмат… І вось гэтыя рукі нярэдка
Зброю трымалі ў вайне і не раз здабылі перамогу.
Шведы разбіты ў васьмі папярэдніх ваенных сутычках.
Страшная бітва была, бо адзін дзень не бачыў ніколі
Столькі забітых — яны напаўнялі лівонскія землі.
Загінуўшы імгненна, тады заслалі палі пад Кірхгольмам! <…>
Мужна ахоўваць Радзіму і ворагаў гнаць з яе межаў
Бог дазваляе і прырода, ніводны закон не пярэчыць.

На падставе ўрыўка адкажыце, як сучаснікі ацанілі перамогу ў бітве пад Кірхгольмам і асобу Яна Караля Хадкевіча.



▲ Гусары. Малюнак пачатку XVII ст.

Ваенныя дзеянні супраць Швецыі, а таксама неўраджаі прывялі да значнага пагаршэння эканамічнага становішча дзяржавы. Падаткі раслі, але дзяржаўны скарб амаль увесь час пуставаў. Жаўнеры (наёмныя воіны), якім не плацілі жалавання, пачалі разбягацца. Я. К. Хадкевіч быў вымушаны абараняцца ад шведаў малымі атрадамі. Адначасова з вайной са Швецыяй войска ВКЛ актыўна ўдзельнічала

Выкажыце меркаванні, чаму так адбывалася.

Правообладатель Издательский центр БГУ

ў *інтэрвенцыі* ў Расію. Усе гэтыя праблемы прывялі да спынення баявых дзеянняў і падпісання шэрагу часовых перамір'яў.

У пачатку 1620-х гг. Швецыя скарысталася вайной паміж Рэччу Паспалітай і Асманскай імперыяй. Летам 1621 г. шведскае войска аблажыла Рыгу. Нягледзячы на супраціўленне гарнізона, горад быў захоплены. У верасні Рэч Паспалітая заключыла мір з Асманскай імперыяй. Цяпер яна змагла накіраваць свае войскі супраць Швецыі. Вайна завяршылася падпісаннем у 1629 г. перамір'я ў Альтмарку (Польшча). Да Швецыі адышлі землі да Заходняй Дзвіны разам з Рыгай і большасць партоў у Прусіі. Рэч Паспалітая страціла права мець ваенны флот у Гданьску і кантроль над гандлем, які ішоў праз гэты порт.

Інтэрвенцыя ў Расію. Смерць апошняга расійскага цара з дынастыі Рурыкавічаў прывяла да барацьбы за ўладу паміж баярамі. Скарыстацца складанай сітуацыяй усходняга суседа імкнуліся і палітычныя сілы Рэчы Паспалітай.

Успомніце, якія падзеі адбываліся ў гэты час у Расійскай дзяржаве.

Яны выкарысталі чуткі пра цудоўнае выратаванне царэвіча Дзмітрыя. У ВКЛ з'явіўся чалавек, магчыма, мясцовы шляхціц, які ўвайшоў у гісторыю як *Ілжэдзмітрый I*. Спачатку яго падтрымалі некаторыя магнаты. Ён паабяцаў ім за дапамогу вярнуць ВКЛ Смаленшчыну, шляхце даць новыя землі, пашырыць каталіцкую веру. У *1604 г.* самазванец на чале наёмнага войска і *казакаў* выступіў у паход на Маскву. Наступным летам ён быў узведзены на царскі трон.

27—30

З апісання шведскага падарожніка Пятра Пятрэя

Успаміналі, што новы цар любіў пагутарыць, здзіўляў начытанасцю і ведамі, у спрэчках часта прыводзіў як доказы факты з жыцця іншых народаў ці гісторыі з уласнага мінулага. Здзіўляла масквічоў тое, што ён… не хадзіў у лазню, не дазваляў крапіць сябе святою вадою. Любіў хадзіць па горадзе, заглядваць у майстэрні і заводзіць размовы з першым спатканым.

Што ў паводзінах Ілжэдзмітрыя I, на вашу думку, выдавала ў ім чужынца?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Маскоўскія баяры, незадаволеныя палітыкай і паводзінамі новага цара, арганізавалі супраць яго змову. Падчас паўстання ў 1606 г. ён быў забіты. У Расіі пачаўся чарговы этап барацьбы за ўладу.

У **1609 г.** кароль Жыгімонт III Ваза без згоды вальнага сойма распачаў вайну супраць Расійскай дзяржавы і аблажыў Смаленск. У *1610 г.* частка маскоўскіх баяр пайшла на перамовы з каралём. Баяры запрасілі на царства яго сына, каралевіча Уладзіслава.



▲ Войны з Расійскай дзяржавай у першай палове XVII ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Армія Рэчы Паспалітай змагла заняць значную частку Расійскай дзяржавы і ўвайшла ў Маскву. Аднак сілы народнага апалчэння вызвалілі ад шляхецкіх войскаў Маскву і яе ваколіцы.

Паступова войскі Рэчы Паспалітай былі адкінуты да Смаленска. Але ваенныя дзеянні не спыніліся. У 1618 г. шляхецкія палкі разам з казакамі змаглі зноў дайсці да Масквы, але штурм горада аказаўся няўдалым. Пазбавіць трона *Міхаіла Фёдаравіча* Раманава, якога абраў царом Земскі сабор, не атрымалася. Бакі былі вымушаны пайсці на перамовы. Згодна з *Дэвулінскім перамір'ем* **1618 г.** каралевіч Уладзіслаў Ваза захаваў тытул цара, да ВКЛ вярнуліся смаленскія землі (акрамя Вязьмы). Чарнігаўскія і ноўгарад-северскія землі адышлі да Польшчы. У выніку Рэч Паспалітая набыла найбольшыя памеры за ўвесь час свайго існавання.



▲ Уладзіслаў Ваза. Мастак *П. П. Рубенс*. Першая чвэрць XVII ст.

Прасачыце, як змянілася тэрыторыя Рэчы Паспалітай пасля перамір'я 1618 г.

Смаленская вайна (1632—1634). Расійскі бок вырашыў вярнуць страчаныя землі і скарыстаў час бескаралеўя пасля смерці Жыгімонта III. У гэты перыяд шляхта не магла сабраць паспалітае рушэнне і арганізаваць абарону. Таму цар вырашыў не чакаць канца перамір'я. У канцы верасня **1632 г.** 24-тысячнае расійскае войска перайшло мяжу Рэчы Паспалітай. Расійскія ратнікі хутка захапілі памежныя гарады і падышлі да Смаленска. Смаленск абараняў невялікі гарнізон у 2 тыс. чалавек. Аднак з наскоку горад узяць не ўдалося, і ў снежні 1632 г. расійскія войскі перайшлі да аблогі.

Гетман Крыштаф Радзівіл адправіў пад горад дапамогу. Аблога зацягнулася на 8 месяцаў. Тым часам абодва бакі накіроўвалі невялікія атрады на варожую тэрыторыю. Войскі ВКЛ і крымскія татары атакавалі пскоўскія і паўднёвыя землі Расійскай дзяржавы. Расійскія атрады ў адказ напалі на Полацк і яго ваколіцы, віцебскія і веліжскія

Правообладатель Издательский центр БГУ



◀ Медаль у гонар перамогі пад Смаленскам

? *Як вы лічыце, чаму ў гонар гэтай перамогі быў выбіты медаль?*

землі. Сабраўшы 25-тысячнае войска, кароль *Уладзіслаў IV Ваза* (гады кіравання *1632—1648*) рушыў да Смаленска. Пасля некалькіх бітваў расійскае войска было адцеснена ад горада і акружана. У лютым 1634 г. яно капітулявала.

Уладзіславу IV Вазе не ўдалося ўтрымаць поспех і ўвайсці ў Маскву. Вярнуць памежныя крэпасці ён таксама не здолеў. Увесну **1634 г.** было падпісана *Палянаўскае перамір'е* на 20 гадоў. Да Расіі адышоў толькі адзін горад — Сярпейск. Уладзіслаў IV адмовіўся ад сваіх прэтэнзій на маскоўскі трон узамен на значную грашовую суму. Атрыманыя згодна з Дэвулінскім перамір'ем землі засталіся ў Рэчы Паспалітай.

Прасачыце па карце атласа, як змяніліся межы Рэчы Паспалітай на працягу першай паловы XVII ст.

Такім чынам, у першай палове XVII ст. Рэч Паспалітая праводзіла актыўную знешнюю палітыку на поўдні, усходзе і поўначы. У змаганні з Расійскай дзяржавай і Асманскай імперыяй ёй удалося адстаяць свае інтарэсы і вярнуць частку зямель на ўсходзе. Доўгае супрацьстаянне са Швецыяй скончылася не на карысць Рэчы Паспалітай. Асабістая унія паміж гэтымі дзяржавамі была разарвана. Швецыі адышлі значныя тэрыторыі ў Прыбалтыцы, што прывяло да страты галоўных марскіх партоў і пагаршэння эканамічнага становішча ў краіне.

1. Вызначце асноўныя кірункі знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст.

2. Назавіце прычыны паражэння Рэчы Паспалітай у вайне са Швецыяй.

Правообладатель Издательский центр БГУ

3. Запоўніце табліцу «Рэч Паспалітая ў войнах і канфліктах першай паловы XVII ст.». Ці можна назваць знешнюю палітыку Рэчы Паспалітай паспяховай? Аргументуйце свой адказ.

Гады вайны	Асноўныя прычыны	Праціўнікі	Асноўныя бітвы	Вынікі

4*. Пры дапамозе дадатковых крыніц падрыхтуйце невялікае паведамленне пра адну з бітваў першай паловы XVII ст. Знайдзіце яе выяву і праілюструйце свой аповед.

§ 11. Сельская гаспадарка

Што такое запрыгоньванне? Калі пачалося заканадаўчае афармленне прыгоннага права ў ВКЛ?

Як змянілася эканамічнае жыццё краіны ў выніку валочнай памеры? Як гэтая рэформа паўплывала на становішча сялян?

Перадумовы аграрнай рэформы. У другой палове XVI — першай палове XVII ст. паспяховае развіццё дзяржавы па-ранейшаму залежала ад сельскай гаспадаркі. Валоданне зямлёю не толькі забяспечвала ста́лы даход, але і рабіла чалавека ўплывовым.



▲ Землеўладальнікі ў Рэчы Паспалітай

Правообладатель Издательский центр БГУ

Са Статута ВКЛ 1588 г.

Простага стану чалавек, не атрымаўшы раней ад нас, гаспадара, вольнасці шляхецкай, маёнткаў і зямель шляхецкіх ніякім звычаем займець, ані купляю сваёю на вечнасць набываць не можа.

Хто не меў права валодаць зямлёй?

Развіццё гарадоў унутры краіны і рост насельніцтва ў краінах Заходняй Еўропы выклікалі павелічэнне попыту на збожжа.



▲ Змены кошту на прадукцыю раслінаводства (за 60 снапоў у грошах)

? *Як вы лічыце, продаж якой сельскагаспадарчай культуры даваў найбольшы прыбытак? Чаму?*

Найбольшы прыбытак ад продажу збожжа маглі атрымаць шляхціцы, бо іх тавары не абкладаліся пошлінамі. Аднак, каб атрымаць больш даходу, трэба было перабудаваць усю гаспадарку. Таму землеўласнікі пачалі шукаць новыя формы гаспадарання. Гэта спрыяла пераходу ад натуральнай да таварнай гаспадаркі.

«Устава на валокі» 1557 г. і яе рэалізацыя. Першыя спробы гаспадарчага рэфармавання былі зроблены ў 1530—1540-х гг. каралевай Бонай Сфорца. Паводле яе загаду былі вызначаны дакладныя

Правообладатель Издательский центр БГУ

памеры сялянскіх надзелаў і павіннасцяў. Пераўтварэнні, праведзеныя ёю ў Клецкім і Пінскім *старостваx*, далі хуткі эканамічны эфект.



Бона Сфорца (1494—1557) — каралева польская і вялікая княгіня літоўская. Жонка Жыгімонта I Старога. Паходзіла з дынастыі міланскіх герцагаў. Дзейнасць каралевы і яе акружэння значна спрыяла распаўсюджванню на беларускіх землях здабыткаў італьянскага Адраджэння. Выхаваная лепшымі італьянскімі гуманістамі, яна выкарыстоўвала свае веды на карысць новай радзімы. За ўласныя грошы яна разгарнула актыўнае добраўпарадкаванне і будаўніцтва ў гарадах і сваіх прыватных уладаннях. Дзякуючы эканамічнаму таленту стала адной з найбагацейшых жанчын свайго часу. Для перавозкі яе каштоўных рэчаў і грошай спатрэбілася каля 60 вазоў.



▲ Бона Сфорца. Мастак *Л. Кранах Малодшы*. Сярэдзіна XVI ст.

У 1550-я гг. Жыгімонт II Аўгуст, каб павялічыць прыбыткі скарбу, правёў дзяржаўную рэформу ў галіне сельскай гаспадаркі. Асноўным дакументам аграрнай рэформы **(валочнай памеры)** стала *«Устава на валокі»* **1557 г.**

Усе ворыўныя землі падзяляліся на стандартнага памеру надзелы — **валокі**. Адна валока складала каля 21,36 га. Калі зямля была дрэннай якасці, памеры валокі маглі павялічыць амаль удвая. Валока станавілася і асноўнай адзінкай абкладання сялян павіннасцямі. Раней падаткі збіраліся з сялянскай гаспадаркі, пры гэтым колькасць зямлі і членаў сям'і не ўлічвалася. Як правіла, у большасці сялянскіх гаспадарак мелася паўвалокі. Калі сям'я магла дазволіць сабе апрацаваць большую колькасць, то яна брала валоку. На ўрадлівых землях ствараліся фальваркі.

33—34

На ўсходзе, дзе разгарнуліся асноўныя падзеі Лівонскай вайны, правядзенне рэформы расцягнулася амаль на стагоддзе. Высокая

Правообладатель Издательский центр БГУ

прыбытковасць фальваркавай гаспадаркі пераканала землеўласнікаў у яе эфектыўнасці. Паступова валочная памера была праведзена і ў прыватных уладаннях.

Вынікі рэформы. Афармленне прыгоннага права. Аграрная рэформа прывяла да значнага ўздыму сельскай гаспадаркі і павышэння яе прыбытковасці. Павялічыліся плошчы пасеваў за кошт распрацоўкі пад ворыва лясоў. У дзяржаве стаў актыўна развівацца ўнутраны гандаль. Адбыўся пераход да больш дасканалай агратэхнікі, замацавалася трохполле, павысілася ўраджайнасць. Для апрацоўкі глебы сталі масава выкарыстоўвацца плуг і конная запрэжка. Была зменена сістэма збору падаткаў. Яны сталі спаганяцца не з гаспадаркі (падымны падатак), а з валокі (пазямельны падатак). Адначасова сяляне былі канчаткова прыпісаны да сваіх зямельных надзелаў.

Статуты ВКЛ 1566 і 1588 гг. завяршылі запрыгоньванне сялян. Згодна са Статутам ВКЛ 1588 г. большасць іх страцілі асабістую свабоду. Селянін і яго маёмасць прызнаваліся ўласнасцю феадала і падлягалі яго суду. Сялянам забаранялася пакідаць сваю зямлю і ўласніка. Спачатку Статут 1566 г. дазваляў шукаць уцекачоў 10 гадоў. З 1588 г. тэрмін пошуку збеглых павялічыўся да 20 гадоў.



◀ Гравюра. XVI ст.

? *Вызначце, які этап сельскагаспадарчай працы адлюстраваны на гравюры. Раскажыце, з дапамогай якіх жывёл і прылад працы абраблялі глебу.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Феадальныя павіннасці. Памер і від павіннасцяў залежаў ад якасці і колькасці зямлі ў сялянскай сям'і і вызначаўся землеўласнікам. Феадал быў зацікаўлены, каб кожная гаспадарка ўвесь час прыносіла прыбытак. Таму існавалі розныя формы гаспадарання і асноўныя віды павіннасцяў.



▲ Павіннасці сялян

? *Пры дапамозе схемы і тэксту параграфа вызначце памер і сутнасць павіннасцяў для кожнай катэгорыі сялян.*

У маёнтках, дзе існавалі фальваркі, сяляне выконвалі паншчыну. У цяглых сялян яна спачатку складала 2 дні на тыдзень з валокі. У дадатак яны плацілі і *чынш* ад 6 да 21 гроша ў год. На неўрадлівых і рэдказаселеных землях фальваркава-паншчынная сістэма не атрымала значнага пашырэння. Там сяляне за карыстанне зямлёй плацілі толькі чынш.

У пачатку XVII ст. сфарміравалася катэгорыя *асадных* сялян, якія плацілі чынш ад 66 да 106 грошаў у год. У Падняпроўі і Падзвінні заставалася шмат даннікаў. Акрамя таго, усе сяляне выходзілі на розныя працы *(гвалты, талокі)* і плацілі натуральны падатак — *дзякла*. Звычайна гэта быў воз сена, дзве бочкі аўса, гусь, дзве курыцы, 20 яек.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Кошт прадуктаў харчавання і іншых тавараў (канец XVI ст.)

Жывёлы і прадукты харчавання	Цана, грошаў	Побытавыя рэчы і прылады працы	Цана, грошаў
Масла, мёд (крынка)	30	Палатно льняное простае (локаць)	2
Цыбуля, агуркі салёныя (бочка)	20		
Бурак, морква, рэпа, рэдзька, агуркі свежыя (бочка)	6	Палатно льняное тонкае (локаць)	6
Яйкі (дзясятак)	0,2	Кажух жаночы	70
Паляўнічы сабака	300	Сукно простае з воўны (локаць)	3
Гусь, курыца	3	Сякера, каса	6
Сена (воз)	8	Серп	2
Карова	100	Воз сялянскі	6
Конь, вол	60	Сані сялянскія	2

? *Падлічыце з дапамогай тэксту параграфа, колькі грошаў трэба было заплаціць селяніну замест натуральных выплат. Вызначце, што вырошчвалі і прадавалі ў гэты час.*

Сяляне-слугі заставаліся асабіста вольнымі. Яны выконвалі ваенную службу, уваходзілі ў склад сельскай адміністрацыі. Асобную групу складалі сельскія рамеснікі і тыя, хто займаўся рознымі промысламі. Іх асноўнай павіннасцю было выкананне сваіх прафесійных абавязкаў. Надзвычайнае павелічэнне павіннасцяў і падаткаў прыводзіла да незадавальнення сялян.



▲ Формы супраціву сялян

? *Як вы лічыце, якая з формаў супраціву сустракалася часцей за ўсё? Аргументуйце свой адказ.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

У першай палове XVII ст. ВКЛ ператварылася ў аднаго з асноўных пастаўшчыкоў збожжа ў краіны Заходняй Еўропы. Павелічэнне даходаў дзяржаўнага скарбу і землеўласнікаў спрыяла ўмацаванню эканомікі краіны. Асноўнай формай гаспадаркі стала фальваркава-паншчынная сістэма. Яна праіснавала на беларускіх землях да канца XIX ст. У выніку ў краіне актыўна развіваўся гандаль і таварна-грашовыя адносіны. У сваю чаргу, гэта садзейнічала развіццю культуры, адукацыі, вайсковай справы.

1. Чым можна растлумачыць уздым сельскай гаспадаркі ВКЛ у XVI ст.?
2. Складзіце табліцу «Аграрная рэформа 1557 г.».

Прычыны	Мэты	Мерапрыемствы	Вынікі

3. Якія дакументы завяршылі запрыгоньванне сялян? Чым адрозніваўся прыгонны селянін ад вольнага чалавека?
4. Патлумачце словы Л. Сапегі: «Для каго селянін халоп халопам, для мяне ж вяльможны, яснавяльможны. Бо калі сялян мець не буду, тады і сам яснавяльможным панам не буду». Выкажыце меркаванне, ці былі зацікаўлены землеўласнікі ў дабрабыце сялян. Абгрунтуйце свой адказ.

§ 12. Гарадское жыццё

Што такое магдэбургскае права?

Як змяніліся беларускія гарады? Што новага з'явілася ў развіцці рамяства і гандлю?

Гарады і мястэчкі. З сярэдзіны XVI ст. стала расці колькасць гарадскога насельніцтва на беларускіх землях. Гэтаму спрыялі эканамічныя пераўтварэнні ў краіне. Правядзенне валочнай памеры

Правообладатель Издательский центр БГУ

падштурхнула развіццё гандлю. У сваю чаргу, гэта прывяло да хуткага росту колькасці мястэчак. Большасць беларускіх гарадскіх паселішчаў, сярод якіх Глыбокае, Вілейка, Паставы, Івацэвічы, Стоўбцы, Сянно, Шклоў, вядомыя менавіта з XVI ст.

З якога часу вядомы ваш населены пункт?



На падставе дыяграмы пракаментуйце тэмпы росту колькасці гарадоў і мястэчак з XVI да сярэдзіны XVII ст.

У невялікіх гарадах і мястэчках жыло ад 1,5 да 3 тыс. жыхароў. Буйны́мі гандлёва-рамеснымі цэнтрамі заставаліся Полацк, Магілёў, Слуцк, Віцебск, Берасце, насельніцтва якіх складала больш за 10 тыс. чалавек.

З пачатку XVII ст. у будаўніцтве сталі часцей выкарыстоўваць камень і цэглу замест дрэва. Акрамя касцёлаў і цэркваў мураванымі рабілі першыя паверхі багатых дамоў. Гарады набывалі новае, адпаведнае часу аблічча. Спачатку ў Нясвіжы, Быхаве, а потым і ў іншых гарадах адышлі ад сярэднявечнай заблытанай планіроўкі. З'явілася рэгулярная забудова з кварталамі і цэнтральнай рынкавай плошчай. На ёй узводзіліся мураваныя ратушы, гандлёвыя рады, цэрквы. Цэнтральныя вуліцы пачалі брукаваць. У Гародні з'явіўся водаправод.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Гародня. Гарадская забудова. З гравюры XVI ст.

? *На падставе гравюры апішыце знешні выгляд гарадскіх будынкаў.*



▲ Нясвіж. Гравюра пачатку XVII ст. *Т. Макоўскага*

? *Параўнайце выявы Гародні і Нясвіжа. Як змянілася планіроўка гарадоў у пачатку XVII ст.?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Як вы думаеце, хто такія «прышлыя людзі»? Адкуль яны браліся?

Рост колькасці гарадскіх жыхароў адбываўся ў значнай ступені за кошт «прышлых людзей». Для павелічэння прыбыткаў шляхта і духавенства сялілі на сваіх гарадскіх пляцах залежных ад іх сялян-рамеснікаў. Так паступова ў гарадах з магдэбургскім правам узнікалі *юрыдыкі* — асобныя раёны, якія не падпарадкоўваліся гарадскім уладам.

Як і сяляне, усе мяшчане плацілі падаткі дзяржаве і ўласніку зямлі. Дзяржава атрымлівала ад іх падымны і надзвычайныя падаткі, грошы на пастой войска. Мяшчане плацілі падатак за ўчастак пад забудову і за права займацца рамяством ці гандлем. Акрамя таго, яны выконвалі шэраг павіннасцяў на карысць горада. Гарады з магдэбургскім правам штогод плацілі дзяржаве за наданне гарадскіх правоў. Рэшта ад падаткаў заставалася ў гарадскім скарбе і ішла на патрэбы горада (абарону і добраўпарадкаванне).

41—42

Рамяство. Цэхі і гільдыі. Другая палова XVI — першая палова XVII ст. сталі часам найбольшага росквіту рамеснай вытворчасці і промыслаў у гарадах. Выросла колькасць рамеснікаў. У невялікіх гарадах, такіх як Нясвіж, Шклоў, Клецк, працавалі ад некалькіх дзя-



◀ Гравюра XVI ст.

? *Вызначце, прадстаўнікі якой прафесіі паказаны на гравюры. Як вы думаеце, якія рэчы яны вырабляюць? Аргументуйце свой адказ.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

сяткаў да 200—300 майстроў. Паглыблялася рамесная спецыялізацыя. Найбольш пашыранымі былі дрэваапрацоўка, дзе вылучылася не менш за 27 прафесій і спецыяльнасцяў, і металаапрацоўка (25 прафесій).

Над вырабам адзення працавалі краўцы, сярмяжнікі, кафтаннікі, панчошнікі, капялюшнікі. Магілёў славіўся кушнерскім майстэрствам (апрацоўкай аўчын), Капыль — ткацтвам і вырабам адзення, Гародня — мылаварамі, Вільня — злотнікамі. Усяго ў гэты перыяд існавала каля 200 рамесных прафесій і спецыяльнасцяў. Толькі ў Магілёве ў XVII ст. іх налічвалася каля 80.

Ці былі гэтыя спецыяльнасці ў беларускіх гарадах Позняга сярэднявечча?

Развіццё рамяства і гандлю садзейнічала з'яўленню рамесных цэхаў амаль ва ўсіх гарадах. Кожны цэх меў свой статут, зацверджаны каралём, скарб, герб і пячатку.

Цэх аб'ядноўваў майстроў адной ці блізкіх спецыяльнасцяў, якія мелі ўласныя майстэрні. У яго павінны былі ўваходзіць людзі «дабрачынныя і жанатыя», якія не былі «п'яніцамі ці гульцамі ў косці». З іх ліку на год выбіраліся цэхмайстры. У цэх таксама ўваходзілі падмайстры і вучні. Апошнія працавалі некалькі гадоў толькі за хлеб і навуку. Па выніках вучобы падмайстры здавалі экзамен на званне майстра.

▶ Пячатка менскага ганчарска-мулярскага цэха. 1650—1670-я гг.



? *Якія выявы сведчаць, што цэх аб'ядноўваў рамеснікаў розных спецыяльнасцяў? Як вы лічыце, чаму быў створаны гэты сумесны цэх?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Са статута цэха злотнікаў, кавалёў, кацельшчыкаў, латуншчыкаў, слесараў, гадзіннікавых майстроў, збраёўнікаў і нажэўшчыкаў г. Менска 1591 г.

Загадваем, каб кожны, хто хоча з дазволу ўсяго цэха стаць майстрам у г. Менску, уласнаручна вырабіў у прысутнасці 2 прызначаных цэхам майстроў ніжэй апісаны шэдэўр па сваім рамястве і перадаў яго ў цэх… Аднак сыноў і дачок майстроў… мы вызваляем ад шэдэўра і аднадушна прызнаём вольнымі, даём ім у абавязак толькі арганізацыю вячэры, якую яны павінны даць згодна звычаю.

На падставе дакумента і тэксту параграфа вызначце, як можна было стаць майстрам.

Цэхі рэгламентавалі колькасць, якасць прадукцыі і цэны на яе. Рамеснікі, што не ўваходзілі ў цэх і працавалі без дазволу, зваліся *партачамі*. За продаж прадукцыі іх каралі штрафамі, канфіскоўвалі тавар і імкнуліся выгнаць з гарадоў.

Гандляры таксама згуртоўваліся ў прафесійныя арганізацыі — купецкія цэхі, брацтвы, адпаведныя заходнееўрапейскім *гільдыям*. У беларускіх гарадах (Магілёў, Нясвіж) яны аб'ядноўвалі гандляроў аднаго горада. Такія брацтвы мелі свой статут, дом для сходаў, скарб, пячатку, зброю. Яны вызначалі правілы гандлю ў гарадах і іх ваколіцах, абаранялі інтарэсы сваіх сяброў. Тым, хто не ўваходзіў у купецкае брацтва, забаранялася гандляваць у горадзе. Стаць сябрам такой арганізацыі было няпроста. Кандыдаты павінны былі атрымаць рэкамендацыі ад купцоў брацтва, прысягнуць магістрату і ўнесці ўступны ўзнос.

Унутраны і знешні гандаль. Працягваў развівацца ўнутраны і знешні гандаль. Частка тавараў прадавалася ў лаўках на рынкавых плошчах. Толькі ў Магілёве такіх лавак было каля 400. У іх можна было купіць тканіну, адзенне, воск, паперу, порах, футра, розныя прадукты харчавання і шмат іншага. Гандлем у блізкіх ваколіцах гарадоў займаліся *прасо́лы*. Замежныя тавары прывозілі найбольш заможныя купцы — *госці*. Адсюль паходзіць і назва вялікіх

Па картасхеме на 1-м форзацы вызначце, якія гарады ВКЛ і замежжа злучалі гасцінцы.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Гандаль у ВКЛ

? *З дапамогай схемы высветліце, якія тавары прывозіліся на беларускія землі і якія вывозіліся. Прывядзіце доказы таго, што ВКЛ выконвала ролю пасрэдніка ў гандлі паміж краінамі. Свой адказ абгрунтуйце.*

гандлёвых дарог — гасцінцы. Па-ранейшаму вельмі важнай гандлёвай артэрыяй заставалася Заходняя Дзвіна, якая злучала беларускія гарады з Рыгай.

Якія яшчэ рэкі былі важнымі гандлёвымі шляхамі?

Аднак існавала і нямала перашкод для гандлю. Цэхавыя абмежаванні і малая колькасць грошай у сялян не садзейнічалі развіццю ўнутранага гандлю. У розных частках дзяржавы выкарыстоўваліся свае меры вагі. ВКЛ і Польшча ўсё яшчэ карысталіся рознай манетай. Каб паскорыць эканамічнае развіццё, Стафан Баторый ураўнаваў меры вагі і вартасць польскага і літоўскага *грошаў*.



▲ Грош Стафана Баторыя

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Казак. Малюнак сярэдзіны XVII ст.

Сацыяльныя канфлікты. Ваенныя і палітычныя падзеі, эканамічныя пераўтварэнні абумовілі рост сацыяльных канфліктаў. Мяшчане выступалі са скаргамі на існаванне і пашырэнне юрыдык, жыхары якіх не плацілі гарадскія падаткі. Нярэдкімі сталі сутычкі паміж прадстаўнікамі розных канфесій. Калі скаргі ўладам на парушэнні законаў не давалі вынікаў, узнікалі канфлікты паміж багатымі гарадскімі вярхамі, членамі магістрата і гарадской беднатою. У выніку гарадская бедната, як і сяляне, бегла да казакаў у Запарожскую Сеч. Так адбывалася *паказачванне*.

Нярэдка здараліся і паўстанні. Самым значным і працяглым па часе стала гарадское паўстанне ў Магілёве. У **1606 г.** супраць магістрата выступілі жыхары Магілёва на чале з цэхмайстрам Стахорам Мітковічам. Яны ўварваліся ў ратушу, разагналі стары магістрат і выбралі новы. Ён дзейнічаў у горадзе два гады і праводзіў палітыку на карысць незаможных рамеснікаў. Раскол сярод былых паплечнікаў у 1608 г. дазволіў вярнуцца да ўлады ранейшым членам магістрата. У **1610 г.** зноў пачаліся хваляванні сярод мяшчан. Гэтыя выступленні былі хутка задушаны, а іх арганізатары прыцягнуты да суда. Пяць чалавек пакаралі смерцю, астатніх зняволілі на 12 тыдняў і выгналі з горада.

З пратакола пасяджэння суда 27 ліпеня 1610 г.

Са скаргі і следства вынікае, што гэтыя абвінавачаныя сапраўды ўзнімалі бунты, адгаворвалі просты народ ад паслухмянасці ўладам, забаранялі здаваць магістрату вызначаныя падаткі і зборы, пагражалі магістрату і гарадскім уладам, ударылі ў набат і крычалі, заклікаючы да выступлення супраць рады. Сабраўшы натоўп, ажыццявілі напад на ратушу і ўзламалі дзверы. Такімі дзеяннямі і іншымі шляхамі яны парушалі грамадскі спакой.

Вызначце, якімі формамі барацьбы скарысталіся паўстанцы.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Такім чынам, у другой палове XVI — першай палове XVII ст. значна павялічылася колькасць гарадоў і іх насельніцтва. У гэты час хуткімі тэмпамі ішло фарміраванне ўнутранага рынку, ствараліся новыя прафесійныя аб'яднанні.







1. Назавіце прычыны хуткага росту гарадоў і мястэчак.
2. Вызначце прычыны ўзнікнення юрыдык.
3. Прывядзіце не менш за пяць прыкладаў спецыялізацыі рамеснікаў беларускіх гарадоў.
4. Пералічыце галоўныя прыметы рамесных цэхаў. Прывядзіце доказы таго, што дзяржава была зацікаўлена ў іх стварэнні. * Распрацуйце малюнак герба для цэха рамеснікаў (па асабістым выбары).
5. Складзіце апавяданне пра барацьбу гараджан паводле наступнага плана: 1) прычыны выступленняў; 2) формы барацьбы гараджан; 3) час і месцы выступленняў; 4) вынікі. Чым адрозніваліся формы барацьбы мяшчан ад сялянскіх выступленняў?

§ 13. Рэфармацыя і Контррэфармацыя



Што такое Рэфармацыя? Назавіце асноўныя рэфармацыйныя плыні.



Якія асаблівасці мелі Рэфармацыя і Контррэфармацыя на беларускіх землях?

Пачатак рэфармацыйнага руху на беларускіх землях. Першыя прыхільнікі **Рэфармацыі** з'явіліся ў ВКЛ яшчэ ў 1520-я гг. Але найбольшай сілы рэфармацыйны рух дасягнуў у другой палове XVI ст. Верацярпімая палітыка ўлад ВКЛ прываблівала ў краіну тых, хто цярпеў ганенні на радзіме. На беларускія землі сталі масава пераселяцца пратэстанты з Германіі, Шатландыі, Нідэрландаў. Праваслаўныя магнаты бралі пад апеку збеглых з Расійскай дзяржавы вальнадумцаў і прыхільнікаў змен у Праваслаўнай царкве.

Пашырэнне ідэй Рэфармацыі на беларускіх землях аказала вялікае ўздзеянне на ўсе бакі жыцця грамадства. Асабліва на гэты рух паўплывалі канцлер *Мікалай Радзівіл Чорны* і гетман Мікалай Радзівіл

Правообладатель Издательский центр БГУ

Руды. У адрозненне ад краін Заходняй Еўропы, тут асноўнымі прыхільнікамі ідэй Рэфармацыі былі шляхціцы. Рэфармацыя стала для шляхты ВКЛ адным са сродкаў барацьбы за незалежнасць, умацаванне сваёй дзяржавы. У 1550—1570-х гг. большасць радных паноў перайшлі ў пратэстантызм. Яны хацелі не толькі адасобіцца ад каталіцкай Польшчы. Іх прываблівала ідэя адабраць зямельныя ўладанні і багацці Каталіцкага касцёла.



▲ Мікалай Радзівіл Чорны



Мікалай Радзівіл Чорны (1515—1565) — віленскі ваявода і канцлер ВКЛ. Удзельнічаў у правядзенні аграрнай, адміністрацыйнай і судовай рэформаў. Пры яго падтрымцы ў 1563 г. у Берасці быў выдадзены першы пераклад кальвінісцкай «Бібліі» на польскую мову з ілюстрацыямі. Ён апекаваўся не толькі царкоўнымі дзеячамі, але і літаратарамі, музыкантамі.

Асноўныя кірункі Рэфармацыі. Услед за магнатамі праваслаўная і каталіцкая шляхта пачала масава прымаць *кальвінізм* і пераводзіць у сваю веру падданых. У **1553 г.** у Берасці Мікалай Радзівіл Чорны заснаваў першую кальвінісцкую абшчыну (збор) на беларускіх землях. Цэнтрамі кальвінізму сталі Вільня, Берасце, Нясвіж. Кальвінізм у ВКЛ моцна адрозніваўся ад заходнееўрапейскага. Асноўная ўвага надавалася стварэнню рэлігійных абшчын са зборамі, школамі, шпіталямі, друкарнямі, дзе на чале стаяў уласнік маёнтка. Кальвінісцкія прапаведнікі займаліся пашырэннем асветы, перакладам свяшчэнных кніг на мясцовыя мовы. Але штодзённы лад жыцця кальвіністаў фактычна не змяніўся. У адрозненне ад сваіх заходнееўрапейскіх адзінаверцаў, яны не забаранялі смех, забавы, апрананне дарагога адзення.

Назавіце асноўныя ідэі Ж. Кальвіна, карыстаючыся вучэбным дапаможнікам па сусветнай гісторыі.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Кальвінскі збор (цяпер касцёл) у Смаргоні. Пачатак XVII ст.

Лютэранства прымалі пераважна мяшчане замежнага паходжання (немцы) у вялікіх гарадах. У 1560-я гг. у ВКЛ пашырыліся ідэі *антытрынітарыяў* (ад грэч. *anti* — супраць, лац. *trinitas* — тройца). Іх прыхільнікі прызнавалі існаванне толькі адзінага Бога, а не Тройцы, і лічылі Ісуса Хрыста звычайным чалавекам. Яны выступалі супраць смяротнага пакарання, заклікалі да міралюбства. Неўзабаве да іх далучылася нямала пратэстантаў. Абшчыны антытрынітарыяў са школамі, дзе навучаліся не толькі хлопчыкі, але і дзяўчынкі, дзейнічалі ў Іўі, Клецку, Любчы, Новагародку, Нясвіжы. Аднак некаторыя з лідараў гэтай пратэстанцкай плыні *(Якуб з Калінаўкі, Павел з Візны)* пачалі выступаць за адмену прыгоннага права, бо, на іх думку, роўны не мог валодаць роўным, адмаўлялі магчымасць любой дзяржаўнай і вайсковай службы. Такія погляды выклікалі незадавальненне не толькі каталікоў і дзяржаўных асоб, але і іншых пратэстантаў.

У канцы XVI ст. у ВКЛ дзейнічала ўжо каля 150 пратэстанцкіх абшчын. Найбольш яскравымі прадстаўнікамі Рэфармацыі на беларускіх землях акрамя братоў Радзівілаў былі Андрэй Волан, Сымон Будны, Лаўрэнцій Крышкоўскі, ***Васіль Цяпінскі***. Два апошнія шляхціцы на ўласныя

Па карце атласа вызначце, дзе дзейнічала большасць пратэстанцкіх абшчын.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Васіль Цяпінскі. Гравюра XVI ст.

сродкі арганізавалі друкарні, дзе выдавалі кнігі на старабеларускай мове.

Ва ўласным маёнтку каля 1570 г. В. Цяпінскі выдаў на старабеларускай і царкоўнаславянскай мовах «Евангелле». Прадмова кнігі прасякнута любоўю да беларускай мовы, да свайго «зацнага (высакароднага), слаўнага, дасціпнага» народа. Але такія выданні былі хутчэй выключэннем. Большасць пратэстанцкай літаратуры выходзіла на польскай мове.

Падумайце, як выданні на мясцовых мовах спрыялі пашырэнню ідэй Рэфармацыі.



▲ Сымон Будны. Гравюра XVI ст.



Сымон Будны (каля 1530—1593) — прапаведнік, філосаф, асветнік. Ён быў адным з найбольш адукаваных людзей свайго часу. Адзін з першых аўтараў, які пісаў па-старабеларуску, па-польску і на лаціне. У Нясвіжы ў 1562 г. выдаў першую на сучаснай тэрыторыі Беларусі кнігу на старабеларускай мове («для простых людей языка руского») — «Катэхізіс». Быў спачатку прыхільнікам кальвінізму, потым антытрынітарыем. Выступаў супраць смяротнага пакарання.

У выніку распаўсюджання рэфармацыйных ідэй найбольш пацярпела Праваслаўная царква, якая страціла багатых апекуноў. У той жа час Рэфармацыя спрыяла пашырэнню правоў шляхецкага саслоўя, развіццю асветы, кнігадрукавання і дабрачыннасці ў грамадстве. Пратэстанты нават здзейснілі няўдалую спробу стварыць у Вільні першую вышэйшую навучальную ўстанову — акадэмію. Сістэма пратэстанцкай адукацыі, выданні на польскай мове значна паскорылі працэс пашырэння польскай мовы і культуры ў ВКЛ. Рэфармацыя паглыбіла міжнародныя культурныя

Правообладатель Издательский центр БГУ

сувязі жыхароў беларускіх зямель з краінамі Еўропы. Заканадаўча свабода хрысціянскага веравызнання была замацавана Статутамі ВКЛ 1566 і 1588 гг.

Пачатак і праявы Контррэфармацыі. Дзейнасць ордэна езуітаў на беларускіх землях. Хуткае пашырэнне рэфармацыйных ідэй выклікала занепакоенасць Каталіцкага касцёла. Каб спыніць Рэфармацыю і вярнуць сабе страчаныя пазіцыі, Рымскі Папа абвясціў аб пачатку **Контррэфармацыі**. Але Контррэфармацыя ў Рэчы Паспалітай мела сваю адметнасць. На гэтых землях кіраўніцтва Касцёла імкнулася не толькі вярнуць да каталіцкай веры пратэстантаў. Яно жадала таксама распаўсюдзіць каталіцтва сярод праваслаўнага насельніцтва. Моцны ўдар па пратэстантызме і Праваслаўнай царкве нанёс ордэн **езуітаў**.

Выкарыстоўваючы веды па сусветнай гісторыі, назавіце асноўныя кірункі палітыкі Контррэфармацыі.

У ВКЛ манахі-езуіты былі запрошаны віленскім біскупам у *1569 г.* У сваёй дзейнасці яны надавалі вялікае значэнне пропаведзі, перакананню, заахвочванню да пераходу ў каталіцтва. На іх думку, адна з галоўных роляў у справе Контррэфармацыі належала адукацыі і выхаванню моладзі ў каталіцкім духу. Асабліва вылучыўся як таленавіты прапаведнік Пётр Скарга.



Пётр Скарга (1536—1612) меў вялікі ўплыў у грамадстве як спаведнік караля Жыгімонта III. Арганізаваў езуіцкія калегіумы ў Полацку, Рызе, Вільні і выкладаў там. Стаў першым рэктарам Віленскай езуіцкай акадэміі. Асабіста ўгаварыў прыняць каталіцтва кальвіністаў і праваслаўных з княжацкіх і магнацкіх родаў. У сваіх творах распрацаваў асноўныя ўмовы аб'яднання хрысціянскіх цэркваў.



▲ П. Скарга. Партрэт невядомага мастака XVII ст.

Параўнайце выявы дзеячаў Рэфармацыі і Контррэфармацыі, змешчаныя ў параграфе. Ці можна па партрэтах вызначыць характар, інтарэсы ці заняткі асоб?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Значную падтрымку езуіты мелі пры каралеўскім двары. Асабліва спрыяў езуітам іх выхаванец Жыгімонт III. Ён перадаў ім шмат зямель. У гарадах і мястэчках езуіты засноўвалі пачатковыя школы і сярэднія навучальныя ўстановы — *калегіумы* (Вільня, Полацк, Віцебск, Орша, Гародня, Пінск, Нясвіж і інш.). Туды прымалі хлопчыкаў розных саслоўяў і веравызнанняў. Пры калегіумах апрацоўваліся аптэкарскія агароды, дзейнічалі бясплатныя аптэкі і шпіталі. Выцясненне пратэстантаў нярэдка ажыццяўлялася гвалтоўнымі метадамі. Віленскі біскуп Юрый Радзівіл адабраў у пратэстантаў амаль усе друкарні і перадаў іх езуітам. Па яго загадзе ў Вільні спалілі канфіскаваныя ў пратэстанцкіх друкарнях кнігі.



▲ Вынікі Контррэфармацыі

Правообладатель Издательский центр БГУ

З пастановы Віленскай канфедэрацыі 1599 г.

Ужо духоўныя прэсвітары, святары, міністры і прапаведнікі нашы за адданасць сваёй рэлігіі праследуюцца рознымі спосабамі. Іх знаходзяць і на іх нападаюць у іх дамах, іх абражаюць, рабуюць, ссылаюць, выганяюць, пазбаўляюць зямель і маёмасці… Іх хапаюць у гарадах і на адкрытых дарогах Рэчы Паспалітай, іх саджаюць у турмы і неверагодна мучаць, топяць і забіваюць.

Як вы лічыце, ці былі такія дзеянні законнымі? Свой адказ аргументуйце.

Да сярэдзіны XVII ст. Контррэфармацыя перамагла. Каталіцтва набывала статус дзяржаўнай рэлігіі. Усіх хрысціян-некаталікоў у Рэчы Паспалітай пачалі называць **дысідэнтамі** (нязгоднымі). З цягам часу іх сталі абмяжоўваць у палітычных правах, што прывяло да ўзнікнення «дысідэнцкага пытання».

1. З якой мэтай шляхта падтрымала ідэі Рэфармацыі?
2. Назавіце асноўныя кірункі дзейнасці прадстаўнікоў Рэфармацыі на беларускіх землях.
3. Ахарактарызуйце метады, якімі ордэн езуітаў пашыраў каталіцтва на беларускіх землях. Прывядзіце прыклады.
4. Дакажыце, што Контррэфармацыя перамагла ў ВКЛ. Якія з яе вынікаў вы ацэньваеце як станоўчыя, а якія — як адмоўныя?

5*. У 2015 г. Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь выпусціў у абарачэнне памятную манету «Мікалай Радзівіл Чорны». Як вы думаеце, чаму гэтая асоба была выбрана для ўшанавання? Каго б прапанавалі вы? Чаму?

§ 14. Берасцейская царкоўная унія

У якім годзе адбыўся раскол адзінай хрысціянскай царквы? Калі былі зроблены спробы аб'яднання хрысціян?

Якімі былі прычыны і вынікі заключэння царкоўнай уніі?

Падрыхтоўка уніі. Адным з найважнейшых кірункаў Контррэфармацыі на беларускіх землях стала падрыхтоўка царкоўнай уніі. Пытанне аб'яднання Каталіцкага касцёла і Праваслаўнай царквы

Правообладатель Издательский центр БГУ

ў ВКЛ уздымалася вялікімі князямі на працягу некалькіх стагоддзяў. У 1570—1590-я гг. ідэя царкоўнай уніі стала асабліва актуальнай. У яе заключэнні былі зацікаўлены і праваслаўныя, і каталікі, бо паасобку яны не маглі супрацьстаяць рэфармацыйнаму руху. Менавіта ён адбіраў вернікаў і ў адных, і ў другіх.



▲ Мэты Каталіцкага касцёла і Праваслаўнай царквы пры заключэнні уніі

Берасцейскі царкоўны сабор 1596 г.



▲ Медаль Папы Рымскага ў гонар заключэння уніі. 1596 г.

Асноўныя прынцыпы аб'яднання дзвюх цэркваў сфармуляваў Пётр Скарга. Ён лічыў, што рэлігійны саюз дазволіць ім разам весці барацьбу супраць пратэстантаў. Унія магла пераадолець варожасць паміж каталікамі і праваслаўнымі. Скарга спадзяваўся, што яна ўмацуе адзінства Рэчы Паспалітай, паспрыяе развіццю адукацыі.

У канцы 1594 г. праваслаўныя епіскапы Іпацій Пацей і Кірыла Тарлецкі патаемна склалі дэкларацыю аб уніі. Іх праект падтрымаў кароль Жыгімонт III і амаль усё кіраўніцтва Праваслаўнай царквы. У 1595 г. Папа Рымскі ўрачыста абвясціў пра заключэнне уніі. Для яе зацвярджэння ў Рэчы Паспалітай у кастрычніку **1596 г.** склікалі **Берасцейскі царкоўны сабор**.

Як вы лічыце, чаму Папа Рымскі падтрымаў падпісанне уніі?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Нягледзячы на спрэчкі і нявырашаныя супярэчнасці, акт уніі быў падпісаны. Праваслаўная царква ў Рэчы Паспалітай афіцыйна прыпыніла існаванне. Яе маёмасць і прыходы пераходзілі да **ўніяцкай царквы**.



▲ Царква Св. Мікалая ў Берасці, дзе праходзіў сабор. Макет-рэканструкцыя

Асноўныя ўмовы аб'яднання

- Вяршэнства Папы Рымскага ў справах веры
- Прыняцце ўніятамі асноў каталіцкага веравучэння і новага календара
- Захаванне ўніятамі праваслаўных царкоўных абрадаў, святаў, мовы
- Прызначэнне на царкоўныя пасады толькі «рускіх» людзей
- Забарона пераводзіць уніятаў у каталіцтва
- Атрыманне ўніяцкімі епіскапамі месцаў у сенаце

▲ Асноўныя ўмовы Берасцейскай уніі

? *Ці адчулі розніцу простыя людзі ад пераходу ва ўніяцтва? Абгрунтуйце свой адказ.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

На працягу стагоддзяў у календары назапашвалася хібнасць — адны суткі за 128 гадоў. Таму ў кастрычніку 1582 г. Папа Грыгорый XIII увёў новы каляндар, амаль адразу прыняты ў Рэчы Паспалітай Стафанам Баторыем. Злічэнне перасунулі на 10 сутак наперад, каб каляндар больш адпавядаў руху Сонца. На сённяшні дзень розніца паміж старым і новым календарамі складае ўжо 13 дзён. Праваслаўная царква да сённяшняга дня адмаўляецца прымаць «рымскі» каляндар.

З умовамі уніі не пагадзіліся царкоўныя *праваслаўныя брацтвы*. Іх пачалі ствараць у 80-х гг. XVI ст. багатыя мяшчане і шляхта ў Вільні, Берасці, Магілёве. Братчыкі займаліся не толькі дабрачыннасцю. Яны сталі ўмешвацца ў царкоўнае жыццё, спрабавалі ўплываць на прызначэнне святароў.



Петрапаўлаўская брацкая царква ў Менску. Першая палова XVII ст.

З Баркулабаўскага летапісу

У той самы час пачалі ў Львове, Берасці і Вільні ў школах вучыць і кнігі друкаваць, нейкае брацтва арганізоўваць і тым самым закон і веру ўмацоўваць.

На падставе гістарычнай крыніцы назавіце мэты стварэння праваслаўных брацтваў.

Правообладатель Издательский центр БГУ

У пачатку XVII ст. для абароны правоў праваслаўных і супрацьстаяння ўніятам сталі актыўна засноўвацца новыя брацтвы і ў іншых гарадах (Менск, Полацк, Пінск, Віцебск). Брацтвы будавалі цэрквы, стваралі пры іх манастыры, школы, шпіталі, друкарні.

Пашырэнне ўніяцтва. Прыхільнікі уніі карысталіся падтрымкай каралеўскай улады. Яны спадзяваліся, што царкоўны саюз не сустрэне супраціўлення. Лічылася дастатковым, каб новай веры і Папе Рымскаму прысягнулі епіскапы і святары. Мірнаму развіццю падзей перашкодзілі гвалтоўныя метады, якія сталі выкарыстоўваць уніяцкія епіскапы. Праваслаўных прыхаджан і святароў пачалі прымушаць прымаць унію. Асабліва жорсткімі ўчынкамі вылучаўся полацкі архіепіскап Іасафат Кунцэвіч.

Са скаргі полацкай шляхты сойму

Той жа епіскап полацкі пяць гадоў трымае ў Оршы і Магілёве цэрквы запячатаныя. У Полацку і Віцебску няма ні царквы, ні дома, дзе дазволена ў горадзе набажэнства…

Праваслаўныя скардзіліся не толькі на тое, што ў іх адбіралі цэрквы. Полацкі архіепіскап забараняў вянчаць, хрысціць дзяцей і адпяваць памерлых згодна з праваслаўным абрадам.

Патлумачце прычыны такой жорсткасці. Як полацкі архіепіскап спрабаваў прымусіць праваслаўных вернікаў прыняць унію?

Гвалтоўныя метады кіраўнікоў уніяцкай царквы выклікалі абурэнне праваслаўных вернікаў, асабліва ў гарадах. Да незадаволеных далучылася частка праваслаўных святароў, мяшчан і шляхты, якія не прынялі царкоўнага саюзу. Замест епіскапаў, што падпісалі унію, праваслаўныя выбралі новых. Адным з іх стаў Мялецій Сматрыцкі. Яны звярнуліся да адданых праваслаўю вернікаў. Епіскапы заклікалі не пускаць уніятаў у гарады, храмы, перашкаджаць правядзенню імі богаслужэнняў.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Мялецій Сматрыцкі



Мялецій Сматрыцкі (1577—1633) — рэлігійны дзеяч, філосаф, пісьменнік. Атрымаў адукацыю ў праваслаўнай Астрожскай акадэміі, езуіцкай акадэміі ў Вільні, у пратэстанцкіх універсітэтах Германіі. Актыўны абаронца праваслаўя, у 1620 г. ён стаў архіепіскапам полацкім. Аўтар палемічных (прысвечаных рэлігійным спрэчкам) твораў, а таксама падручнікаў. Яго «Граматыка славенская» (1619) выкарыстоўвалася ў школах на працягу двух стагоддзяў. У канцы жыцця ён расчараваўся ў праваслаўі і прыняў уніяцтва.

Актыўны прыхільнік уніі Леў Сапега папярэджваў І. Кунцэвіча, што яго дзеянні прыносяць дзяржаве толькі шкоду: «Вы Вашымі неразважнымі гвалтамі падбухторылі і, скажу, прымусілі народ рускі [праваслаўных] да адпору і зламання ўчыненай яго каралеўскай міласцю прысягі». У выніку па гарадах Усходняй Беларусі ў пачатку 1620-х гг. пракацілася хваля антыўніяцкіх выступленняў.

62—63

Найбольш напружаны характар барацьба супраць уніі набыла ў Віцебску. У **1623 г.** натоўп мяшчан разрабаваў палац І. Кунцэвіча і ўніяцкія цэрквы. Самога архіепіскапа забілі, а яго цела кінулі ў Заходнюю Дзвіну. За гэта Жыгімонт III жорстка пакараў горад. Віцебск быў пазбаўлены магдэбургскага права, ратушу разбурылі. З усіх праваслаўных храмаў знялі званы, гораду прызначылі вялікі штраф. Кіраўнікі паўстання былі пакараны смерцю. Астатніх гараджан прызналі злачынцамі.

З мэтай умацавання пазіцый уніяцтва ў пачатку XVII ст. быў створаны манаскі ордэн *базыльян*. Яго арганізавалі на ўзор ордэна езуітаў. Асноўнай задачай ордэна стала падрыхтоўка ўніяцкіх святароў і стварэнне сеткі навучальных устаноў у процівагу брацкім школам. Базыльянам было дазволена адкрываць навучальныя ўстановы з выкладаннем на старабеларускай і польскай мовах. Ордэн актыўна займаўся кнігавыдавецкай дзейнасцю.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Становішча праваслаўных у краіне ўвесь час пагаршалася. Яны мелі ўсё меншы палітычны ўплыў у дзяржаве.

Гады	Колькасць у сенаце Рэчы Паспалітай свецкіх сенатараў ад ВКЛ (чалавек)		
	каталікі	пратэстанты	праваслаўныя
1572	3 (13,5%)	16 (73%)	3 (13,5%)
1632	25 (100%) з уніятамі	—	—
1648	17 (71%) з уніятамі	3 (12%)	4 (17%)

? *Пра што сведчаць звесткі табліцы? Якая канфесія і калі была найбольш уплывовай у ВКЛ і чаму?*

Каб зменшыць напружанне ў грамадстве, у 1633 г. Уладзіслаў IV абвясціў пра аднаўленне праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай. Былі нанова створаны 4 епархіі на чале з кіеўскім мітрапалітам. Адзінай праваслаўнай епархіяй у межах ВКЛ аж да канца XVIII ст. стала Магілёўская (Беларуская).

Такім чынам, падпісанне Берасцейскай царкоўнай уніі не вырашала ўсіх пастаўленых задач. У краіне не ўсталяваўся рэлігійны мір. Замест аб'яднання дзвюх канфесій на землях Рэчы Паспалітай з'явілася яшчэ адна. Уніяцкія епіскапы не атрымалі месца ў сенаце. Рэлігійнае супрацьстаянне ў першай палове XVII ст. толькі ўзмацнілася. Але ў далейшым уніяцкая царква ў пэўнай ступені паспрыяла захаванню моўна-культурных традыцый беларускага народа.

1. Дайце характарыстыку царкоўнай уніі паводле плана: 1) прычыны заключэння уніі; 2) мэты бакоў; 3) умовы падпісання; 4) вынікі.
2. Якія падзеі паспрыялі заключэнню царкоўнай уніі 1596 г.?
3. Чаму праект царкоўнай уніі падтрымалі Жыгімонт III і амаль усё кіраўніцтва праваслаўнай царквы?
4. Якія асноўныя мэты мелі праваслаўныя брацтвы?
5. Назавіце асноўныя кірункі дзейнасці ордэна базыльян.
6. Якімі метадамі пашыралася ўніяцтва на беларускіх землях? *Чаму, на вашу думку, Папа Рымскі абвясціў І. Кунцэвіча святым?

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 15. Культура

Хто і дзе выдаў першую беларускамоўную кнігу на тэрыторыі сучаснай Беларусі?

Чаму гэтую эпоху называюць «залатым векам» беларускай культуры?

Пачатае Скарынам. Пашырэнне ідэй Адраджэння, Рэфармацыі было цесна звязана з неабходнасцю чытання і разумення Святога Пісання. Асвета і кнігадрукаванне сталі галоўнымі сродкамі барацьбы за ўплыў у грамадстве. Першая на сучаснай тэрыторыі Беларусі друкарня пачала дзейнічаць у *1550*-х *гг.* у Берасці пад апекаю Мікалая Радзівіла Чорнага і выпусціла больш за 40 выданняў. Пераважна яны выходзілі на польскай мове і былі разлічаны на паланізаваную шляхту. Пратэстанцкія друкарні былі заснаваны і ў іншых гарадах і мястэчках.

Пералічыце месцы, дзе дзейнічалі пратэстанцкія друкарні. Якія іх выданні вы ведаеце?

Праваслаўныя і брацкія друкары пераважна ажыццяўлялі выпуск неабходнай для навучання літаратуры. У 1569 г. у Заблудаве Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец выдалі «Евангелле вучыцельнае».


БУКВАРЪ
Сирѣчъ,
НАЧАЛО УЧЕНІЯ
Дѣтемъ начинающимъ чтенію
изыкати.
въ Кутеинѣ
Изобразися.
въ Тупографіи
СПИРИДОНА
СОБОЛЯ.
Року, ҂ахла.

◀ Тытульны ліст «Буквара» С. Собаля

Знайдзіце адрозненні тагачаснага алфавіта ад сучаснага.

Правообладатель Издательский центр БГУ

У сярэдзіне 1570-х гг. П. Мсціславец заснаваў у Вільні на сродкі братоў купцоў Кузьмы і Лукі Мамонічаў знакамітую друкарню. Менавіта ў ёй быў выдадзены Статут ВКЛ 1588 г., друкаваліся пастановы соймаў і іншыя заканадаўчыя акты. У 1619 г. у Еўі (цяпер тэрыторыя Літвы) у брацкай друкарні ўпершыню выйшла ў свет «Граматыка славенская» Мялеція Сматрыцкага. У 1631 г. у Куцейне выдаў свой «Буквар» Спірыдон Собаль.

У гэты перыяд назіраўся сапраўдны росквіт літаратуры. Працягвала развівацца летапісанне, у прыватнасці, быў створаны знакаміты Баркулабаўскі летапіс. Адметнай рысай таго часу стала пашырэнне грамадска-палітычнай (публіцыстычнай) і палемічнай (рэлігійныя вострыя спрэчкі) літаратуры ў выглядзе прамоў, разважанняў. Найбольш вядомым узорам публіцыстычнай літаратуры пачатку XVII ст. стаў «Трэнас» М. Сматрыцкага. Аўтар апісаў напад на праваслаўныя цэрквы і манастыры ў Вільні, арганізаваны ўніяцкім мітрапалітам Іпаціем Пацеем у 1609 г.

З твора М. Сматрыцкага «Трэнас» 1610 г.

Гора мне беднай, гора нешчаслівай! Ах, з усіх бакоў з маёнткаў абрабаванай!.. Бяда мне, абцяжаранай невымоўнымі цяжкасцямі! Бяда ў гарадах і вёсках, бяда ў палях і дубровах, бяда ў гарах і прорвах зямлі. Нідзе няма месца спакойнага і прытулку бяспечнага… О біскупы, біскупы! О сыны, што занядбалі бацьку і маці!.. Дакуль вы будзеце спаць непрабудным сном?

Чаму падзеі ў Вільні былі апісаны ў форме плачу? Ад імя каго выступае аўтар?

58—59

Развіваліся новыя жанры літаратуры. Людзі пачалі запісваць падзеі, сведкамі якіх яны былі, для сваіх нашчадкаў. Такія дзённікі-ўспаміны пакінулі Фёдар Еўлашэўскі, Ян Цадроўскі. З'явіліся апісанні падарожжаў. Найбольш папулярным у сучаснікаў стаў расповед пра паломніцтва *Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі* ў Святую зямлю. Ён перавыдаваўся каля 20 разоў на розных мовах. У гэты час Андрэй Рымша і Ян Радван стварылі найлепшыя ўзоры сваёй рыцарскай (гераічнай) і панегірычнай паэзіі на лацінскай мове.

67—69

Правообладатель Издательский центр БГУ

Тагачасная літаратура беларускіх зямель была шматмоўнай. Багата твораў у той час перакладалася і на старабеларускую мову. Адукаваныя жыхары ВКЛ чыталі не толькі тэксты Святога Пісання і рэлігійную літаратуру. Сталі папулярнымі і свецкія творы. Чытачы пазнаёміліся з падзеямі Траянскай вайны, жыццём Аляксандра Македонскага, раманамі пра Трыстана і Ізольду.

Росквіт літаратуры прывёў да пашырэння кнігадрукавання, развіцця кніжнай мініяцюры і гравюры. Разуменне каштоўнасці друкаванага слова, даступнасць кніг спрыялі стварэнню прыватных бібліятэк.

Станаўленне сістэмы адукацыі. Віленская езуіцкая акадэмія. У выніку рэлігійных пераўтварэнняў стала актыўна развівацца школьная адукацыя. У другой палове XVI ст. пачалі дзейнічаць сярэднія навучальныя ўстановы — гімназіі і калегіумы. Яны складаліся з 5 класаў. Прычым у старэйшых класах навучаліся па два гады. У школах усіх канфесій асноўная ўвага надавалася рэлігійнаму выхаванню моладзі. Малітвы і наведванне царкоўных службаў былі абавязковыя. Праграмы навучання езуітаў лічыліся аднымі з найлепшых і не пераглядаліся аж да сярэдзіны XVIII ст. У езуіцкіх калегіумах вучні атрымлівалі грунтоўныя гуманітарныя



▲ Узроўні навучання ў ВКЛ

? *У чым адрозненне сістэмы навучання ў ВКЛ ад сучаснай?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

і матэматычныя веды. Там маглі бясплатна навучацца прадстаўнікі ўсіх веравызнанняў. Высокі ўзровень адукацыі і перадавая на той час методыка выкладання прынеслі вядомасць езуіцкім школам.

У *1579 г.* пры падтрымцы Стафана Баторыя віленскі калегіум быў пераўтвораны ў Віленскую акадэмію. Яна стала першай вышэйшай навучальнай установай у ВКЛ. Акадэмія спачатку мела два факультэты: філасофскі і тэалагічны. У 1640-я гг. да іх дадаліся юрыдычны і медыцынскі. Віленскія езуіты валодалі самай вялікай бібліятэкай у ВКЛ. Сярод выкладчыкаў Віленскай акадэміі было шмат знакамітых тэолагаў, філосафаў, паэтаў.

Развіццё сістэмы адукацыі паспрыяла станаўленню гуманітарных навук. Пашыраліся веды пра ВКЛ і беларускія землі за межамі дзяржавы. Гэтаму спрыялі адукацыйныя падарожжы маладых шляхціцаў па краінах Заходняй Еўропы, напісанне твораў па гісторыі краіны. Сярод іх варта адзначыць хронікі Мацея Стрыйкоўскага і Аляксандра Гваньіні, першую дакладную карту ВКЛ Тамаша Макоўскага (1603).



▲ Галоўны двор Віленскай акадэміі. Малюнак XIX ст.



▲ Тытульны ліст «Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі» М. Стрыйкоўскага. 1582 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Пачатак барока. Мастацтва і архітэктура. Інтэнсіўныя кантакты з суседзямі, дзейнасць каталіцкіх манаскіх ордэнаў спрыялі пранікненню і засваенню ўзораў позняга Рэнесансу і *барока*. Барока стала ўвасабленнем перамогі ідэй Контррэфармацыі. Яго адметнымі рысамі з'яўляюцца ўрачыстасць, ускладненасць формаў, параднасць, пышны дэкор. Першым на беларускіх землях помнікам, створаным у гэтым стылі, стаў касцёл Божага Цела ў Нясвіжы. Яго ўзвёў у 1587—1593 гг. архітэктар-езуіт *Ян Марыя Бернардоні* як сімвал магутнасці Каталіцкага касцёла.

З урокаў сусветнай гісторыі ўспомніце характэрныя рысы архітэктуры Рэнесансу і барока.

З канца XVI — пачатку XVII ст. магнаты і шляхта пачалі надаваць архітэктуры вялікае значэнне. Прыгожыя будынкі дапамагалі пад-



▲ Касцёл Божага Цела ў Нясвіжы. Канец XVI ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Мірскі замак. Палац. Канец XVI ст.

крэсліць уплывовасць іх родаў. Побач з драўлянымі зáмкамі сталі з'яўляцца мураваныя палацы, акружаныя садамі і абароненыя валамі. Яны спалучалі элементы розных заходнееўрапейскіх стыляў: готыкі, позняга Рэнесансу і барока з мясцовымі будаўнічымі традыцыямі. Найбольш яскрава гэта выявілася ў палацава-паркавым комплексе ў Нясвіжы, у зáмках у Міры, Гальшанах, Смальянах і Любчы.

На мяжы XVI—XVII стст. у асноўных рысах сфарміравалася беларуская школа іканапісу. Для яе характэрны дэкаратыўны, часта пазалочаны фон. Мастакі спалучалі заходнееўрапейскія і мясцовыя мастацкія традыцыі. Асобныя персанажы на абразах сталі маляваццa ў свецкім адзенні. Шэдэўрам з'яўляецца абраз «Нараджэнне Багародзіцы».

Правообладатель Издательский центр БГУ



◀ Нараджэнне Багародзіцы. Мастак *Пётр Яўсеевіч з Галынца*. 1649 г.

? *Звярніце ўвагу на адзенне людзей на абразе. Якія элементы беларускага народнага строю вы бачыце на выяве?*

Сярод шляхты стала модным збіраць галерэі партрэтаў славутых продкаў і дзяржаўных дзеячаў. Гэтыя партрэты атрымалі назву сармацкіх. Самыя вялікія зборы былі ў Радзівілаў у Нясвіжы, Вільні, Слуцку, у Сапегаў у Кодані (цяпер тэрыторыя Польшчы). Палацы, шляхецкія сядзібы і мяшчанскія дамы ўпрыгожвалі вітражы, габелены, зброя і посуд.



◀ Крыштаф Весялоўскі. Партрэт невядомага мастака. Пачатак XVII ст.

? *Як мастак паказаў прыналежнасць персанажа да знатнага роду? Чым яго адзенне адрозніваецца ад вопраткі людзей з абраза Пятра Яўсеевіча з Галынца?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Другая палова XVI — першая палова XVII ст. сталі часам росквіту ўсіх галін беларускай культуры. У літаратуры з'явіліся новыя жанры і творы «для простага люду». Падзеі і працэсы ў рэлігійным жыцці дзяржавы далі штуршок да стварэння сеткі навучальных устаноў, развіцця літаратуры і кнігадрукавання. На беларускіх землях пашыралася мураванае дойлідства. У помніках архітэктуры і мастацтва модныя павевы заходнееўрапейскіх стыляў спалучаліся з мясцовымі народнымі традыцыямі. Магутныя сцены і вежы набліжалі храмы да крэпасцяў, але фасады з вежамі-званіцамі вызначаліся ламанасцю, хвалістасцю ліній. Унутранае ўбранне ўражвала багаццем аздаблення алтароў і сцен. У выніку ўзнік свой, мясцовы стыль — беларускае барока, адрозны ад барока іншых краін Еўропы.

1. Вызначце адметныя рысы развіцця літаратуры і кнігадрукавання на землях ВКЛ у другой палове XVI — першай палове XVII ст.
2. Пры дапамозе схемы на с. 102 і тэксту параграфа ахарактарызуйце сістэму навучання ў сярэдзіне XVI — першай палове XVII ст.
3. Назавіце асноўныя рысы барока. Што, на ваш погляд, адрознівае будынкі ў стылі барока, Рэнесансу і готыкі? Для адказу скарыстайцеся ілюстрацыямі § 6.
4. Якая сувязь існуе паміж ідэямі Контррэфармацыі і стылем барока?

5*. З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі падрыхтуйце паведамленне пра аднаго з дзеячаў культуры ці помнік другой паловы XVI — першай паловы XVII ст. Ці ёсць у вашай мясцовасці будынкі гэтага перыяду? Падрыхтуйце прэзентацыю (віртуальную выставу) па тэме параграфа.

§ 16. Этнічныя працэсы

Якія народы складалі аснову насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага?

Калі ўзнікла беларуская народнасць і што гэтаму паспрыяла? Як называлі сябе беларусы ў той час?

Фарміраванне беларускай народнасці. Эпоха Вялікага Княства Літоўскага пакінула глыбокі след у гісторыі Беларусі. Але, напэўна, самым важным яе вынікам было тое, што менавіта ў гэты

Правообладатель Издательский центр БГУ

час склаўся самастойны беларускі этнас. Працэс яго фарміравання бярэ пачатак у старажытных часах. Аднак асобная *беларуская народнасць* склалася толькі ў XIV—XVI стст.



▲ Пагоня — дзяржаўны герб Вялікага Княства Літоўскага і большасці яго зямель

? *Які герб мае сёння ваш горад (пасёлак, вёска)? *Якую выяву вы самі размясцілі б на гербе свайго населенага пункта? Свой адказ растлумачце.*

? *Якія народы належаць да ўсходнеславянскіх?*

Да ўтварэння беларускай народнасці прывёў цэлы шэраг спрыяльных фактараў. Адным з галоўных было тое, што ўсе беларускія землі ў гэты час знаходзіліся ў складзе адной дзяржавы. У выніку пастаянных кантактаў жыхароў розных частак краіны станавіліся больш падобнымі культура і звычаі. Яшчэ адным аб'яднальным момантам былі гандлёва-эканамічныя сувязі. Збліжалі таксама служба ў адным войску, адзіная палітычная сістэма і сістэма ўлады, у тым ліку агульны манарх. Жыхары розных абласцей краіны прызнавалі сваёй агульнадзяржаўную сімволіку. А насельнікі адной зямлі ці горада мелі аднолькавы герб.

Усё гэта адрознівала жыхароў беларускіх зямель ад жыхароў замежных краін. Але было і тое, што заставалася ў беларусаў падобным з суседнімі народамі. Напрыклад, з іншымі ўсходнімі славянамі беларусаў па-ранейшаму збліжалі праваслаўная вера і падабенства моў.

Тым не менш пры ўсіх супольных рысах, якія аб'ядноўвалі людзей у народнасць, унутры яе захоўваўся падзел. Адной з самых значных перашкод на шляху фарміравання народнасці была іерархія пластоў грамадства. Прадстаўнікі прывілеяваных саслоўяў лічылі, што яны больш высокага паходжання і лепшыя за іншых. Асабліва гэта было ўласціва шляхціцам. Яны нават сталі выступаць з ідэяй, што паходзяць

Правообладатель Издательский центр БГУ

ад асобнага народа — старажытных сарматаў. Узнікла цэлая адмысловая сістэма поглядаў шляхецкага саслоўя — *сарматызм*.

Ён стаў асаблівасцю шляхецкай культуры ўсёй Рэчы Паспалітай. Яго ідэі зарадзіліся ў Польшчы, але ў канцы XVI — пачатку XVII ст. пачалі пашырацца і на землях Вялікага Княства Літоўскага. «Шляхціц-сармат» — гэта патрыёт сваёй Айчыны, абаронца свабод (у першую чаргу шляхецкіх вольнасцяў), каталіцкай веры. Ён — узор шчырасці, гасціннасці, годнасці. Ідэалы сарматызму былі блізкія шляхце ВКЛ. Гэта знайшло адлюстраванне ў самых розных сферах жыцця, у тым ліку ў паўсядзённым жыцці і мастацтве.



▲ Сармацкія ўрачыстасці XVII ст.

? *На фоне багатага палаца і парку, упрыгожанага фантанамі і статуямі, адбываецца баляванне. Гаспадар нічога не шкадуе для дарагіх гасцей. За адным сталом сабраліся і магнаты, і шляхціцы. Слугі ледзьве паспяваюць прыносіць ежу і напоі. Слых радуюць музыка і спевы. Як вы думаеце, якія рысы «сармацкага» ладу жыцця адлюстраваны на карціне?*

З цягам часу ўсё больш мясцовых магнатаў і шляхціцаў выкарыстоўвалі ў штодзённым жыцці польскую мову і засвойвалі польскія традыцыі. Але, нягледзячы на гэта, яны заставаліся патрыётамі ВКЛ і заўсёды адрознівалі сябе ад польскай шляхты.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Гравюра пачатку XVI ст. Справа паказаны русіны

Формы этнічнай і мясцовай самасвядомасці. Самай важнай адзнакай складвання таго ці іншага народа з'яўляецца этнічная (нацыянальная) самасвядомасць. Іначай кажучы, чалавек належыць да таго народа, да якога ён сам сябе прылічвае. У XIV—XVI стст. большая частка жыхароў сучаснай Беларусі называла сябе «русь», «русіны». Толькі на паўночным захадзе, дзе пражывала нямала балтаў, былі пашыраны таксама саманазвы «літва», «літвін». Але па-за межамі Вялікага Княства Літоўскага ўсіх яго жыхароў нярэдка называлі літвінамі. Гэта было звязана з тым, што слова «Літоўскае» стаяла на першым месцы ў назве дзяржавы.

Падумайце, якія мясцовыя назвы маглі выкарыстоўваць жыхары вашага населенага пункта. Ці існуюць такія найменні ў наш час?

Поруч з этнічнымі існавалі таксама іншыя саманазвы жыхароў. Напрыклад, былі пашыраны найменні, звязаныя з той мясцовасцю, дзе жыў чалавек. Звычайна мясцовыя саманазвы паходзілі ад галоўнага горада той ці іншай зямлі ці раёна — напрыклад, «палачанін», «случак», «пінянін» і многія іншыя.

Назва «Белая Русь». Тэрмін «Белая Русь», ад якога паходзіць назва нашай краіны, узнік яшчэ ў Сярэднявеччы. Але для абазначэння сучаснай тэрыторыі Беларусі ён пачаў выкарыстоўвацца толькі ў другой палове XVI ст. Прычым тады ён ужываўся ў дачыненні не ўсёй тэрыторыі Беларусі, а толькі яе часткі — Падзвіння. Крыху пазней Белай Руссю сталі называць таксама землі Верхняга Падняпроўя.

Якія версіі паходжання назвы «Белая Русь» вы ведаеце?

У першай палове XVII ст. ураджэнцаў паўночна-ўсходніх беларускіх зямель у Маскве ўжо часта называлі беларусамі ці беларусцамі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Першым, хто назваў сябе беларусам, быў паэт, ураджэнец Полацкай зямлі Саламон Рысінскі (каля 1560—1625). Упершыню ён выступае ў дакументах як беларус пад 1586 г. У перапісцы з замежнымі сябрамі паэт таксама называў сваю родную краіну Беларуссю.

**Складзіце ліст да замежнага сябра, у якім напішыце пра сваю краіну.*

Старабеларуская мова. Для гісторыі любога народа найважнейшае значэнне мае мова. Мова — гэта тое, што адрознівае адзін народ ад другога, стварае яго адметнае аблічча. У беларускай народнасці таксама была свая мова. Гістарычныя дакументы называюць яе рускай. Гэтаксама называліся ў той час і мовы, на якіх размаўлялі продкі сучасных расіян і ўкраінцаў. Але, нягледзячы на агульную назву, гаворкі гэтых трох народаў ужо адрозніваліся паміж сабой. Таму мову, на якой размаўлялі беларусы ў XIV—XVI стст., прынята называць старабеларускай.

Старабеларуская мова першынствавала сярод моў Вялікага Княства Літоўскага. На ёй складаліся найважнейшыя афіцыйныя дакументы, у тым ліку Статуты ВКЛ і велікакняжацкія прывілеі. На ёй працавала дзяржаўная канцылярыя. Ёю карысталіся суды ўсіх узроўняў. Яна гучала ў праваслаўных і ва ўніяцкіх цэрквах, у каталіцкіх касцёлах і пратэстанцкіх зборах. На гэтую мову з цягам часу перайшлі і прадстаўнікі іншых народаў, якія жылі на беларускіх землях, — напрыклад, татары.

Старабеларуская мова дасягнула высокага ўзроўню развіцця. Яна мела вельмі багаты і разнастайны запас слоў, якія датычыліся самых розных сфер жыцця. Гэты запас пастаянна папаўняўся, у тым ліку за кошт іншамоўных запазычанняў. Больш за ўсё слоў запазычвалася з польскай, нямецкай і лацінскай моў. Становішча старабеларускай мовы як афіцыйнай мовы Вялікага Княства Літоўскага замацоўвалася і ў найважнейшых законах.



▲ Старонка кнігі «Хамаіл». Старабеларуская мова, перададзеная арабскім пісьмом

Правообладатель Издательский центр БГУ

Са Статута ВКЛ 1588 г.

А пісар земскі павінен па-руску, літарамі і словамі рускімі ўсе лісты, выпіскі і позвы пісаць, а не іншай мовай і словамі.

Як вы думаеце, якая мова названа тут рускай і чаму?

Эпоха XIV—XVI стст. стала адной з самых важных у этнічнай гісторыі Беларусі. Менавіта ў той час склалася беларуская народнасць. Гэта стала першым этапам у фарміраванні асобнага беларускага народа. На грунце народнасці ў далейшым сфарміравалася беларуская нацыя.

1. Назавіце прычыны, якія паспрыялі з'яўленню беларускай народнасці.
2. Пералічыце этнічныя саманазвы, якія выкарыстоўвалі жыхары беларускіх зямель у XIV—XVI стст.
3. Калі і за якімі беларускімі землямі ўпершыню замацавалася назва «Белая Русь»?
4. Вызначце, якую ролю адыгрывала ў жыцці насельніцтва ВКЛ старабеларуская мова. Пацвердзіце свой адказ 2—3 сказамі з параграфа.
5. Як вы думаеце, чым этнічная сітуацыя XIV—XVI стст. на беларускіх землях адрознівалася ад сучаснай?

6*. Складзіце прамову шляхціца ВКЛ на сойме, у якой ён распавядае пра сваю этнічную прыналежнасць.

Падагульненне да II раздзела

I. Адкажыце на пытанні пры дапамозе картаў атласа, картасхем і тэксту вучэбнага дапаможніка.

1. Як і чаму змянілася тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI ст.?

2. Дзе адбыліся асноўныя бітвы войнаў другой паловы XVI — першай паловы XVII ст.?

3. Якія тэрытарыяльныя змены Рэчы Паспалітай адбыліся ў выніку ваенных канфліктаў другой паловы XVI — першай паловы XVII ст.?

Правообладатель Издательский центр БГУ

4. Якія гарады былі буйны́мі гандлёва-рамеснымі цэнтрамі ў другой палове XVI — першай палове XVII ст.? Якую ролю яны адыгрывалі ў эканамічным развіцці беларускіх зямель?

5. Жыхары якіх гарадоў і чаму ў пачатку XVII ст. выступалі супраць улад?

6. Дзе і пры чыёй падтрымцы ўзнікла першая кальвінісцкая абшчына на беларускіх землях?

7. У якім горадзе была заключана царкоўная унія?

8. Дзе адбылося самае жорсткае выступленне супраць царкоўнай уніі? Як склаўся лёс жыхароў гэтага горада пасля задушэння паўстання?

9. У якім горадзе Беларусі быў узведзены першы будынак у стылі барока?

II. Успомніце, якія падзеі адбыліся ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у сярэдзіне XVI — першай палове XVII ст. Складзіце 2—3 храналагічныя задачы (напрыклад, колькі гадоў прайшло ад пачатку Лівонскай вайны да падпісання Люблінскай уніі). Прапануйце задачы сваім аднакласнікам. Выкарыстайце тэкст параграфа і храналагічную табліцу ў канцы вучэбнага дапаможніка.



III. Размясціце гістарычныя падзеі і з'явы сярэдзіны XVI — першай паловы XVII ст. па слупках: 1) знешняя палітыка; 2) унутрыпалітычнае развіццё; 3) эканамічнае развіццё; 4) рэлігійныя змены; 5) культурнае развіццё. Растлумачце свой адказ.

IV. Складзіце спіс самых знакамітых, на ваш погляд, дзеячаў Вялікага Княства Літоўскага сярэдзіны XVI — першай паловы XVII ст. Калі атрымаецца, знайдзіце партрэты гэтых асоб. Прапануйце вынікі сваёй працы аднакласнікам. Абгрунтуйце свой выбар гістарычных асоб характарыстыкамі іх дзейнасці, карыстаючыся вучэбным дапаможнікам.

V. Падрыхтуйце апавяданне (ці прэзентацыю) па наступных пытаннях (на выбар): 1) утварэнне і палітычнае развіццё Рэчы Паспалітай; 2) уплыў Рэфармацыі і Контррэфармацыі на развіццё беларускіх зямель; 3) пашырэнне ўніяцтва на беларускіх землях; 4) правядзенне

Правообладатель Издательский центр БГУ

валочнай памеры 1557 г.; 5) прыняцце Статута 1588 г. і змены, выкліканыя ім; 6) з'яўленне і дзейнасць ордэна езуітаў у ВКЛ; 7) пранікненне і пашырэнне ідэй Адраджэння на беларускіх землях.

VI. Ахарактарызуйце пры дапамозе тэксту параграфаў: 1) станоўчыя і адмоўныя наступствы Люблінскай уніі для беларускіх зямель; 2) правы і паўнамоцтвы вялікага князя літоўскага ў XV—XVI стст. і манархаў у Рэчы Паспалітай; 3) становішча розных катэгорый сялян; 4) становішча Праваслаўнай царквы і Каталіцкага касцёла перад Берасцейскай уніяй і пасля яе падпісання; 5) уплыў Рэфармацыі і Контррэфармацыі на палітыку і культуру; 6) дзейнасць праваслаўных брацтваў, пратэстанцкіх абшчын, езуітаў; 7) становішча сельскай гаспадаркі да валочнай памеры і пасля яе.

VII. Складзіце схему «Характэрныя рысы рэлігійнага жыцця ў Вялікім Княстве Літоўскім у сярэдзіне XVI — першай палове XVII ст.».

VIII. Працягніце складаць табліцу «Палітыка кіраўнікоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XVI—XVIII стст.».

Манарх	Гады кіравання	Падзеі ўнутранай палітыкі	Падзеі знешняй палітыкі	Эканамічныя пераўтварэнні	Культурныя змены

IX. Прывядзіце не менш за пяць доказаў таго, што перыяд другой паловы XVI ст. магчыма назваць «залатым векам» беларускай культуры.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Раздзел III

Беларускія землі ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст.



У другой палове XVII — пачатку XVIII ст. Рэч Паспалітая была ахоплена чарадой працяглых войнаў і ўнутраных узброеных канфліктаў. Асабліва цяжкім быў перыяд з 1648 па 1667 г., калі адбыліся дзве кровапралітныя вайны. Практычна ўвесь гэты час насельніцтва было вымушана аднаўляць гаспадарку, а дзяржава — весці барацьбу са свавольствам шляхты і магнатаў. Становішча беларускіх зямель у гэты час было настолькі цяжкім, што пазней яго назавуць «разбуральнае стагоддзе».

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 17. Казацка-сялянская вайна 1648—1651 гг. на беларускіх землях

Якімі былі прычыны і формы сацыяльнага пратэсту на беларускіх землях? Хто такія казакі?

Што стала падставамі казацка-сялянскай вайны? Як яна змяніла адносіны ў грамадстве?

Паўстанне Багдана Хмяльніцкага і яго ўплыў на беларускія землі. У сярэдзіне XVII ст. на беларускіх землях нарастала сацыяльнае і рэлігійнае напружанне. У часы ўладарання *Яна Казіміра Вазы* (гады кіравання *1648—1668*) яно вылілася ў казацка-сялянскую вайну.



▲ Унутраныя супярэчнасці ў Рэчы Паспалітай

Якія з прыведзеных супярэчнасцяў, на вашу думку, сталі галоўнымі прычынамі вайны? Растлумачце свой пункт гледжання.



▲ Багдан Хмяльніцкі

Вайна пачалася вясной **1648 г.** ва Украіне з паўстання на чале з Багданам Хмяльніцкім.



Багдан Хмяльніцкі (1595—1657) — гетман казацкага Войска Запарожскага, таленавіты палкаводзец, дыпламат і дзяржаўны дзеяч. Паходзіў з дробнай праваслаўнай шляхты. Вучыўся ў брацкай школе, потым у езуіцкім калегіуме, ведаў некалькі моў. У складзе казацкага войска ваяваў з Асманскай імперыяй, Расіяй. За асабістую храбрасць нават атрымаў ад караля залатую шаблю.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Казацкае войска

Першыя перамогі казакаў над каралеўскімі войскамі натхнілі на барацьбу з «панамі» народныя нізы. Колькасць паўстанцаў увесь час расла. Першымі пацярпелі не толькі шляхціцы, але і прадстаўнікі такіх народаў, як палякі і яўрэі. У вачах паўстанцаў менавіта яны былі найбольш вінаватыя ў прыгнёце. Казацкі рух хутка перакінуўся і на Беларускае Палессе. Сяляне тут таксама пачалі адмаўляцца выконваць павіннасці і падпарадкоўвацца ўладам.

79—80

Гетман і казацкія старшыны планавалі стварыць сваю казацкую дзяржаву. Б. Хмяльніцкі лічыў, што Беларускае Палессе стане яе часткай. Спачатку гетман рассылаў пасланні, у якіх заклікаў прысягаць яму на вернасць. Праваслаўнай шляхце ён абяцаў свабоду веравызнання і абарону іх маёмасці. Сялян ён заклікаў выступаць супраць «паноў і ляхаў» (так называлі ўсіх каталікоў). Услед за агітатарамі ў чэрвені 1648 г. на захоп беларускіх зямель былі пасланы казацкія атрады *(загоны)*.

Брат на брата. З канца жніўня 1648 г. казацкія загоны рушылі ў тры бакі. Яны хутка прасоўваліся ўздоўж Прыпяці, Бярэзіны

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Казацка-сялянская вайна 1648—1651 гг. на беларускіх землях

80—81

? *Вызначце з дапамогай картасхемы, якімі значнымі гарадамі здолелі авалодаць казакі пры падтрымцы мясцовых жыхароў. Чаму яны не здолелі ўзяць Слуцк і Ляхавічы?*

і Дняпра і ў напрамку Слуцка. З'яўленне казацкіх загонаў, у складзе якіх было нямала беларусаў, прывяло да масавага паказачвання насельніцтва. Беднае сялянства, праваслаўныя мяшчане і дробная шляхта не толькі далучаліся да казацкіх атрадаў. Яны стваралі і ўласныя паўстанцкія атрады, каб дзейнічаць супраць шляхты, купцоў і неправаслаўнага духавенства. Мясцовыя казацка-сялянскія палкі сфарміраваліся ў Брагіне, Гомелі, Рэчыцы і Мазыры. Сведка гэтых падзей пісаў, што «ўсе паказачыліся і пакляліся адзін аднаму стаяць да апошняга». Яны нападалі на шляхецкія маёнткі, рабавалі каталіцкія і ўніяцкія манастыры. З набліжэннем казакаў да Пінска ў горадзе выбухнула паўстанне.

Ці можна гэтыя падзеі назваць рэлігійнай і грамадзянскай вайной? Абгрунтуйце сваю думку.

Правообладатель Издательский центр БГУ

З хронікі С. Машчынскага

…Бурмістры, члены магістрата і просты народ пінскага горада, учыніўшы змову з казакамі і здрадніцкі бунт супраць улады каралёў <…> прыняўшы казакаў за паноў сваіх, учынілі напады на касцёлы, кляштары і на ўсіх каталікоў, падбухторвалі, каб апаганьвалі касцёлы, рабавалі кляштары, забівалі каталікоў… не выключаючы і малых дзяцей, і маёмасць іх гвалтоўна адбіралі.

Паразважайце на падставе раней атрыманых ведаў, чаму жыхары Пінска так сябе паводзілі. Якія групы насельніцтва і чаму выступілі адна супраць адной?

Казакі не сустрэлі арганізаванага супраціўлення з боку ўлад. Кароль Ян Казімір Ваза не здолеў хутка сабраць шляхецкае войска. Дзяржаўны скарб быў пусты. Напалоханыя шляхціцы ратаваліся ўцёкамі. Магнаты ВКЛ, у тым ліку польны гетман *Януш Радзівіл*, за свае грошы сталі наймаць жаўнераў, каб супрацьстаяць казакам.

У кастрычніку 1648 г. войска ВКЛ пачало дзейнічаць. Яно заняло Пінск, а потым іншыя гарады, захопленыя казакамі. Усе жыхары, што падтрымалі паўстанне, былі перабіты, а гарады аддадзены на рабунак.

З дыярыуша А. С. Радзівіла

Наша літоўскае войска, адабраўшы праз 14 дзён сілай у казакаў Пінск, пакінула ў маім старастве большыя, чым ад іх, шкоды і спусташэнні… забіта 14 000 чалавек, малых і старых, пабрана вялізная здабыча. Свавольныя жаўнеры не задаволіліся гэтым. Яны сталі на дзесяць тыдняў у Моталі і там, як вораг, прыгняталі падданых, не шкадуючы ані людзей, ані маёмасці сялян. Яны нарэшце дайшлі да таго, што спустошылі горад і павет.

На падставе крыніцы вызначце, як былі пакараны жыхары Пінска.

Зімой 1649 г. войскі ВКЛ рушылі з Берасця праз Палессе, каб спыніць сумесныя дзеянні паўстанцаў і казакаў. Агульнай праблемай

Правообладатель Издательский центр БГУ

для мясцовых паўстанцаў была адсутнасць або недахоп і нізкая якасць узбраення. Ім не ставала ваеннага вопыту і добрай дысцыпліны ў атрадах. Палонны казак Левантовіч сведчыў, што паўстанцы «стрэльбаў мала маюць ды іншай зброі, як рагаціны, бердышы, ды і пораху няма або мала». Гэта значна паскорыла разгром казацка-сялянскіх атрадаў на поўдні беларускіх зямель.

Бітвы пад Лоевам. Летам 1649 г. Януш Радзівіл пачаў рыхтаваць паход войскаў ВКЛ на землі Украіны. Каб перашкодзіць іх руху, на беларускія землі былі накіраваны казацкія атрады. 12-тысячны загон на чале са Сцяпанам Падбайлам размясціўся паміж Лоевам і Рэчыцай. У дапамогу ім быў дасланы *Міхайла Крычэўскі* з 15-тысячным казацкім атрадам. Да іх далучыліся мясцовыя паказачаныя жыхары. **31 ліпеня 1649 г.** адбылася самая буйна́я на беларускіх землях бітва падчас ваенных падзей 1648—1651 гг. Войска Крычэўскага імкліва атакавала абоз шляхціцаў з боку Мазыра. Радзівіл здолеў адбіць націск казацкіх загонаў і перайшоў у контратаку. Казакі спачатку схаваліся ў лесе, а потым кінуліся ратавацца ўцёкамі. Страты войска Януша Радзівіла, якое мела каля 7 тыс. чалавек, склалі каля чвэрці сіл. У казакаў у бітве загінула ад 3 да 7 тыс. воінаў.



▲ Бітва пад Лоевам. Фрагмент гравюры. 1720 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Казакі былі вымушаны вывесці свае загоны з Палесся, але паранейшаму кантралявалі пераправу праз Дняпро. Войска ВКЛ было аслаблена. Яно не мела дастаткова ўзбраення і прыпасаў, каб працягнуць наступ на Кіеў.

Хаця напружанне барацьбы зменшылася, сітуацыя ў паўднёвай і ўсходняй частках беларускіх зямель заставалася нестабільнай. Абодва бакі збіралі сілы перад новым этапам ваенных дзеянняў. Ён пачаўся летам 1651 г. 40-тысячнае войска Януша Радзівіла хутка рушыла ў бок Чарнігава, каб далей накіравацца да Кіева. Багдан Хмяльніцкі накіраваў пад Гомель 15-тысячны загон *Марціна Нябабы*. Было вырашана затрымаць Януша Радзівіла перамовамі і сустрэць яго войска каля Лоева. Аднак гетман ВКЛ працягнуў наступ. У выніку другой бітвы пад Лоевам **6 ліпеня 1651 г.** казакі былі разбіты, а сам Нябаба загінуў. Войскі ВКЛ перайшлі на тэрыторыю Украіны і ў жніўні ўступілі ў Кіеў.

Прасачыце па картасхеме на с. 118 ход ваенных падзей. Вызначце, якія беларускія землі былі ўцягнуты ў ваенныя дзеянні.

Паражэнні, панесеныя казакамі ў бітвах ва Украіне, вымусілі іх падпісаць у верасні **1651 г.** *Белацаркоўскі дагавор*. Гэты дакумент паклаў канец ваенным дзеянням. Казацкае войска скарачалася ўдвая, а Б. Хмяльніцкі падначальваўся польскаму гетману. Маёнткі вярталіся іх ранейшым уласнікам. Збеглыя сяляне прызнаваліся прыгоннымі і былі павінны вярнуцца да сваіх паноў.

Вынікі і наступствы вайны. Умовы падпісанага дагавора не задавальнялі абодва бакі. Вынікам сталі паўстанні і ўзброеныя сутычкі,



▲ Наступствы вайны

Правообладатель Издательский центр БГУ

якія адбыліся ва Украіне ўжо ў наступныя гады. Аднак на беларускіх землях новых выступленняў не было.

1. Прааналізуйце падзеі 1648—1651 гг. паводле плана: 1) прычыны; 2) мэты; 3) удзельнікі; 4) вынікі.
2. Складзіце апавяданне пра Лоеўскую бітву 1649 г., выкарыстоўваючы картасхему на с. 118, гравюру на с. 120 і тэкст параграфа.
3. Уявіце, што вы — мешчанін, шляхціц, казак ці селянін. На чыім баку і чаму вы б змагаліся ў час вайны 1648—1651 гг.? Як бы мог скласціся ваш лёс?
4. З дапамогай гістарычных фактаў паспрабуйце растлумачыць, чаму сучаснікі лічылі перыяд 1648—1651 гг. грамадскай катастрофай.

5*. Чаму адзін з пунктаў параграфа названы «Брат на брата»? Аргументуйце свой адказ.

§ 18. Беларускія землі ў вайне Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг.

Якія наступствы мела для беларускіх зямель казацка-сялянская вайна?

Чаму неўзабаве пасля заканчэння казацка-сялянскай вайны Рэч Паспалітая была ўцягнута ў новы ваенны канфлікт?

Прычыны і пачатак вайны. Не паспелі адгрымець апошнія бітвы казацкай вайны, як на беларускія землі абрынулася новая ваенная навала. Пачатак ёй далі падзеі, якія адбыліся ва Украіне. Казакі вырашылі выйсці з падпарадкавання Рэчы Паспалітай і перайсці пад уладу расійскага цара. Канфлікт паміж Расійскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай станавіўся непазбежным.

У Маскве вырашылі, што найлепшым спосабам вырашэння гэтага канфлікту будзе наступальная вайна. У маі **1654 г.** расійскае войска, падзеленае на тры арміі, уварвалася ва ўсходнія землі Рэчы Паспалітай. У саюзе з ім дзейнічалі запарожскія казакі.

Рэч Паспалітая аказалася непадрыхтаванай да вайны. Гэта добра відаць па расстаноўцы сіл. Расійскае войска налічвала самае малое 80 тыс. чалавек. Вялікае Княства Літоўскае мела на той момант усяго

Правообладатель Издательский центр БГУ



▶ Чарцёж горада Віцебска. 1664 г.

? *Разгледзьце ілюстрацыю і растлумачце, чаму Віцебск лічыўся адной з самых моцных крэпасцяў у Вялікім Княстве Літоўскім.*

20-тысячнае войска. Ужо летам ваенныя дзеянні ішлі на беларускіх землях. Рэч Паспалітая адзін за адным страчвала гарады. У чэрвені здаўся Полацк, у жніўні — Магілёў. Але гарады, якія мелі добрыя мураваныя ўмацаванні, упарта і доўга абараняліся. Так, напрыклад, Віцебск трымаўся цэлыя тры месяцы і здаўся толькі ў лістападзе 1654 г.

84, 86—87

Восенню войска Вялікага Княства Літоўскага на чале з гетманам Янушам Радзівілам пачало контрнаступленне ў Падняпроўі і Падзвінні. Але яно не прынесла вялікіх поспехаў. А вось наступальная кампанія расійскіх войскаў 1655 г. зноў была ўдалай. Яны занялі практычна ўсю тэрыторыю Беларусі, а *8 жніўня* захапілі сталіцу Вялікага Княства — *Вільню*.

Палітыка царскага ўрада на беларускіх землях. Поспехам царскіх войскаў на пачатковым этапе вайны спрыяла падтрымка мясцовых жыхароў. У сваёй палітыцы цар Аляксей Міхайлавіч разлічваў абаперціся на адзінавернае праваслаўнае насельніцтва. Але на той час сярод жыхароў Беларусі было ўжо нямала ўніятаў і каталікоў. Новая ўлада заклікала іх пераходзіць у праваслаўную веру. Аднак гэтыя меры не мелі асаблівага поспеху.



▲ Расійскі цар Аляксей Міхайлавіч

Царскі ўрад пакінуў гарадам магдэбургскае права. Але гарады былі разбураны вайной.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Многія мясцовыя жыхары трапілі ў палон ці пакінулі свае дамы. Да таго ж новыя ўлады пачалі перасяляць кваліфікаваных рамеснікаў з беларускіх гарадоў у Расію. Перасяленне адбывалася і пад прымусам, і добраахвотна.

Не атрымалі палёгкі ў сваім становішчы і сяляне. Змяніліся толькі іх гаспадары, бо царскі ўрад пачаў раздаваць шляхецкія маёнткі расійскім памешчыкам. Ужо ў першыя месяцы вайны беларускія сяляне аказаліся практычна безабароннымі перад рабаўніцтвам замежных войскаў. Каб захаваць свае сем'і і маёмасць, яны сталі аб'ядноўвацца ў партызанскія атрады. Расійскія ваяводы называлі гэтых сялян *шышамі*.

З данясення віцебскага ваяводы Пятра Далгарукава цару Аляксею Міхайлавічу (снежань 1658 г.)

Есть в дву местех в лесах станы — мужичье шишуют, а от села Бикова с милю; и [голова московских стрельцов Василий Пушечников] на тех шишей посылал двести человек стрельцов, и стрельцы тех шишей побили, и станы разорили, и село Биково выжгли.

Як вы думаеце, пра што сведчыць той факт, што супраць шышоў былі накіраваны рэгулярныя войскі — стральцы? Паспрабуйце высветліць, дзе адбываліся падзеі, апісаныя ў дакуменце.

Шляхта таксама аказалася перад складаным выбарам. Царскі ўрад патрабаваў ад яе прысягі на вернасць і службу. Але гэта азначала здраду Рэчы Паспалітай. У выніку частка шляхты ўсё ж прысягнула. Іншая захавала вернасць каралю. Аднак нямала было і тых, хто не жадаў ваяваць ні на адным з бакоў і хаваўся разам з сем'ямі па лясах.

Вайна са Швецыяй і Кейданская унія 1655 г. Няўдачы Рэчы Паспалітай у вайне з Масквой вырашыла выкарыстаць у сваіх інтарэсах Швецыя. Летам 1655 г. шведскія войскі ўступілі на тэрыторыю Польшчы. Другая іх групоўка высадзілася на балтыйскім узбярэжжы Вялікага Княства Літоўскага — у Жамойці. Практычна не сустрэўшы супраціву, шведы занялі заходнія землі Вялікага Княства, у тым ліку Браслаўскі павет.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Становішча Вялікага Княства было вельмі складаным. Амаль уся яго тэрыторыя была занята войскамі замежных дзяржаў. Дапамогі ад караля Яна Казіміра і Польшчы фактычна не было. У гэтай сітуацыі частка знаці на чале з Я. Радзівілам вырашыла парваць з Польшчай і заключыць саюз са Швецыяй. У кастрычніку **1655 г.** у мястэчку *Кейданы* ў Літве была падпісана унія Вялікага Княства Літоўскага са Шведскім каралеўствам. Але гэта пагадненне мела вельмі шмат праціўнікаў. У выніку яно так і не было рэалізавана на практыцы.

Як вы думаеце, якімі маглі быць вынікі скасавання саюзу ВКЛ з Польшчай і заключэння уніі са Швецыяй?



Януш Радзівіл (1612—1655) — вялікі гетман ВКЛ з 1654 г. Актыўны абаронца палітычных правоў пратэстантаў і праваслаўных, праціўнік узмацнення ўлады караля. Дзякуючы яму ў 1648—1651 гг. былі разбіты казацкія атрады. Падпісанне Кейданскай уніі са Швецыяй зрабіла яго здраднікам у вачах грамадства. Яго маёнткі былі канфіскаваны, а сам ён памёр пры загадкавых абставінах. Праявіў сябе не толькі як вайсковы і палітычны дзеяч. Выдатна маляваў і нават выступаў як акцёр-аматар.



▲ Януш Радзівіл. Мастак *Д. Шульц*. Сярэдзіна XVII ст.

Віленскае перамір'е з Расіяй. Шведскія войскі актыўна дзейнічалі на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Расія імкнулася заваяваць шведскую частку Лівоніі. Гэта прывяло да таго, што Швецыя стала ворагам адначасова і для Расіі, і для Рэчы Паспалітай. У **лістападзе 1656 г.** Рэч Паспалітая і Расія падпісалі Віленскае пагадненне. Яны дамаўляліся спыніць паміж сабой баявыя дзеянні і разам выступіць супраць шведаў. Гэтае перамір'е дало кожнаму з бакоў неабходны час на вырашэнне сваіх ваенных задач. Рэч Паспалітая здолела згуртаваць сілы. З дапамогай замежных саюзнікаў яна вызваліла свае землі ад шведскіх войскаў. Вайна паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй завяршылася падпісаннем у 1660 г. Аліўскага мірнага дагавора.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. І этап (1654—1656)

? *Пры дапамозе картасхемы і тэксту параграфа складзіце апавяданне пра ваенныя падзеі ад пачатку вайны да Віленскага перамір'я.*

Працяг баявых дзеянняў. Віленскае перамір'е аказалася нядоўгім. Баявыя дзеянні паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй аднавіліся пад канец 1658 г. Напачатку 1660-х гг. Рэч Паспалітая дабілася ў вайне шэрагу буйны́х поспехаў. У 1660 г. яе войскі перамаглі ў бітве пад Палонкай каля Баранавічаў, а таксама вызвалілі Вільню. Пачалі мя-

Правообладатель Издательский центр БГУ



◀ Памятны знак на месцы бітвы пад Палонкай

? *З якой мэтай адбываецца ўшанаванне падобных падзей у Беларусі?*

няцца і настроі беларускага мяшчанства. У 1661 г. у выніку паўстанняў супраць царскай улады вызваліліся гарады Магілёў, Мсціслаў, Дзісна. У тым жа годзе войска Рэчы Паспалітай атрымала новую перамогу — пад Кушлікамі, на захад ад Полацка.

Знайдзіце месцы гэтых падзей на картасхеме на с. 128.

Пасля гэтых падзей ход ваенных дзеянняў запаволіўся. Бакі былі знясілены. Становішча царскіх ваявод на беларускіх землях было вельмі цяжкім. Гарнізоны расійскіх войскаў былі фактычна заблакаваны ў гарадах. Яны не кантралявалі сельскую ваколіцу і таму поўнасцю залежалі ад падвозу харчу і іншых прыпасаў з Расіі. У самых пацярпелых мясцовасцях Беларусі лютаваў голад, здараліся нават выпадкі людаедства.

З указной граматы цара Аляксея Міхайлавіча (12 верасня 1665 г.)

[Царь] указал с Москвы… послать… ратным людем, которые от цынги больны, вина и уксусу и збитню… для того чтоб в Полоцку и в Витепску ратным людем болезнь не множилась, и от той болезни не помирали.

Як вы думаеце, пра што сведчыць гэты дакумент? Паспрабуйце даведацца, што за хвароба цынга і што з'яўляецца яе прычынай.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. II этап (1658—1667)

Андросаўскае перамір'е і завяршэнне вайны. У рэшце рэшт стомленыя доўгай вайной дзяржавы пачалі мірныя перагаворы. **30 студзеня 1667 г.** у вёсцы *Андросава* (Андрусава, цяпер Смаленская вобласць Расіі) іх дэлегацыі заключылі дагавор пра перамір'е на трынаццаць з паловай гадоў. Згодна з яго ўмовамі Смаленская і Чарнігава-Северская землі, Левабярэжная Украіна і Кіеў засталіся за Масквой.

Як вы думаеце, на чыю карысць скончылася вайна?

Правообладатель Издательский центр БГУ

У той жа час Расія вярнула Рэчы Паспалітай Віцебскае і Полацкае ваяводствы, а таксама лівонскія землі.

90—91

Умовы Андросаўскага перамір'я леглі ў аснову «вечнага міру», які Варшава і Масква заключылі ў *1686 г.* Ваенныя канфлікты паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай спыніліся на сто гадоў.

Вайна 1654—1667 гг. стала адной з самых трагічных старонак у гісторыі беларускага народа. Яна пакінула глыбокі след у самых розных сферах яго жыцця. Вынікамі вайны сталі рэзкае скарачэнне насельніцтва і працяглы эканамічны крызіс.

1. Ахарактарызуйце вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. паводле плана: 1) прычыны; 2) удзельнікі; 3) асноўныя этапы; 4) вынікі.
2. Якую палітыку праводзілі расійскія ўлады на захопленай тэрыторыі Беларусі?
3. У якім становішчы апынуліся прадстаўнікі розных саслоўяў у час вайны?
4. Як паўплывала вайна 1655—1660 гг. са Швецыяй на стасункі Рэчы Паспалітай з Расіяй?
5. Як вы думаеце, якія гады можна лічыць пераломнымі ў ходзе вайны? Свой адказ растлумачце.

6*. З дапамогай тэксту параграфа і дадатковых крыніц інфармацыі складзіце апавяданне пра адну з падзей вайны ад імя яе ўдзельніка.

§ 19. Асаблівасці развіцця беларускіх зямель у апошняй трэці XVII ст.

Якія беларускія землі найбольш закранула вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг.?

Якія змены ў эканоміцы і палітыцы адбыліся ў выніку войнаў Рэчы Паспалітай з казакамі і Расіяй?

Наступствы войнаў. Асаблівасцю эканамічнага развіцця беларускіх зямель у апошняй трэці XVII ст. стала вельмі павольнае пераадольванне наступстваў войнаў.

За 20 гадоў ваенных дзеянняў найбольш пацярпелі землі на ўсходзе і поўначы Беларусі. З буйных гарадоў удалося выстаяць толькі Слуцку,

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Наступствы войнаў 1648—1651 і 1654—1667 гг. для беларускіх зямель

? *Як вы лічыце, якое з наступстваў было найцяжэй пераадолець? Аргументуйце свой адказ.*

дзе намаганнямі яго ўладальнікаў Радзівілаў была ўзведзена магутная крэпасць. У краіне засталося менш за палову даваеннай колькасці жыхароў.



▲ Страты насельніцтва ваяводстваў ВКЛ у выніку войнаў 1648—1651 і 1654—1667 гг., %

? *Даведайцеся, наколькі зменшылася насельніцтва і колькасць дымоў праз гэтыя войны ў вашым павеце.*

Аднаўленне гарадоў і мястэчак. Гарады і мястэчкі аднаўляліся вельмі марудлівымі тэмпамі. Для адбудовы гарадоў не хапала рабочых рук, асабліва рамеснікаў. Напрыклад, у Гародні ў 1680 г. засталося толькі 12 рамеснікаў са 130, што жылі там у 1650 г. З гэтай прычыны паменшыліся і аб'ём тавараў, якія выраблялі ў гарадах,

Правообладатель Издательский центр БГУ

і колькасць рамесных спецыяльнасцяў. Цяжка было зарабіць грошы на аднаўленне. У краіне было мала збожжа, якое па-ранейшаму заставалася асноўным таварам для вывазу. Да таго ж дарогі і гасцінцы заставаліся небяспечнымі, таму купцы не жадалі рызыкаваць.

Выраслі дзяржаўныя падаткі. Акрамя «падымнага», якое плацілі землеўласнікі з кожнай гаспадаркі, штогод сталі збіраць сродкі на ўтрыманне войска. Вялізныя падаткі і недахоп грошай прыводзілі да памяншэння колькасці пакупнікоў. Таму гарадскія рамеснікі пачалі перасяляцца на вёску ці займацца сельскай гаспадаркай у гарадах. З мэтай аднаўлення і адбудовы некаторыя гарады соймавымі рашэннямі былі вызвалены ад падаткаў на чатыры гады.

▶ Выява Магілёва



З дзённіка расійскага дыпламата П. А. Талстога

1697 г. …Горад Магілёў вялікі, каля горада пасады вялікія, у пасадах шмат садоў. Той горад Магілёў нашмат большы за Смаленск. Вакол пасадаў горад земляны, ад ракі Дняпра пачаты і да ракі Дняпра прыведзены. Верхні горад земляны таксама вельмі высокі; у горад дзве праезджыя брамы мураваныя, а дзве драўляныя, вежаў навокал няма. У Магілёве жывуць купецкія людзі. Той горад каменны, называецца «каралеўская эканомія», ці «каралеўскі», «палацавы», а палякі папросту завуць той горад «каралеўская кухня». Жыхары Магілёва — мяшчане, усе святой грэчаскай веры.

? *Параўнайце выяву і гістарычную крыніцу. Як вы лічыце, чаму Магілёў адрадзіўся хутчэй за іншыя населеныя пункты? Пра што сведчыць наяўнасць у горадзе каменных пабудоў?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Адраджэнне сельскай гаспадаркі. Пры адраджэнні сельскай гаспадаркі дзяржава таксама сутыкнулася з мноствам цяжкасцяў. Падчас вайны шмат вёсак было спалена, ворныя землі прыйшлі ў запусценне. У сялян засталося мала свойскай жывёлы. Да гэтага дадаліся неўраджаі, якія выклікалі голад і эпідэміі. Сяляне не маглі забяспечыць сябе і выплачваць падаткі. Таму яны масава сталі ратавацца ўцёкамі ў заходнія часткі дзяржавы і Расію. «У наваколлях — галота, у некаторых вёсках няма ніводнага селяніна, валок не аруць. Сярод люду, што застаўся, пануе страшэнная галеча», — пісаў адзін са шляхціцаў. Зямля дрэнна апрацоўвалася і ўгнойвалася, таму ўраджайнасць зніжалася. Каб знайсці грошы, землеўласнікі павысілі паншчыну да 4—5 дзён у тыдзень з гаспадаркі. Маёнткі сталі масава здавацца ў арэнду (часовае ўладанне). Арандатара не цікавіў дабрабыт сялян. Ён хацеў за кароткі час атрымаць найбольшы прыбытак. Падаткі і павіннасці сялян усё раслі, а самі вёскі прыходзілі ў стан поўнай галечы.

Становішча палепшыла заснаванне новых тыпаў паселішчаў — *слабод*. Іх жыхары атрымлівалі падатковыя льготы на 5—15 гадоў. Акрамя сялян туды ахвотна перасяляліся і мяшчане. Асабліва шмат слабод узнікла на ўсходзе краіны. Землеўласнікі заахвочвалі сялян распрацоўваць пусткі. За такі дадатковы надзел сялянам памяншаліся павіннасці. Гэта прываблівала ўцекачоў з Расіі. У выніку да канца стагоддзя павялічылася колькасць насельніцтва, выраслі памеры пасяўных зямель, колькасць цяглавай жывёлы. Аднак адбудаваць гарады і аднавіць гаспадарку да ранейшага ўзроўню так і не ўдалося, бо гэтаму перашкодзіла **Паўночная вайна 1700—1721 гг.**



◀ Сельскагаспадарчыя работы. Малюнак з дакумента XVIII ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Унутрыпалітычная барацьба. Ад ваенных разбурэнняў пацярпелі і сяляне, і мяшчане, і шляхта. Усё больш шляхціцаў бяднела і не магло пракарміцца са сваіх маёнткаў. Яны былі вымушаны ісці на службу да магнатаў. Разам з дабрабытам шляхціцы страчвалі і палітычную самастойнасць.

▶ Пан і слуга. Мастак *Я. П. Норблін*. XIX ст.



? *Вызначце, дзе на малюнку пан-магнат, а дзе слуга-шляхціц. Пра што, на ваш погляд, яны маглі размаўляць? *Складзіце дыялог.*

На палітычнае жыццё краіны ўсё больш стала ўплываць сапернiцтва магнацкіх родаў.

Гады	1670-я гг. — пачатак 1680 гг.	Пачатак 1680-х — 1700 г.	1700—1703 гг.
Знаходзіліся пры ўладзе	Пацы	Сапегі	Вішнявецкія, Агінскія, Пацеі
Змагаліся за ўладу	Сапегі, Радзівілы	Агінскія, Вішнявецкія, Пацеі, Радзівілы	Сапегі

▲ Сапернiцтва магнацкіх родаў

? *Прасачыце з дапамогай схемы, якія роды змагаліся за ўладу ў апошняй трэці XVII — пачатку XVIII ст.*

Сойм і павятовыя соймікі з органаў улады ператвараліся ў месца звядзення асабістых рахункаў магнатаў. Вольнасці, якімі так ганарылася шляхта, абумовілі крызіс Рэчы Паспалітай. Найбольшую шкоду прыносіла права **ліберум вета** (свабоднага «забараняю»). Згодна з ім усе рашэнні на соймах павінны былі прымацца толькі аднагалосна. Нават

Правообладатель Издательский центр БГУ

Успомніце, што яшчэ акрамя права ліберум вета ўключалі залатыя шляхецкія вольнасці.

адзін пасол меў права выказаць нязгоду з любым рашэннем і такім чынам сарваць сойм. Упершыню сойм быў сарваны словамі «я забараняю» ў 1669 г. Пазней такая практыка зрабілася сталай.

Магнаты ўмела выкарыстоўвалі гэтае права і не давалі праводзіць ніякія рэформы. Магнацкія групоўкі выступалі супраць умацавання ўлады манарха. Часам узрастання моцы магнацкіх груповак стаў перыяд уладарання *Яна III Сабескага* (гады кіравання *1674—1696*). Магнаты імкнуліся атрымаць як мага больш вышэйшых пасад. Дамогшыся іх, яны пераходзілі ў апазіцыю да караля.

Як вы лічыце, чым пагражала магнатам узмацненне цэнтральнай улады?



▲ Ян III Сабескі. *Невядомы мастак.* XVIII ст.



Ян III Сабескі (1629—1696) — выдатны палкаводзец і дзяржаўны дзеяч. У 1674 г. абраны каралём польскім і вялікім князем літоўскім. Вылучыўся сваімі ваеннымі перамогамі: у 1673 г. пад Хацінам, у 1683 г. пад Венай. У ВКЛ змагаўся супраць Пацаў і падтрымаў узмацненне роду Сапегаў.

Сітуацыя ўскладнілася з сярэдзіны 1680-х гг. У гэты час Сапегі змаглі засяродзіць у сваіх руках усе вышэйшыя дзяржаўныя пасады. Прыхільнікі гэтага роду рабавалі маёнткі саперніка ў, застрашвалі іх, зрывалі соймы. Да таго ж Сапегі актыўна супрацоўнічалі з замежнымі ўрадамі. У выніку замежныя краіны пачалі ўмешвацца ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. Незадаволеная палітыкай Сапегаў шляхта стала аб'ядноўвацца. Партыя атрымала назву *рэспубліканцаў*, бо яе ўдзельнікі хацелі дамагчыся рэальнай палітычнай роўнасці шляхты і магнатаў.

Пасля смерці Яна III Сабескага супрацьстаянне фактычна перарасло ў грамадзянскую вайну. Выбранне на трон саксонскага князя, які стаў новым каралём *Аўгустам II* (гады кіравання *1697—1706, 1709—1733*) не спыніла ўзброеныя сутычкі. У **лістападзе 1700 г.** пад Алькенікамі

Правообладатель Издательский центр БГУ

каля Вільні адбылася вырашальная бітва. Рэспубліканцы на чале з *Міхалам Сервацыем Вішнявецкім* перамаглі Сапегаў. Тыя мусілі ратавацца ўцёкамі. Сапегі былі пазбаўлены сваіх пасад, маёнткаў у ВКЛ і асуджаны на выгнанне. На першыя ролі ў ВКЛ выйшлі лідары рэспубліканцаў: Вішнявецкія, Агінскія і Пацеі.

Апошняя трэць XVII ст. стала часам паступовага аднаўлення жыцця ў краіне пасля 20 гадоў цяжкіх войнаў. У той жа час не былі вырашаны многія ўнутраныя і знешнепалітычныя праблемы. Самай сур'ёзнай з іх стала бесупынная барацьба магнацкіх груповак, якая аслабляла дзяржаўную ўладу.

1. Прааналізуйце, як змянілася становішча розных катэгорый насельніцтва ў другой палове XVII ст.: а) сялян; б) мяшчан; в) шляхты. Што стала прычынай гэтых змен?
2. Назавіце прычыны перасялення ў вёску часткі гарадскіх рамеснікаў у апошняй трэці XVII ст.
3. Пералічыце спосабы аднаўлення гаспадаркі. Ці былі яны паспяховымі?
4. Ці можна было пазбегнуць супрацьстаяння магнацкіх груповак? *Уявіце сябе прыхільнікам адной з іх і складзіце прамову ў абарону інтарэсаў сваіх паплечнікаў на сойме.
5. Прааналізуйце прычыны, склад удзельнікаў і вынікі грамадзянскай вайны.

6*. Ці адпавядаў сітуацыі другой паловы XVII ст. выраз: «Шляхціц, хоць найбяднейшы, быў роўны магнату…»? Аргументуйце свой адказ.

§ 20. Паўночная вайна 1700—1721 гг. на беларускіх землях

Якія вынікі для ВКЛ мелі войны са Швецыяй у XVII ст.? Чым скончыўся канфлікт Сапегаў з рэспубліканцамі ў 1700 г.?

Як Рэч Паспалітая аказалася ўцягнутай у чужую вайну? Якія наступствы гэта мела для беларускіх зямель?

Прычыны і пачатак вайны. На працягу XVII ст. пад кантролем Швецыі аказалася амаль усё ўзбярэжжа Балтыйскага мора. Незадаволеныя такой сітуацыяй дзяржавы (Расія, Данія і Саксонія) утварылі супраць яе Паўночны саюз.

Чаму Балтыйскае ўзбярэжжа мела для ВКЛ важнае значэнне? Складзіце схему «Супрацьстаянне бакоў падчас Паўночнай вайны».

Правообладатель Издательский центр БГУ

Каралю Аўгусту II было важна вярнуць Рэчы Паспалітай страчаныя раней землі Лівоніі. Гэта ўзмацніла б яго пазіцыі ў краіне. Аднак магнаты і шляхта ваяваць не жадалі. Таму напачатку 1700 г. Аўгуст II пачаў вайну сіламі толькі саксонскіх войскаў. Яны ўзялі ў аблогу Рыгу. Аднак шведы вельмі хутка разбілі войскі саксонцаў і іх саюзнікаў. Пазбегнуць поўнага паражэння Аўгуст II мог, толькі ўцягнуўшы Рэч Паспалітую ў вайну са Швецыяй.



▲ Аўгуст II. Мастак *Н. дэ Ларгільер*. Пачатак XVIII ст.



Аўгуст II Ветын (1670—1733) — саксонскі князь; манарх Рэчы Паспалітай у 1697—1706, 1709—1733 гг. Атрымаў у сучаснікаў мянушку Моцны, бо ламаў рукамі падковы, змінаў срэбраныя кубкі. У 1706 г. пасля акупацыі шведамі Саксоніі адмовіўся ад трона Рэчы Паспалітай. Вярнуўся на трон у 1709 г. у сувязі з паражэннем шведаў пад Палтавай.

Унутрыпалітычны канфлікт у ВКЛ і ўварванне шведскіх войскаў. У гэты час у ВКЛ працягваўся канфлікт паміж рэспубліканцамі і Сапегамі. Абодва бакі шукалі падтрымку як у самой краіне, так і за яе межамі. Сапегі ўсяляк імкнуліся атрымаць дапамогу ад шведаў, якія ўвайшлі на тэрыторыю ВКЛ. Акрамя таго, яны стварылі ў сваіх уладаннях казацка-сялянскія атрады. Гэтыя атрады перамаглі рэспубліканцаў пад Дуброўнам, Старым Быхавам і Галоўчынам.

Рэспубліканцы супрацоўнічалі з Расіяй і абяцалі ваяваць са шведамі за царскае ўзнагароджанне. Яны спадзяваліся таксама на дапамогу Расійскай дзяржавы ў змаганні з сялянска-казацкімі атрадамі на ўсходзе беларускіх зямель. Таму рэспубліканцы ад імя Вялікага Княства Літоўскага падпісалі дамову з Расіяй. Гэты дагавор быў заключаны са згоды караля. Такім чынам, спачатку Аўгуст II уцягнуў у Паўночную вайну ВКЛ, а потым і ўсю Рэч Паспалітую.

Ці мела права ВКЛ падпісваць міжнародныя дамовы без згоды Польшчы?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Баявыя дзеянні на беларускіх землях. Баявыя дзеянні перакінуліся на землі ВКЛ. Рэспубліканцам не хапала сіл супрацьстаяць шведам, і тыя хутка захапілі Гародню і Вільню. Далей шведскія войскі накіраваліся ў Польшчу, дзе занялі Варшаву.

Шляхта Рэчы Паспалітай раскалолася на прыхільнікаў Аўгуста II і яго праціўнікаў. Апошнія з дапамогай шведаў у 1704 г. пазбавілі Аўгуста II кароны і абралі новым каралём Станіслава Ляшчынскага. У адказ прыхільнікі Аўгуста II аб'ядналіся ў *Сандамірскую канфедэрацыю*. Яе ўдзельнікі выказаліся за працяг вайны са Швецыяй і заключылі саюз з Расіяй.



▲ Станіслаў Ляшчынскі. Мастак *А. Маніёкі*. Пачатак XVIII ст.

Сумесная барацьба са Швецыяй	**Умовы**	Фінансавая і ваенная падтрымка ад Расіі
Дапамога Рэчы Паспалітай у заваяванні шведскай часткі Лівоніі		Права расійскіх войскаў праводзіць ваенныя дзеянні на тэрыторыі Рэчы Паспалітай

▲ Умовы саюзу Сандамірскай канфедэрацыі з Расіяй

? *Вызначце, якія абавязкі ўзялі на сябе саюзнікі. Хто з удзельнікаў быў больш зацікаўлены ў саюзе?*

Увосень 1704 г. расійскія войскі размясціліся на поўначы беларускіх зямель. У наступным годзе яны ўжо былі пад Гародняй, дзе пабудавалі ўмацаваны лагер. Але шведскі кароль Карл XII з войскам імкліва падышоў да горада і акружыў праціўніка. Расійскім войскам удалося вырвацца, пераправіўшыся ў час ледаходу праз Нёман. Шведы гналіся за імі да Пінска, дзе іх рух спыніла паводка на рэках.

Расійскія і шведскія жаўнеры спусташалі не толькі гарады і вёскі. Неаднаразова яны нападалі на каталіцкія і ўніяцкія храмы і манастыры. Вынікам гэтага стала нарастанне варожасці да пратэстантаў і праваслаўных у краіне.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Падчас наведвання Полацка ў ліпені 1705 г. Пётр I завітаў у Сафійскі сабор, які на той час быў ужо ўніяцкім. Абураны цар разам са сваёй світай напаў на мясцовых манахаў-базыльянаў. Частка з іх была забіта, а Сафійскі сабор і манастыр расійскія жаўнеры разрабавалі. Па загадзе цара ў сутарэннях сабора зрабілі сховішча пораху. Напярэдадні адыходу з горада расійскіх войскаў сховішча выбухнула. Сабор быў амаль цалкам разбураны.

Улетку 1706 г. шведская армія ўвайшла ў Саксонію. Гэта прымусіла Аўгуста II адмовіцца ад кароны Рэчы Паспалітай і саюзу з Расіяй. Аднак Сандамірская канфедэрацыя не прызнала гэтае рашэнне.

Бітвы пад Галоўчынам і Лясной. У 1708 г. асноўныя шведскія сілы праз Гародню і Менск рушылі на Расію. *3 ліпеня 1708 г.* каля мястэчка *Галоўчын* (Бялыніцкі раён Магілёўскай вобласці) шведскае войска колькасцю 12,5 тыс. чалавек перамагло расійскае войска, сілы якога былі ўтрая большымі. Шведам дасталіся гарматы і вялікая колькасць боепрыпасаў. Кароль Карл XII высока ацаніў сваю перамогу і загадаў выбіць медаль з надпісам: «Пераможаны лясы, балоты, апоры і непрыяцель». Шведы занялі Магілёў, аднак далей на тэрыторыю Расіі не пайшлі.

З успамінаў шведскага жаўнера

Наш шлях да месца быў вельмі цяжкім. Дождж ішоў больш за 6 тыдняў, дарогі летам былі горай, чым у лістападзе. Адзін Бог ведае, колькі мы намучыліся. На шляху не сустрэлі ніводнага чалавека. Я сведчу, што ніхто з нас не мог купіць ні хлеба, ні піцця…

Што перашкаджала далейшаму руху шведскіх войскаў у Расію?

У гэты час шведскі кароль Карл XII па запрашэнні казацкага гетмана Івана Мазепы накіраваўся ва Украіну. З Рыгі з запасамі правіянту і фуражу на дапамогу Карлу XII рухаўся 13-тысячны корпус генерала Адама Левенгаўпта. Цар Пётр I вырашыў перашкодзіць злучэнню шведскіх войскаў. **28 верасня 1708 г.** каля вёскі *Лясная* (Слаўгарадскі раён Магілёўскай вобласці) 12-тысячная расійская

Правообладатель Издательский центр БГУ



Бітва каля вёскі Лясная. Мастак *П. Д. Мартэн-малодшы*. Фрагмент. XVIII ст.

? **Уявіце сябе ўдзельнікам бітвы і апішыце свае ўражанні ад падзеі з дапамогай карціны.*

армія разбіла корпус Левенгаўпта. Шведская армія засталася без неабходнай дапамогі.

У *чэрвені 1709 г.* ва Украіне адбылася Палтаўская бітва. Шведскае войска было цалкам разбіта царом Пятром I. Ужо ў жніўні на трон Рэчы Паспалітай вярнуўся Аўгуст II. Прыхільнікі Ляшчынскага на чале з Сапегамі склалі зброю і прызналі ўладу былога манарха. Рэч Паспалітая фактычна выйшла з непапулярнай у грамадстве вайны. Аднак расійскія войскі працягвалі знаходзіцца на землях Рэчы Паспалітай і былі выведзены з беларускіх зямель толькі ў канцы вайны.

Вынікі і наступствы вайны. У 1721 г. Расія, не запрасіўшы Саксонію і Рэч Паспалітую, заключыла Ніштацкую мірную дамову са Швецыяй. Да Расіі адышлі ўся Прыбалтыка і частка Карэліі. Рэч Паспалітая не атрымала абяцаную ёй шведскую частку Лівоніі. Яна заключыла мір са Швецыяй толькі ў 1732 г.

Вайна прынесла беларускім землям вялікія страты. На трэць скарацілася колькасць насельніцтва. Войскі праціўнікаў мэтанакіравана знішчалі і спусташалі беларускія гарады і маёнткі. Шведы цалкам

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Паўночная вайна

Прасачыце па картасхеме ход падзей і ахарактарызуйце асноўныя вынікі вайны для беларускіх зямель.

зруйнавалі Мір, Клецк, Нясвіж, Карэлічы, Ляхавічы, разрабавалі Гародню, Пінск, Менск, Новагародак, Ліду, Магілёў. Па загадзе Пятра I былі спалены некаторыя ўсходнебеларускія гарады. Вёскі нішчыліся войскамі, якія адбіралі правіянт і фураж.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Паўночная вайна, у якую Рэч Паспалітая была ўцягнута супраць волі, стала прычынай эканамічнага і палітычнага крызісу ў дзяржаве. Цэнтральная ўлада страчвала свае пазіцыі, абвастрылася рэлігійнае пытанне. Гаспадарка краіны была цалкам разбурана.

1. Якім чынам унутрыпалітычны канфлікт у ВКЛ садзейнічаў уцягванню Рэчы Паспалітай у Паўночную вайну?
2. Прааналізуйце падзеі 1700—1721 гг. паводле плана: 1) прычыны; 2) мэты; 3) удзельнікі; 4) вынікі.
3. Пры дапамозе тэксту параграфа растлумачце, як паўплывала на далейшы ход вайны бітва пры Лясной.
4*. Абмяркуйце, чаму падзеі Паўночнай вайны на тэрыторыі Беларусі некаторыя гісторыкі лічаць «еўрапейскім скразняком».
5*. Карыстаючыся тэкстам параграфа, картасхемай на с. 140 і дадатковымі крыніцамі, складзіце апавяданне пра адну з падзей Паўночнай вайны. Праілюструйце яго.

§ 21. Грамадска-палітычнае жыццё ў першай палове XVIII ст.

Што такое залатыя шляхецкія вольнасці? Як выкарыстанне права ліберум вета ўплывала на палітычную сітуацыю ў краіне?

У чым былі прычыны палітычнага крызісу Рэчы Паспалітай?

Унутрыпалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у пачатку XVIII ст. Вяртанне на трон Аўгуста II зменшыла напружанне ў грамадстве. Былі памілаваны прыхільнікі Станіслава Ляшчынскага. Сапегам вярнулі іх ранейшыя пасады і ўладанні.

Кароль вырашыў скарыстаць момант і паспрабаваў умацаваць сваю ўладу ў Рэчы Паспалітай. Вялікай праблемай заставаліся пастаянныя зрывы сойма. Таму ў акружэнні караля з'явіліся ідэі рэфармавання сойма. Наступным крокам магло стаць усталяванне спадчыннай каралеўскай улады ў Рэчы Паспалітай. Супраць гэтых планаў выступіла большасць магнатаў і шляхты. Яны слушна лічылі, што так каралю будзе лягчэй уздзейнічаць на сойм.

Як вы мяркуеце, чаму шляхта не была зацікаўлена ў правядзенні рэформаў?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Працiўнікаў пераўтварэнняў у ВКЛ узначаліў вялікі гетман, а пазней віленскі ваявода Людвік Пацей. Яго ўплыў у кране быў велізарным. Будучы падскарбіем ВКЛ, ён нават чаканіў на манетах разам з дзяржаўным і свой уласны герб.



▲ Саксонскі жаўнер

Аднак яшчэ не скончылася разбуральная вайна са Швецыяй. Да гэтага дадалася пагроза ваеннага канфлікту з Асманскай імперыяй. Прыхільнікі Станіслава Ляшчынскага вырашылі скарыстацца сітуацыяй і ўзняць паўстанне. Небяспечнае становішча ў дзяржаве вымусіла Аўгуста II увесці ў Рэч Паспалітую саксонскія войскі. Цяжар іх утрымання і злоўжыванні саксонцаў выклікалі паўстанне шляхты. У *сакавіку 1716 г.* была арганізавана Генеральная канфедэрацыя ВКЛ у Вільні. Яе прыхільнікі паўсюль змагаліся з саксонскімі войскамі. Аўгуст II быў вымушаны саступіць і пагадзіцца на расійскае пасрэдніцтва ў прымірэнні з канфедэратамі.

«Нямы» сойм 1717 г. Дамова паміж шляхтай і каралём зацвярджалася на сойме **1717 г.**, які працягваўся ўсяго адзін дзень. Тэкст дагавора быў прыняты як соймавая пастанова моўчкі, без абмеркавання. У сувязі з забаронай выкарыстоўваць права ліберум вета і праводзіць дыскусіі сойм і атрымаў назву «нямы».

Пастановы «Нямога сойма» абмяжоўвалі правы караля, магнатаў і шляхты. Манарху забаранялася раздаваць пасады і землі замежнікам. Да таго ж у Рэчы Паспалітай не мелі права знаходзіцца саксонскія войскі і чыноўнікі. Сойм быў павінен склікацца кожныя два гады, незалежна ад каралеўскай волі.

Усе пастановы супраць магнатаў абмяжоўвалі ў першую чаргу паўнамоцтвы гетманаў. Менавіта гэтыя ўраднікі найбольш уплывалі на ўнутраную палітыку Рэчы Паспалітай падчас Паўночнай вайны.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Сойм забараніў гетманам свабодна размяркоўваць падаткі на войска і выкарыстоўваць жаўнераў у прыватных мэтах. Ім не дазвалялася кантактаваць з урадамі замежных краін. У сваю чаргу, шляхце забаранялася самастойна склікаць соймікі. Былі праведзены таксама фінансавая і вайсковая рэформы.



▲ Вайсковая рэформа 1717 г.

? *Растлумачце, як былі звязаны паміж сабой вайсковая і фінансавая рэформы.*

Пастановы «Нямога сойма» спынілі ўзброеныя канфлікты ўнутры дзяржавы і ўсталявалі мір. Аднак іх гістарычнае значэнне было непараўнальна большым. Яны амаль што на пяцьдзясят гадоў вызначылі асаблівасці дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. У яго аснову быў пакладзены прынцып раўнавагі галоўных палітычных сіл: караля, магнатаў і шляхты. Але на справе праведзеныя пераўтварэнні аслабілі пазіцыі ўсіх гэтых сіл. У выніку палітычную сістэму Рэчы Паспалітай ахапіў крызіс. Усё гэта здолела выкарыстаць у сваіх інтарэсах Расія.

Нарастанне расійскага ўплыву ў Рэчы Паспалітай. Расія была зацікаўлена ў аслабленні Рэчы Паспалітай і пачала актыўна ўмешвацца ва ўнутрыпалітычнае жыццё дзяржавы. Выбары наступнага караля ў Рэчы Паспалітай у 1733 г. прывялі да канфлікту паміж еўрапейскімі дзяржавамі. Францыя, Іспанія і Сардзінія падтрымлівалі Станіслава Ляшчынскага. Расія і Аўстрыя выступалі за кандыдатуру Фрыдрыха Аўгуста Саксонскага, сына Аўгуста II. Увядзенне расійскіх войскаў у Рэч

Як вы лічыце, чаму Расія імкнулася ўзмацніць свой уплыў у Рэчы Паспалітай?

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Аўгуст III. Мастак *Л. дэ Сільвестр*. XVIII ст.

Паспалітую забяспечыла выбар яго каралём. Ён прыняў троннае імя Аўгуста III (гады кіравання *1733—1763*).

У сваёй палітыцы Расія стала абапірацца на магнацкую групоўку, якая атрымала назву «Фамілія». Яе ўзначальвалі прадстаўнікі роду Чартарыйскіх і іх сваякі Панятоўскія. «Фамілія» неўзабаве стала і прыдворнай групоўкай пры каралю Аўгусце III.



▲ Міхал Чартарыйскі. Мастак *Л. дэ Сільвестр*. XVIII ст.



Міхал Чартарыйскі (1696—1775) — канцлер ВКЛ. Адзін з арганізатараў і лідараў групоўкі «Фамілія». Выступаў за рэформу дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай пры расійскай падтрымцы. Лічылася, што ён ведаў імёны і прозвішчы ста тысяч шляхціцаў, іх інтарэсы і памкненні. Каралю ён рэкамендаваў прызначаць на дзяржаўныя пасады не заможных, а здольных людзей. Меў вялікую эрудыцыю, карыстаўся павагай сучаснікаў. Расійскі пасол пасля яго смерці зазначыў, што «ў Варшаве не засталося нікога, перад кім можна зняць капялюш».

Пра якія асабістыя якасці М. Чартарыйскага сведчыць выказванне расійскага пасла?

Крызіс выканаўчай, заканадаўчай і судовай улады. Падзеі Паўночнай вайны прывялі да таго, што соймы даволі доўгі час не склікаліся. Таму пытанні падаткаў, найму і ўтрымання войска самастойна вырашалі павятовыя соймікі. У выніку значная частка грошай заставалася ў павеце, а дзяржаўны скарб не папаўняўся.

Рашэнні «Нямога» сойма змянілі сітуацыю. Самастойнасць павятовых соймікаў была абмежавана. Шляхта страціла магчымасць прымаць патрэбныя ёй рашэнні. Таму зрыў соймікаў стаў звычайнай справай.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Група апазіцыі на сойміку. Мастак *Я. П. Норблін.* Пачатак XIX ст.

? *На малюнку частка шляхты пратэстуе супраць рашэння сойміка. Як вы думаеце, чаго магло тычыцца гэтае рашэнне?*

Апісанне мсціслаўскага пасольскага сойміка 1732 г.

Пан Лявон Ільініч, гродскі пісар з партыі Валовіча, маючы ў руках старую… сякерку тонкай работы, хацеў ёю ўдарыць у лоб падстарасту Шпілеўскаму, але той уцёк, а Станіслаў Валовіч ускочыў на стол і выхапіў шаблю; тады абедзве партыі не ленаваліся, асабліва калі два браты Завістоўскія перакулілі стол на партыю Валовічаў. Секаніна працягвалася каля гадзіны. (Цыт. па: *Мальдзіс А.* Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. Мінск, 2001).

Карыстаючыся тэкстам дакумента і матэрыялам параграфа, растлумачце, якім чынам шляхта вырашала спрэчныя пытанні на соймініках у XVIII ст. Чым гэта было абумоўлена?

Каралі Аўгуст II і Аўгуст III шмат часу аддавалі справам у сваёй роднай Саксоніі. Асабліва гэта тычылася Аўгуста III, які наогул

Правообладатель Издательский центр БГУ

з'яўляўся ў Рэчы Паспалітай толькі на соймы. Доўгая адсутнасць караля ў дзяржаве і барацьба магнацкіх груповак прывялі да крызісу выканаўчай і заканадаўчай улады. Так, у панаванне Аўгуста III з 15 соймаў безвынікова сваю працу скончылі 14. Рэгулярныя зрывы соймаў не дазволілі правесці рэформы войска, фінансавай і судовай сістэм.

Армія Рэчы Паспалітай моцна саступала арміям суседніх дзяржаў. Яны, наадварот, значна павялічылі свае арміі. Для Рэчы Паспалітай любы канфлікт з суседзямі станавіўся небяспечным. У такіх абставінах набыла папулярнасць ідэя павелічэння войска. Аднак ажыццявіць яе было немагчыма, бо шляхта не жадала ўводзіць новыя падаткі на ўтрыманне арміі.

Крызіс ахапіў і судовую сістэму Рэчы Паспалітай. У паветах не хапала суддзяў, таму судовыя справы разглядаліся вельмі доўга. Гэта вымушала шляхту адразу звяртацца ў Галоўны Трыбунал ВКЛ. Да таго ж на яго пасяджэннях былі вымушаны разглядаць і справы, рашэнні па якіх звычайна выносіў сойм. Зараз гэта стала немагчыма, бо, як ужо згадвалася раней, амаль усе соймы зрываліся. Гэта яшчэ больш паглыбляла крызіс дзяржаўнай улады ў Рэчы Паспалітай.

Калі і з якой мэтай быў створаны Галоўны Трыбунал ВКЛ?

Паўночная вайна аслабіла цэнтральную ўладу і ўзмацніла ўплыў магнацкіх груповак у дзяржаве. Барацьба паміж імі прывяла да крызісу заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады. Пазіцыі Рэчы Паспалітай на міжнароднай арэне значна аслаблі. У яе справы пачалі ўмешвацца замежныя краіны. Расія з 1730-х гг. стала адыгрываць вырашальную ролю нават ва ўнутранай палітыцы Рэчы Паспалітай.

1. Знайдзіце ў тэксце параграфа пацвярджэнні выснове: «У першай палове XVIII ст. пачаўся крызіс улады ў Рэчы Паспалітай».
2. Назавіце прычыны ўзнікнення Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ 1716 г. Як гэтыя прычыны характарызуюць стасункі паміж шляхтай і каралём?
3. Якія рашэнні былі прыняты соймам 1717 г.? Чаму ён атрымаў назву «Нямы»?

Правообладатель Издательский центр БГУ

4. Як пастановы «Нямога» сойма 1717 г. паўплывалі на далейшае развіццё Рэчы Паспалітай?

5*. Падзяліцеся ў класе на прыхільнікаў караля і магнацкай групоўкі. Паспрабуйце пераканаць сваіх праціўнікаў у слушнасці сваёй пазіцыі па пытаннях падаткаў, павелічэння войска, змен у працы судоў.

§ 22. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў першай палове XVIII ст.

Якія падзеі пачатку XVIII ст. паўплывалі на развіццё беларускіх зямель?

Якім чынам адраджалася гаспадарка? Чым мануфактуры на беларускіх землях адрозніваліся ад заходнееўрапейскіх?

Гарады і гандаль у першай палове XVIII ст. Ад ваенных канфліктаў пачатку XVIII ст. у Рэчы Паспалітай больш за ўсё пацярпелі беларускія землі. Да ваенных спусташэнняў дадаліся і іншыя нягоды.



▲ Змены колькасці насельніцтва беларускіх зямель у сярэдзіне XVII — першай палове XVIII ст., млн чалавек

З Магілёўскай хронікі

1706 г. У гэтым годзе была лютая зіма, стаяла доўга, снягі былі невыносныя і нечувана вялікія, што не толькі звяр'ё, птушкі, але і людзі на дарогах замярзалі. І была дарагоўля збожжа і розных харчовых тавараў.

Пры дапамозе дыяграмы, урыўка з дакумента і раней атрыманых ведаў пракаментуйце прычыны і змены колькасці насельніцтва ў 1648—1721 гг.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Зноў паўстала неабходнасць адраджэння гаспадаркі. Ажыўленню рамяства і гандлю спрыяў масавы пераезд яўрэяў-рамеснікаў з польскіх і ўкраінскіх зямель. Большасць гарадоў і мястэчак атрымалі магдэбургскае права. Аднак правілы рамесных цэхаў замаруджвалі развіццё рамяства і рост гарадоў. Увесь час павялічваліся падаткі. Паглыбляліся супярэчнасці паміж магістратамі, кіраўнікамі цэхаў і простымі мяшчанамі. Апошнія амаль не маглі ўплываць на працу магістрата. Пасады ў ім сталі перадавацца па спадчыне ў вузкім коле сямей. Часцей за ўсё гэта былі сем'і купцоў і цэхмайстраў — каталікоў ці ўніятаў. У выніку адбываліся бясконцыя канфлікты паміж гараджанамі і ўладамі.

Важным кірункам знешняга гандлю заставаліся пастаўкі збожжа ў краіны Заходняй Еўропы. Попыт на яго ўзрос амаль у пяць разоў.



▲ «Гандаль збожжам». Заходнееўрапейскія купцы кланяюцца гандлярам з Рэчы Паспалітай. На заднім плане паказаны баржы, нагружаныя збожжам

? *Як вы думаеце, хто быў больш зацікаўлены ў пастаўках збожжа: заходнія еўрапейцы ці мясцовыя жыхары? Як мастак паказаў іх стасункі?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Аднак у знешнім гандлі адбыліся і значныя змены. Здабыццё Расіяй Балтыйскага ўзбярэжжа дазволіла ёй увозіць тавары наўпрост: праз Рыгу і Санкт-Пецярбург. Таму беларускія купцы ўжо не выконвалі ролі пасрэднікаў паміж Заходняй Еўропай і Расіяй. Важную ролю ў эканоміцы беларускіх зямель стаў адыгрываць гандаль з Левабярэжнай Украінай і гарадамі Паўночна-Заходняй Расіі.

З дапамогай карты ў атласе вызначце, якія тавары ўвозіліся, а якія вывозіліся з беларускіх зямель.

Сярод гандляроў працягвала паглыбляцца спецыялізацыя. Так, існавалі асобныя групы гандляроў збожжам, соллю, мясам, тканінамі і іншымі таварамі.

Гандаль у мястэчках, як і ў ранейшыя часы, пераважна вёўся ў форме штотыднёвых таргоў і вялікіх кірмашоў. Самымі буйны́мі ў гэты перыяд былі кірмашы ў Зэльве, Нясвіжы, Міры. На кірмашах і ў крамах усё больш гандлявалі не мясцовымі, а прывазнымі таварамі. Сярод іх былі не толькі тканіны, металы, а і гарбата, кава, спецыі.

З'яўленне мануфактурнай вытворчасці. Новай з'явай у эканоміцы беларускіх зямель было нараджэнне мануфактурнай вытворчасці.

Што такое мануфактура?

Нізкія прыбыткі ад сельскай гаспадаркі вымушалі землеўласнікаў шукаць новыя шляхі павелічэння даходаў. Адным са спосабаў стала стварэнне ў магнацкіх маёнтках **мануфактур**. Ім папярэднічалі малыя прадпрыемствы прамысловага характару, такія як бровары, млыны, цагельні, паперні і інш. Яны дзейнічалі і ў гарадах, і ў сельскай мясцовасці ўжо з XVI ст. Мануфактуры сталі ствараць у прыватных мястэчках, каб абысці цэхавыя абмежаванні. Ініцыятарам з'яўлення першых вотчынных мануфактур у 1720—1730-я гг. стала Ганна Кацярына Радзівіл.

Знайдзіце на карце ў атласе першыя вотчынныя мануфактуры.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Г. К. Радзівіл. *Невядомы мастак*. XVIII ст.

Ганна Кацярына Радзівіл з роду Сангушкаў (1676—1746) у гісторыі вядомая як «Чорная дама». Засталася ўдавою з дзецьмі. Маёнткі яе былі разрабаваныя. Для аднаўлення дабрабыту сям'і яна пачала актыўныя гаспадарчыя пераўтварэнні. Па яе загадзе будаваліся грэблі, масты, дарогі, млыны, корчмы, завозіліся новыя пароды жывёлы. На мануфактурах выраблялі посуд, гадзіннікі, карэты, гузікі, парасоны, рэчы з каштоўных камянёў.

Першымі ёю былі заснаваны шкляныя мануфактуры (гуты), якія працавалі да сярэдзіны XIX ст. Для іх арганізацыі яна запрасіла майстроў з Германіі. Яны былі павінны наладзіць вытворчасць і навучаць мясцовых майстроў. Апошніх Г. К. Радзівіл нярэдка адбірала са сваіх прыгонных сялян. Танная сыравіна і высокі кошт на прадукцыю забяспечылі высокія прыбыткі іх уладальніцы.





▲ Вырабы Урэцкай і Свержанскай мануфактур

Прадукцыя шкляной мануфактуры ў Налібоках (Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці) была разлічана на розныя катэгорыі пакупнікоў. Тут выраблялiся бутэлькі, посуд, аконнае шкло, даступнае нават сялянам. Аднак славу Налібокам прынёс выраб белага і каляровага (рубінавага) посуду, які багата аздабляўся гравіроўкай, пазалотаю і малюнкамі.

Першым і самым буйны́м прадпрыемствам у Рэчы Паспалітай па вырабе люстэркаў і крышталю была гута ва Урэччы (Любанскі раён Мінскай вобласці). У 1730-я гг. у радзівілаўскіх уладаннях сталі дзейнічаць суконныя мануфактуры ў Слуцку і Белай (цяпер тэрыторыя Польшчы), фаянсавая ў Свержані (Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці).

Правообладатель Издательский центр БГУ



▶ Бітва пад Лоевам. Шпалера. Карэліцкая мануфактура

Як вы лічыце, чаму менавіта гэтая падзея была выбрана для ўшанавання славы роду Радзівілаў?

Прадукцыя Карэліцкай шпалернай мануфактуры прызначалася выключна для аздаблення парадных залаў палацаў Радзівілаў. На вырабах прадпрыемства адлюстроўваліся гістарычныя падзеі, якія праслаўлялі род Радзівілаў.

Сельская гаспадарка. Формы сацыяльнай барацьбы сялянства. Аднаўленне сельскай гаспадаркі ішло некалькімі шляхамі. Найперш землеўласнікі імкнуліся павялічыць сялянскія павіннасці. У маёнтках Заходняй і Цэнтральнай Беларусі шляхта старалася захаваць фальваркава-паншчынную сістэму. Тут было страчана меней насельніцтва, існавалі зручныя гандлёвыя шляхі ў Заходнюю Еўропу. На ўсходзе, дзе Паўночная вайна прынесла найбольшыя разбурэнні, сяляне пераводзіліся выключна на чынш. Увядзенне чыншу на беларускіх землях пачалося з каралеўскіх *эканомій*. Гэта давала магчымасць зарабіць дадатковыя сродкі для манарха. Сяляне на захадзе Беларусі давалі прадукты, працавалі на панскай зямлі і плацілі 150 грошаў з валокі. На ўсходзе яны плацілі толькі чынш — 480 грошаў.

Пусткі сталі абжывацца перасяленцамі. У вёсках выросла колькасць двароў. З'явіліся новыя населеныя пункты. Аднак перавод сялян на чынш меў часовы характар. З аднаўленнем гаспадаркі сяляне зноў пераводзіліся на паншчыну. Да сярэдзіны XVIII ст. паншчына дасягнула 12 дзён на тыдзень з валокі (з гаспадаркі). У дадатак

Правообладатель Издательский центр БГУ

да чыншу і паншчыны аднавіліся і выплаты прадуктамі. Разам з выкананнем розных павіннасцяў сяляне плацілі да дзясятка розных падаткаў.

Якія формы пратэсту сялян вы можаце назваць?

Падатковы ціск прывёў да росту сялянскіх выступленняў. У першай палове XVIII ст. значныя сялянскія хваляванні адбыліся ў Гарадзенскай эканоміі, Глускім графстве Радзівілаў, Гомельскім старастве. Задушыць іх атрымалася толькі з дапамогай рэгулярнага войска. Вясной *1740 г.* супраць злоўжыванняў арандатараў маёнткаў паўсталі сяляне Крычаўскага староства (Магілёўшчына). Іх узначаліў войт вёскі Селішча ***Васіль Вашчыла***. Разам са сваімі паплечнікамі ён сам кіраваў старостам і прызначаў новых арандатараў. Паўстанцы спадзяваліся на «добрага пана» і справядлівасць. Яны ж працягвалі выплачваць падаткі і грошы за арэнду трымальніку староства Гераніму Фларыяну Радзівілу. Аднак у пачатку *1744 г.* войска Радзівіла ўвайшло ў Крычаўскае староства і разбіла паўстанцаў. Шмат з іх загінула, частка трапіла ў палон, а кіраўнікі паўстання былі асуджаны на смерць. Сам В. Вашчыла ўцёк за мяжу.

Як вы лічыце, што павінен быў зрабіць Г. Ф. Радзівіл, каб пазбегнуць паўстання?

Паўстанне і небяспека новых выступленняў прымусілі Радзівіла адмовіцца ад здачы староства ў арэнду. Некаторыя павіннасці былі заменены на грашовыя выплаты, ліквідаваліся абмежаванні на сялянскі гандаль.

105—106

Да сярэдзіны XVIII ст. краіна пераадолела наступствы ваенных разбурэнняў. Былі адноўлены гарады і сельская гаспадарка. Актывізаваўся гандаль, змяніўся этнічны і канфесійны склад гарадскога насельніцтва. Новай рысай прамысловага развіцця стала заснаванне вотчынных мануфактур.

1. Якія мерапрыемствы праводзіліся для эканамічнага аднаўлення краіны? Чым цэхі перашкаджалі развіццю гарадоў?
2. Якія катэгорыі насельніцтва і чаму былі зацікаўлены ў з'яўленні мануфактур?

Правообладатель Издательский центр БГУ

3. Вызначце прычыны ўзрастання колькасці сялянскіх пратэстаў у другой палове XVII — пачатку XVIII ст.

4. Складзіце апавяданне пра Крычаўскае паўстанне па наступным плане: 1) прычыны; 2) мэты ўдзельнікаў; 3) час правядзення; 4) адмоўныя і станоўчыя вынікі паўстання. *З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі распавядзіце, як сёння ўшаноўваецца памяць паўстанцаў.

5*. Карыстаючыся дадатковымі сродкамі інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне пра Ганну Кацярыну Радзівіл ці яе праекты (адбудова Міра і Нясвіжа, стварэнне карцінных галерэй, дзейнасць мануфактур).

§ 23. Адукацыя, навука і грамадска-палітычная думка



Якія хрысціянскія канфесіі сталі найбольш уплывовымі на беларускіх землях да сярэдзіны XVII ст.?



Які ўклад у развіццё еўрапейскай культуры і навукі ўнеслі ўраджэнцы беларускіх зямель?

Развіццё адукацыі. У другой палове XVII ст. адукацыя захавала свой рэлігійны шматканфесійны характар. Аднак нарастанне рэлігійнай нецярпімасці прывяло да скарачэння колькасці некаталіцкіх школ. Пратэстанты маглі атрымаць адукацыю пераважна ў кальвінісцкіх школах і гімназіях, колькасць якіх да канца стагоддзя таксама скарацілася амаль утрая.

Як вы думаеце, чым было выклікана скарачэнне колькасці пратэстанцкіх школ?

У выніку школьная адукацыя да сярэдзіны XVIII ст. усё больш канцэнтравалася ў руках розных манаскіх ордэнаў (езуітаў, дамініканцаў, кармелітаў, піяраў, базыльянаў).

Папулярнасць езуіцкіх навучальных устаноў спрыяла перайманню іх падыходаў да навучання настаўнікамі іншых школ. Зазвычай педагогі стваралі для кожнай школы свае падручнікі і дапаможнікі. Хлопчыкі пачыналі займацца з 8 гадоў і атрымлівалі пачатковыя веды па гуманітарных навуках, багаслоўі, старажытных мовах, рымскім праве. У пратэстанцкіх школах навучанне вялося на польскай мове, у каталіцкіх — па-лацінску. У базыльянскіх школах абавязкова

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ На ўроку. Гравюра з «Граматыкі» М. Сматрыцкага

вывучалі «простую мову» (так тады называлі беларускую). Навучанне суправаджалася штотыднёвымі абмеркаваннямі-спрэчкамі, складаннем вершаваных твораў у гонар апекуноў школ, тэатральнымі паказамі. Праз 6—9 гадоў падлеткі маглі працягнуць вучобу ў замежных універсітэтах ці ў Віленскай акадэміі.

У краіне працягвалі дзейнічаць і праваслаўныя брацкія школы. Большасць вучняў там паходзіла з мяшчан і дробнай шляхты. У брацкіх школах больш увагі надавалася вывучэнню царкоўнаславянскай мовы, музыкі, астраноміі і матэматыкі.

? **На падставе гравюры і тэксту параграфа складзіце апавяданне пра ўрок у школе XVII ст.*

Са статута Слуцкай гімназіі

Кожны дзень дзяжурны за 15 хвілін да абеду і вячэры павінен у гасподзе [карчме] стол накрыць, ваду прыгатаваць, а потым са стала прыбраць.

Калі хто спазняецца, ні гаспадар, ні кампанія не павінны яго чакаць.

З панядзелка па чацвер на абед даваць 3 стравы: дзве мясныя, адну з гародніны з мясам. На вячэру дзве мясныя і гародніна з мясам.

У сераду, пятніцу, суботу на абед даваць 3 стравы: дзве з гародніны, адну рыбную ці мясную. На вячэру адну з гародніны, сыр і малако.

Хлеба даваць столькі, колькі той, хто сядзіць за сталом, з'есці можа, хлеб павінен быць свежы, а не чэрствы.

Параўнайце сучасную ежу і тагачасную. Ці можна харчаванне тых часоў назваць здаровым? Якія з прыведзеных правілаў выкарыстоўваюцца і ў сучаснай школе?

Правообладатель Издательский центр БГУ

З 1720-х гг. на беларускіх землях пашырыліся школы манаскага ордэна *піяраў*. Сваёй асноўнай задачай яны бачылі навучанне і выхаванне моладзі, а не місіянерскую дзейнасць. Таму піяры надавалі шмат увагі мясцовым мовам і фізічнаму выхаванню.

Пакажыце месцы знаходжання навучальных устаноў на карце ў атласе. Прывядзіце доказы таго, што школьная адукацыя сканцэнтравалася ў руках Каталіцкага касцёла.

Пачаткі навуковых ведаў. На беларускіх землях таго часу пераважна развіваліся філасофскія, гістарычныя і палітычныя навукі. У 1650—1669 гг. выкладчык Віленскай акадэміі *Альберт Каяловіч* выдаў на лацінскай мове ў двух тамах «Гісторыю Літвы». У яго працах упершыню сістэматызавалася гісторыя Вялікага Княства Літоўскага і асобных шляхецкіх родаў.

Магчымасці для развіцця прыродазнаўства, дакладных навук былі вельмі абмежаваныя. Навука развівалася дзякуючы захопленасці асобных вучоных, у тым ліку ўраджэнцаў беларускіх зямель. Сярод іх можна адзначыць ваеннага інжынера ***Казіміра Семяновіча*** (1600 — каля 1651). Пасля сканчэння Віленскай акадэміі ён служыў у войску ВКЛ. Па загадзе караля таленавіты інжынер быў адпраўлены ў Нідэрланды для далейшага навучання. На падставе матэматычных законаў і ведаў, атрыманых вопытным шляхам, ён стварыў кнігу «Вялікае мастацтва артылерыі». У ёй упершыню ў свеце быў выкладзены праект шматступеньчатай ракеты. Выдадзеная ў 1650 г. у Амстэрдаме кніга на працягу двух стагоддзяў служыла падручнікам па артылерыі для ўсёй Еўропы. Пяру Юзафа Нарановіча-Наронскага (паміж 1610 і 1616—1678) належалі даследаванні па матэматыцы, оптыцы, геаметрыі і гісторыі. Таленавіты інжынер і картограф, ён стварыў планы гарадоў і ўладанняў Радзівілаў, распрацаваў праекты злучэння рэк каналамі.



▲ Артылерыйскія снарады. Гравюра з кнігі К. Семяновіча

Правообладатель Издательский центр БГУ

Пашырэнню навуковых ведаў спрыяла кнігавыдавецкая і асветніцкая дзейнасць ***Ілыі Капіевіча*** (1651—1714). Ён быў навучэнцам і выкладчыкам пратэстанцкай Слуцкай гімназіі, а ў канцы XVII ст. пераехаў у Амстэрдам. Там Капіевіч пачаў выдаваць падручнікі на рускай мове. Ім быў распрацаваны новы шрыфт, які стаў асновай усіх сучасных кірылічных шрыфтоў. Па запрашэнні Пятра I вучоны пераехаў у Маскву, дзе пераклаў і выдаў больш за 20 падручнікаў па граматыцы і іншых прадметах. З дапамогай яго падручнікаў падданыя Расійскай дзяржавы змаглі пазнаёміцца са здабыткамі еўрапейскай навукі і культуры.

Грамадска-палітычная думка. На грамадска-палітычную і прававую думку ў той час моцна ўплывалі ідэі сарматызму. Палітычным ідэалам шляхціцаў-сарматаў стаў дэвіз: «Нічога новага!» Прыхільнікі сарматызму лічылі, што дзяржаўны лад патрабаваў не рэформаў, а толькі ўдасканалення. У літаратуры ўсхваляліся даўнія правы і звычаі, абгрунтоўвалася вяршэнства права ліберум вета. Шляхта была ўпэўнена ў сваёй культурнай, палітычнай і нацыянальнай выключнасці. Усё часцей сустракалася непрыязнае стаўленне да прадстаўнікоў іншых веравызнанняў і народаў.



◀ Шляхціц-сармат

З «Сармацкіх помнікаў» С. Стаповольскага (1655)

Нашы старажытныя роды згадваюць, быццам яны над светам панавалі раней за рымлян і нават саміх персаў... [Яны ўспамінаюць гэта] асабліва цяпер, калі нас казацкі бунт знішчыў і масквіцін [расіянін] трымае за фалды [за край адзення].

Чым асабліва ганарыліся шляхціцы?

Правообладатель Издательский центр БГУ

З канца XVII ст. у грамадска-палітычнай і навуковай думцы з'явіліся ідэі, што ісціна патрабуе доказаў, а не веры. Найбольш яскрава такія погляды выявіліся ў філасофскай сістэме ***Казіміра Лышчынскага*** (1634—1689).



▲ Марка з нагоды 375-годдзя з дня нараджэння К. Лышчынскага

Лышчынскі навучаўся ў езуіцкім калегіуме і сам доўгі час быў выкладчыкам у школах гэтага ордэна. Пазней у сваім маёнтку ён заснаваў школу. Там дзеці шляхты і сялян вучыліся пісьму, лічэнню, замежным мовам і асновам навук. У выкладанні вучоны свядома адмовіўся ад навучання па «Катэхізісе» і даваў дзецям веды пра прыроду і законы, па якіх яна развіваецца. Вынікам яго філасофскіх пошукаў стаў трактат «Аб неіснаванні Бога». Лышчынскі разглядаў рэлігію як інструмент, які дазваляе трымаць чалавека ў страху, а Бога лічыў прыдумкай. Філосаф сцвярджаў, што ў аснове ўсяго ляжыць не Боская воля, а законы прыроды. Рукапіс кнігі быў выкрадзены і перададзены царкоўнаму суду. Той абвясціў Лышчынскага бязбожнікам і прысудзіў да спалення. Мысліцель быў пакараны смерцю.

Такім чынам, у другой палове XVII — першай палове XVIII ст. у адукацыі замацавалася першынство Каталіцкага касцёла. Закрыццё школ іншых канфесій прыводзіла да падзення адукаванасці насельніцтва, замацавання рэлігійнай нецярпімасці. У той жа час ураджэнцы беларускіх зямель зрабілі шэраг вынаходстваў, якія дагэтуль выкарыстоўваюцца ў навуцы і паўсядзённым жыцці.

1. Пералічыце навучальныя ўстановы, якія існавалі ў гэты перыяд, і ахарактарызуйце іх дзейнасць.
2. Як Каталіцкі касцёл паўплываў на развіццё навукі і культуры беларускіх зямель?
3. Назавіце характэрныя рысы развіцця навукі ў другой палове XVII — першай палове XVIII ст. Якімі былі асноўныя даследчыцкія дасягненні?
4. Паразважайце, як маглі сучаснікі паставіцца да ідэі К. Лышчынскага: «Чалавек — творца Бога, а Бог — стварэнне чалавека…» Чаму К. Лышчынскага называюць беларускім Джардана Бруна?

5*. Арганізуйце абмеркаванне на ўзор тагачаснай школы. Выберыце тэму і падзяліцеся на 2 каманды. Адна павінна абараняць свой пункт гледжання, а другая — даказваць яго памылковасць.

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 24. Літаратура і мастацтва

Што такое барока? Якія жанры літаратуры развіваліся ў XVI — першай палове XVII ст.?

Як ідэі барока былі адлюстраваны ў творчасці дзеячаў літаратуры, мастацтва і музыкі?

Літаратура. У другой палове XVII — першай палове XVIII ст. шматмоўная літаратура беларускіх зямель развівалася пад уплывам ідэй барока. Яна стала сапраўдным люстэркам тагачаснага грамадства, бо ў ёй фіксаваліся ўсе праблемы, што хвалявалі жыхароў ВКЛ. Аднак польская мова паступова выцясняла іншыя мовы з усіх сфер жыцця. Ёю пачалі карыстацца нават праваслаўныя манахі. Беларуская мова стала ўспрымацца як мова «простая, грубая», на якой размаўляюць выключна сяляне і мяшчане. Таму ў 1696 г. сойм прыняў пастанову: «У справах і пасольствах Рэчы Паспалітай мы... абяцаем выдаваць усе лісты, справы толькі на мове польскай і лацінскай, а не на іншай».

Якія падзеі маглі ўплываць на змест твораў?

Якая мова з'яўлялася афіцыйнай у ВКЛ да гэтага часу?

Выкладанне старажытнай літаратуры, навучанне красамоўству ў школах і калегіумах спрыялі імклівaму развіццю літаратуры. Ствараліся панегірычныя творы, з'явілася гумарыстычная паэзія. Нярэдкай з'явай стала вядзенне сямейных і манастырскіх хронік, гарадскіх летапісаў, дзённікаў. Найбольш значныя падзеі часоў панавання Уладзіслава IV і Яна Казіміра Вазаў адлюстраваны ў «Дыярыушы [дзённіку] пра падзеі ў Польшчы», які стварыў канцлер ВКЛ Альбрэхт Станіслаў Радзівіл. «Віцебская хроніка», «Магілёўская хроніка» ўсебакова асвятлялі жыццё названых гарадоў з сярэдзіны XVI ст. Для іх было характэрна спалучэнне патрыятызму, цікавасці да гістарычнага мінулага з пільнай увагай да рэальнага жыцця.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Ураджэнцы Беларусі значна паўплывалі на развіццё літаратуры і асветы суседніх краін. Як асветнік, філосаф, літаратар, заснавальнік расійскага тэатра ўвайшоў у гісторыю ***Сімяон Полацкі*** (1629—1680). Пасля сканчэння праваслаўнага калегіума ў Кіеве і Віленскай акадэміі ён стаў манахам-базыльянінам. Вярнуўшыся ў Полацк, стаў выкладаць у мясцовай брацкай школе. У 1656 г. разам са сваімі вучнямі ён вітаў уезд цара Аляксея Міхайлавіча ў Полацк.



▲ Сімяон Полацкі

Чаму, на вашу думку, Сімяон Полацкі вырашыў вітаць расійскага цара?

З верша «Сем вызваленых навук»

Граматы хочаш добра сэнс пазнаці —
Мудрасці браму зможаш расчыняці.
Будзь жа, як страус, што не зводзіць вочы
З яек уласных, з кнігай так ахвочы.

Якія пажаданні вучню выказаны ў вершы? З выкарыстаннем дадатковых крыніц знайдзіце працяг верша і даведайцеся, пра якія навукі распавядае аўтар.

Пасля пераезду ў Маскву Сімяон Полацкі стварыў там першую школу на ўзор калегіума і друкарню. Як выхавацель царскіх дзяцей ён стаў адной з найбольш уплывовых асоб пры двары. Пасля сябе ён пакінуў вялізную філасофскую і літаратурную спадчыну. Многія з яго твораў напісаны ў займальнай форме.

Рукапісныя вершаваныя зборнікі Сімяона Полацкага «Сад шматколерны» і «Рыфмалагіён, альбо Вершаслоў» з'яўляюцца адным



▲ Верш Сімяона Полацкага, напісаны ў форме сэрца

Правообладатель Издательский центр БГУ

з лепшых прыкладаў паэзіі барока. Гэтыя рукапісы ўтрымліваюць па 1200 старонак.

Росквіт барока ў архітэктуры і мастацтве. 1650—1730-я гг. сталі часам панавання ў архітэктуры і мастацтве сталага барока. Касцёлы з дзвюма вежамі-званіцамі набылі вытанчаны, узнёслы выгляд. У такім стылі былі пабудаваны кляштары ў Гародні, францысканскі касцёл у Пінску і інш. У 1730-я гг. *Ян Крыштаф Глаўбіц* стаў пачынальнікам своеасаблівага стылю ў царкоўным дойлідстве — *віленскага барока*. Яму былі ўласцівы лёгкасць і ажурнасць пабудоў, пышнае аздабленне фасадаў. У гэтым стылі былі перабудаваны Сафійскі сабор у Полацку, касцёл у Сталовічах (Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці).

Успомніце характэрныя рысы беларускага барока.



Сабор Святой Сафіі ў Полацку

Вызначце з дапамогай фотаздымка характэрныя рысы віленскага барока.

Рысы заходнееўрапейскага барока пераплыліся з мясцовымі і візантыйскімі традыцыямі і ў аздабленні праваслаўных і ўніяцкіх храмаў. Гэта надало ім непаўторны каларыт, характэрны толькі для беларускіх зямель. У такім стылі былі пабудаваны Мікалаеўская і Спаская цэрквы ў Магілёве, манастыр у Жыровічах (Слонімскі раён Гродзенскай вобласці).

Правообладатель Издательский центр БГУ

▶ Ратуша ў Магілёве



Пышнасць стала панаваць і ў свецкім дойлідстве. Замкі паступова ператвараліся ў багата аздобленыя мураваныя палацы. Пасля войнаў так былі перабудаваны замкі ў Гародні, Нясвіжскі палац. Рынкавыя плошчы гарадоў і мястэчак упрыгожылі ратушы, гандлёвыя рады, мураваныя дамы мяшчан. Прыкладам могуць быць дом на рынку ў Нясвіжы, ратуша ў Магілёве.

▶ Роспіс касцёла ў Нясвіжы. Сярэдзіна XVII ст.



Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Святы Іаакім. *Невядомы скульптар.* XVII ст.

Для аздаблення памяшканняў сталі актыўна выкарыстоўваць ляпніну, разьбу па дрэве, роспіс, пазалоту, рознакаляровы мармур. Усё часцей сустракаліся ўсходнія (турэцкія) матывы. У сярэдзіне XVIII ст. у афармленне ўнутраных памяшканняў пранікае стыль *ракако*. Архітэктары і мастакі сталі адмаўляцца ад прамых ліній. Яны скруглялі вуглы, абвівалі калоны кветкамі, ствараліі вытанчаныя арнаменты і мэблю.

Першая палова XVIII ст. стала часам уздыму і для беларускага іканапісу. Свайго росквіту дасягнула драўляная скульптура. Ёю багата аздабляліся храмы ўсіх канфесій. Як і раней, карыстаўся папулярнасцю сармацкі (шляхецкі) партрэт, на якім чалавек звычайна паказваўся ў раскошным строі, з усімі атрыбутамі пасады, што ён займаў.

Тэатр і музыка. Працягвала развівацца і музыка. Як і ўсёй культуры беларускіх зямель эпохі барока, ёй было ўласціва сумяшчэнне заходніх і ўсходніх традыцый. Найбольш яскрава гэта выявілася ў кантах — шматгалосых спевах. Спачатку іх мелодыі запісваліся «крукамі» ў спецыяльныя зборнікі «Ірмалоі».

Побытавыя канты захаваліся ў знакамітым «Полацкім сшытку», запісаным ужо круглымі (італьянскімі) нотамі. Службы ў касцёлах акрамя спеваў пад аркестры езуіцкіх музычных школ (бурсаў)



◀ Запіс спеваў крукамі

Правообладатель Издательский центр БГУ

суправаджаліся арганнай музыкай. Музыка гучала падчас святаў і банкетаў, танцаў. З ёю ішлі ў ваенныя выправы ўзброеныя атрады. Пры магнацкіх дварах ствараліся аркестры і капэлы, якімі нярэдка кіравалі замежныя музыканты. Сялянам жа былі мілейшыя дуда, жалейка ды скрыпка.

Усё больш людзей бавілі час, назіраючы і ўдзельнічаючы ў тэатралізаваных відовішчах. Спачатку гэта былі касцюмаваныя балі, маскарады, парады, шарады. З канца XVI ст. дзеля паляпшэння ведання моў і ўмення трымацца на людзях пры езуіцкіх калегіумах ствараліся *школьныя тэатры*. Там рабіліся невялікія паказы на лацінскай мове з музыкай, песнямі і танцамі. Сюжэты для іх браліся з Бібліі, антычнай міфалогіі і гісторыі розных краін. Паміж дзеямі вучні разыгрывалі *інтэрмедыі* — побытавыя сцэнкі на польскай ці беларускай мове.

Першыя замежныя тэатральныя трупы былі запрошаны ў Нясвіж. Пазней аматарскія спектаклі і оперы ставіліся там сваімі сіламі. Акцёрамі выступалі самі гаспадары рэзідэнцыі і іх госці. Для такіх паказаў выбіраліся біблейскія ці міфалагічныя сцэнкі, модныя замежныя п'есы. Першай жанчынай-драматургам на беларускіх землях стала Францішка Уршуля Радзівіл. Яе п'есы ставіліся ў Нясвіжы з 1746 г.



Францішка Уршуля Радзівіл (1705—1753) — пісьменніца, драматург, мецэнатка. Пад яе кіраваннем быў адноўлены замак у Нясвіжы, зноў адчынена там друкарня, папоўнена княжацкая бібліятэка. Сумуючы ў разлуцы па мужу, яна пачала пісаць да яго вершы і павучанні. Для свайго тэатра яна стварыла 16 п'ес. Іх сюжэты браліся з антычных міфаў, заходнееўрапейскіх твораў і фальклору. П'есы ўтрымлівалі таксама павучанні і побытавыя сцэнкі. Сёння спектаклі паводле твораў Ф. У. Радзівіл ідуць у Нясвіжскім палацы і Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы ў Мінску.

Як вы думаеце, чаму творчасць Ф. У. Радзівіл аказалася запатрабаванай і ў наш час?



▲ Ф. У. Радзівіл. *Невядомы мастак.* XIX ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Магілёўская батлейка. Рэканструкцыя

Апішыце знешні выгляд батлейкі. Як вы лічыце, навошта там зроблены два паверхі-сцэны?

У сялянскім і мяшчанскім асяроддзі вялікай папулярнасцю карыстаўся лялечны тэатр **батлейка**. Яго спектаклі былі прымеркаваны да калядных свят і спачатку засноўваліся на біблейскіх сюжэтах. Паступова ў паказы сталі ўключацца новыя персанажы, з'явіліся побытавыя п'есы. Батлеечнікі найчасцей ставілі народныя драмы «Цар Ірад» і «Цар Максімілян».

Такім чынам, нягледзячы на неспрыяльныя палітычныя і эканамічныя ўмовы, другая палова XVII — першая палова XVIII ст. былі часам развіцця самых розных галін культуры беларускіх зямель. Своеасаблівым культурным мостам паміж захадам і ўсходам Еўропы стала беларускае барока. Аднак у грамадстве нарастаў разрыў паміж шляхецкай і народнай — сялянскай, мяшчанскай — культурамі. Таму магчымасці развіцця беларускіх рысаў у літаратуры і мастацтве таго часу няўхільна скарачаліся.

1. Складзіце табліцу «Дасягненні культуры сярэдзіны XVII — першай паловы XVIII ст.».

Галіна	Дасягненні

Правообладатель Издательский центр БГУ

2. Што спрыяла развіццю літаратуры на беларускіх землях? На якіх мовах ствараліся літаратурныя творы? *Складзіце старонку дзённіка ці сямейнай хронікі, запісваючы па парадку самыя важныя падзеі дня.

3. Вызначце характэрныя рысы развіцця музыкі і тэатра на беларускіх землях у другой палове XVII — першай палове XVIII ст.

4. Знайдзіце ў сетцы інтэрнэт музычныя запісы з «Полацкага сшытка» і праслухайце іх. Апішыце свае ўражанні. Што вам спадабалася, а што — не?

5*. Ці захаваліся ў вашай мясцовасці помнікі архітэктуры ў стылі барока? Падрыхтуйце прэзентацыю (віртуальную выставу, калекцыю карцін) пра помнікі архітэктуры і мастацтва барока і ракако.

Падагульненне да III раздзела

I. Адкажыце на пытанні, карыстаючыся картамі атласа, картасхемамі і тэкстам вучэбнага дапаможніка.

1. Дзе на беларускіх землях адбываліся баявыя дзеянні падчас войнаў сярэдзіны XVII — першай паловы XVIII ст.?

2. Якія тэрытарыяльныя змены адбыліся ў Рэчы Паспалітай пасля ваенных канфліктаў сярэдзіны XVII — першай паловы XVIII ст.?

3. Дзе адбыліся асноўныя бітвы падчас казацка-сялянскай вайны і вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг.?

4. Дзе і як узніклі першыя мануфактуры на беларускіх землях? Хто іх заснаваў і што яны выпускалі?

5. Назавіце помнікі архітэктуры віленскага барока на беларускіх землях.

II. Намалюйце «стужку часу» ў сшытку і адзначце асноўныя падзеі сярэдзіны XVII — першай паловы XVIII ст. Зрабіце выснову пра наступствы гэтых падзей для беларускіх зямель. Пацвердзіце свае думкі прыкладамі з тэксту параграфаў.

III. Пры дапамозе тэксту вучэбнага дапаможніка папрацуйце па метадзе «ключавога слова». Вызначце не менш за 5—7 слоў (паняццяў, дат, імён) да кожнай групы:

1) палітычнае становішча; 2) эканамічнае становішча; 3) культурнае развіццё Вялікага Княства Літоўскага ў сярэдзіне XVII — першай палове XVIII ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

IV. Складзіце крыжаванку па тэме «Дзеячы другой паловы XVII — першай паловы XVIII ст.». Прапануйце яе сваім аднакласнікам для выканання.

V. Раскажыце пра прычыны і наступствы гістарычных падзей і з'яў: 1) супрацьстаянне магнацкіх груповак у ВКЛ у другой палове XVII ст.; 2) пасяджэнне сойма 1717 г.; 3) сацыяльная барацьба сялянства ў першай палове XVIII ст.

VI. Параўнайце (знайдзіце агульнае і адметнае): 1) заходнееўрапейскае і віленскае барока; 2) выявы з § 17—23 (якія партрэты і чаму можна назваць сармацкімі).

VII. Складзіце план адказу па тэме «Асноўныя рысы развіцця культуры ў Вялікім Княстве Літоўскім у сярэдзіне XVII — першай палове XVIII ст.».

VIII. Працягніце складанне табліцы «Палітыка кіраўнікоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XVI—XVIII стст.».

Манарх	Гады кіравання	Падзеі ўнутранай палітыкі	Падзеі знешняй палітыкі	Эканамічныя пераўтварэнні	Культурныя змены

IX. Прывядзіце не менш за пяць доказаў таго, што перыяд сярэдзіны XVII — першай паловы XVIII ст. магчыма назваць «Разбуральнае стагоддзе».

Правообладатель Издательский центр БГУ





Беларускія землі ў другой палове XVIII ст.



Раздзел IV

Для Рэчы Паспалітай другая палова XVIII ст. стала часам надзей і расчараванняў. Паспяхова пачатыя рэформы дазволілі вырашыць найбольш вострыя праблемы. Аднак унутраныя супярэчнасці і палітыка суседзяў, якія не былі зацікаўлены ў моцнай Рэчы Паспалітай, не дазволілі завяршыць станоўчыя пераўтварэнні. У выніку падзелаў Рэч Паспалітая і яе частка — Вялікае Княства Літоўскае — спынілі сваё дзяржаўнае існаванне.



Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 25. Эканамічнае развіццё

Што такое мануфактура? Хто першым заснаваў мануфактуры на беларускіх зямлях?

У чым заключаліся асаблівасці эканамічных пераўтварэнняў у Рэчы Паспалітай і магнацкага прадпрымальніцтва другой паловы XVIII ст.?

Пачатак эканамічных рэформаў. У XVIII ст. гаспадарка краін Заходняй Еўропы хутка развівалася. На гэтым фоне абазначылася прыкметнае эканамічнае адставанне Рэчы Паспалітай. Яго маглі ліквідаваць толькі рэформы. Яны пачаліся пасля ўзыходу на трон прыхільніка пераўтварэнняў *Станіслава Аўгуста Панятоўскага* (гады кіравання *1764—1795*). На працягу літаральна некалькіх гадоў быў праведзены шэраг важных эканамічных рэформаў. Стваралася **Скарбовая камісія ВКЛ** — спецыяльны дзяржаўны орган па кіраванні фінансамі і наглядзе за гаспадарчай сітуацыяй у краіне. Замест розных гандлёвых пошлін уводзілася адзінае дзяржаўнае *мыта*, абавязковае для ўсіх. Каралеўскія эканоміі перадаваліся ў дзяржаўнае кіраванне. У *1766 г.* для ўсёй Рэчы Паспалітай былі ўведзены адзіныя меры даўжыні, вагі і аб'ёму.

Прадстаўнікі якіх саслоўяў былі вызвалены ад выплаты падаткаў?

Для паляпшэння гандлёвых шляхоў сталі будавацца каналы. Першым па ініцыятыве магната *Міхала Казіміра Агінскага* быў пабудаваны канал, які злучыў Дняпро і Нёман, а праз іх Чорнае і Балтыйскае моры. Пры падтрымцы караля Станіслава Аўгуста быў праведзены і другі канал, які злучыў Прыпяць з Заходнім Бугам. У выніку стала магчыма вазіць водным шляхам прадукцыю да чарнаморскіх і балтыйскіх партоў. Ажывіўся знешні гандаль, які вёўся ў асноўным праз балтыйскія парты. 80 % усяго экспарту складала збожжа. З-за мяжы ў краіну паступала вялікая колькасць тавараў. Галоўнымі заставаліся разнастайныя тканіны, алей, віно, соль і прадметы раскошы.

Знайдзіце каналы на карце ў атласе. Якія яшчэ тавары акрамя збожжа маглі перавозіць па іх?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Актыўна развіваўся і ўнутраны гандаль. Паўсюль адкрываліся крамы. Штодзённы гандаль таварамі і прадуктамі стаў звычайнай з'явай беларускіх гарадоў і мястэчак. Значную ролю працягвалі адыгрываць і кірмашы. Самыя вялікія з іх праводзіліся ў Менску, Шклове, Бешанковічах і Зэльве.



▲ Конскі кірмаш. Мастак *Я. П. Норблін*. Пачатак XIX ст.

? **Разгледзьце малюнак і складзіце апавяданне ад імя пакупніка ці прадаўца тагачаснага кірмашу.*

Гарады і мястэчкі. У 1764 г. змянілася сістэма кіравання ў гарадах. Юрыдыкі падначальваліся магістратам, а яўрэйскія кагалы — старастам і ваяводам. Справы мяшчан маглі разглядацца толькі магістрацкім судом. Манастырам забаранялася мець корчмы і гандляваць. У 1776 г. магдэбургскае права было скасавана ва ўсіх гарадах, акрамя павятовых цэнтраў. Насельніцтва астатніх дзяржаўных гарадоў і мястэчак абкладалася спецыяльным дзяржаўным падаткам. Справы іх жыхароў разглядаліся судом старастаў.

Шляхце дазволілі займацца рамяством і гандлем, а мяшчанам — набываць землі па-за межамі гарадоў. Гэта спрыяла эканамічнаму збліжэнню шляхты і мяшчан. Больш за палову мяшчан займаліся

Правообладатель Издательский центр БГУ

рамяством і гандлем. У гарадах узрасла колькасць рамеснікаў, якія не ўваходзілі ў цэхавую арганізацыю і выкарыстоўвалі наёмную рабочую сілу. Але па-ранейшаму важнае месца сярод заняткаў мяшчан займалі падсобная гаспадарка і промыслы (рыбалоўства, рымарства і інш.).

Праведзеныя рэформы садзейнічалі развіццю гарадоў і мястэчак. У канцы XVIII ст. на беларускіх землях налічвалася ўжо 389 гарадскіх паселішчаў, дзе пражывала 250 тыс. чалавек. Буйны́мі гарадамі з'яўляліся Віцебск, Гародня, Магілёў, Менск.

Сельская гаспадарка. Рост цэн на збожжа на знешнім рынку ў 2—5 разоў прывёў да павелічэння колькасці фальваркавых гаспадарак. У другой палове XVIII ст. яны атрымалі пашырэнне і на ўсходзе Беларусі. У гэтым рэгіёне акрамя земляробства і жывёлагадоўлі вялікае значэнне мелі промыслы. Сярод іх асабліва важнымі былі вытворчасць спірту, нарыхтоўка лесу і *паташу*. Эканамічныя рэформы падштурхнулі да змен у сельскай гаспадарцы.



▲ Пераўтварэнні ў сельскай гаспадарцы

? *Як вы лічыце, пра што сведчаць змены ў сельскай гаспадарцы? Чаму яны спрыялі?*

Агульная плошча панскага поля павялічылася. Гэта прывяло да росту сялянскіх павіннасцяў у паўтара разу і абеззямельвання сялян. Ужо ў другой палове XVIII ст. каля 10 % сялян не мелі зямлі. Яны

Правообладатель Издательский центр БГУ

вымушаны былі наймацца на працу да заможных сялян ці на мануфактуры.

Рэформы Антонія Тызенгаўза. Павысіць эфектыўнасць дзяржаўнай гаспадаркі ВКЛ паспрабаваў Антоній Тызенгаўз. Свае рэформы ён распачаў з каралеўскіх эканомій.



Антоній Тызенгаўз (1733—1785) — надворны падскарбі ВКЛ, адміністратар каралеўскіх эканомій. Лідар прыхільнікаў караля ў ВКЛ. Стварыў мануфактуры ў Гародні і Паставах. Заснаваў першы ў Гародні тэатр.



▲ Антоній Тызенгаўз. Мастак *Я. Рустэм*. Канец XVIII ст.

? **Уявіце, што вы — журналіст, і складзіце пытанні для інтэрв'ю з Антоніем Тызенгаўзам.*

У сельскай гаспадарцы ўводзіўся шматпольны севазварот, завозіліся новыя пароды жывёлы. У эканоміі вярталася фальваркавая сістэма і паншчына. Мянялася сістэма надзялення сялян зямлёй. Арганізоўвалася сістэма іх падтрымкі ў выпадку голаду, неўраджаю.

Надзелы і павіннасці сялян паводле рэформы

Надзел	Асноўны (сядзібны)	Дадатковы (прыёмны)
Памер	1/4 валокі	Адвольны
Павіннасці	2 дні паншчыны на тыдзень і іншыя павіннасці	Чынш

? *Вызначце, якія павіннасці выконвалі сяляне і з якіх надзелаў. Як вы думаеце, які надзел прыносіў большы прыбытак дзяржаве?*

Аграрная рэформа значна павялічыла прыбыткі каралеўскага скарбу. Але ў некалькі разоў узрос павіннасны ціск на сялян. Яны адказвалі на гэта рознымі формамі пратэсту: ад простых уцёкаў да адкрытых сялянскіх выступленняў.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Рэч Паспалітая адчувала вострую патрэбу ў прамысловай прадукцыі, неабходнай для арміі і флоту. Антоній Тызенгаўз паспрабаваў за невялікі час арганізаваць у аграрнай краіне развітую прамысловасць. Будаўніцтва першых дзяржаўных мануфактур пачалося ў *1766—1768 гг.* Імі кіравалі кваліфікаваныя майстры з краін Заходняй Еўропы. З-за межаў краіны прывозіліся таксама абсталяванне і большасць сыравіны. Праз 10 гадоў дзейнічала ўжо 15 мануфактур, дзе працавала больш за 3 тыс. чалавек. Усяго ў каралеўскіх эканоміях было створана больш за 20 суконных, металаапрацоўчых, шліфавальных і іншых мануфактур. Асноўнымі пакупнікамі прадукцыі дзяржаўных мануфактур былі каралеўскі двор і войска.

Тым не менш большасць пачынанняў А. Тызенгаўза пацярпелі няўдачу. Правал яго эканамічных праектаў прывёў да яго адхілення ад пасад у 1780 г.



▲ Гарадніца. *Невядомы мастак.* 1789 г.



У Гародні і яе прадмесці Гарадніцы быў пабудаваны прамыслова-культурны цэнтр з 85 будынкаў. Яны ўтваралі тры часткі: адміністрацыйную, вытворчую і навучальную.

Якая з гэтых частак паказана на малюнку на першым плане? Свой адказ абгрунтуйце.

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Прычыны няўдач рэформаў Антонія Тызенгаўза

? *Пры дапамозе схемы і тэксту параграфа ацаніце вынікі рэформаў Тызенгаўза. Назавіце іх станоўчыя рысы.*

Магнацкае прадпрымальніцтва. Магнаты ў сваіх уладаннях таксама праводзілі эканамічныя пераўтварэнні. Яны масава адкрывалі маслабойні, рудні (дробныя металургічныя прадпрыемствы), сукнавальні і вінакурні. Далейшае пашырэнне атрымалі вотчынныя мануфактуры. З'явіліся суконныя мануфактуры ў Нясвіжы, Менску і Берасці. Сапегі заснавалі паперню, суконнае і палатнянае прадпрыемствы ў Ружанах. М. К. Агінскі ў Слоніме пабудаваў мануфактуры па вытворчасці тканін, шпалераў і дываноў.

Еўрапейскую вядомасць набыла Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў. Яна была створана Радзівіламі ў канцы 1750-х гг. Папулярнасць яе прадукцыі была настолькі вялікая, што гэтыя вырабы пачалі капіраваць на іншых мануфактурах, а сам пояс стаў звацца «слуцкі». І дагэтуль слуцкія паясы з'яўляюцца адной з візітных картак Беларусі.

У сярэдзіне XVIII ст. на беларускіх землях дзейнічалі 53 прыватныя мануфактуры, дзе працавала каля 2,5 тыс. чалавек. Неэканомнае выкарыстанне сыравіны, разлік толькі на багатых пакупнікоў абумовілі высокі кошт мануфактурных тавараў. Таму магнацкае прадпрымальніцтва мела часовы характар. Час існавання вотчынных

Правообладатель Издательский центр БГУ

мануфактур звычайна абмяжоўваўся працягласцю жыцця іх заснавальнікаў.



◀ Слуцкі пояс. Фрагмент

З дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, ці вырабляюцца цяпер слуцкія паясы. Як бы вы афармілі сучасны слуцкі пояс?

Такім чынам, дзякуючы рэформам значна ажывілася гаспадарчае жыццё на беларускіх землях. Павялічвалася колькасць насельніцтва, багацелі гарады, ствараліся новыя віды прадпрыемстваў. Аднак існаванне прыгоннага права перашкаджала далейшаму эканамічнаму развіццю.

1. Ахарактарызуйце становішча гарадоў і мястэчак Беларусі.
2. Пры дапамозе тэксту параграфа складзіце схему «Асноўныя эканамічныя пераўтварэнні ў другой палове XVIII ст.».
3. Правядзіце ў класе абмеркаванне па тэме «Станоўчыя і адмоўныя вынікі пераўтварэнняў у эканоміцы другой паловы XVIII ст.».
4. Знайдзіце магнацкія мануфактуры на карце ў атласе. Растлумачце, чаму яны не сталі галоўнай формай арганізацыі вытворчасці.

5*. Падрыхтуйце прэзентацыю (віртуальную экскурсію) па музеі слуцкіх паясоў.

§ 26. Палітычны крызіс у Рэчы Паспалітай

Якія палітычныя групоўкі ў Рэчы Паспалітай супрацоўнічалі з замежнымі краінамі? Што такое ліберум вета, канфедэрацыя?

Якім чынам у Рэчы Паспалітай спрабавалі вырашыць дысідэнцкае пытанне? Што прывяло да першага падзелу Рэчы Паспалітай?

Рост палітычнай нестабільнасці. Прыхільнікі рэформаў дзяржаўнага ладу, магнацкая групоўка «Фамілія», дабіліся выбрання

Правообладатель Издательский центр БГУ

каралём Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Ён узышоў на трон пры расійскай ваеннай, палітычнай і фінансавай падтрымцы.



Станіслаў Аўгуст Панятоўскі (1732—1798) — апошні кароль польскі і вялікі князь літоўскі. Нарадзіўся ў маёнтку Воўчын Берасцейскага павета. У маладыя гады быў паслом у Расіі. З'яўляўся прыхільнікам саюзу з Расіяй, бо разумеў немагчымасць правядзення рэформаў без яе згоды. Быў адным з галоўных аўтараў Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Пасля Трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай 1795 г. адмовіўся ад кароны.



▲ Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Мастак *М. Бачарэлі*

Рэформы былі распачаты па ініцыятыве «Фамілii» ўжо на сойме **1764 г.** Яны закранулі практычна ўсе сферы жыцця грамадства.



▲ Асноўныя рэформы сойма 1764 г.

? *Карыстаючыся схемай і тэкстам § 25—26, ахарактарызуйце пераўтварэнні, якія былі распачаты ў Рэчы Паспалітай у 1764 г.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Правядзенню далейшых рэформаў праз два гады перашкодзілі Расія і Прусія. Яны жадалі захаваць у Рэчы Паспалітай права ліберум вета, выбарнасць караля і шырокія шляхецкія вольнасці. Пад ціскам гэтых дзяржаў права ліберум вета было вернута пры галасаванні па ўсіх пытаннях. Чартарыйскія і кароль страцілі расійскую падтрымку ў правядзенні рэформаў.

Абмяркуйце, чаму іншыя краіны былі супраць рэформаў у Рэчы Паспалітай.

Дысідэнцкае пытанне. З мэтаю ўмяшання ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай Расія і Прусія выкарысталі дысідэнцкае пытанне. Яно абвастрылася падчас Паўночнай вайны. Соймавымі рашэннямі дысідэнтам было забаронена займаць дзяржаўныя пасады. Яны не маглі абірацца пасламі на сойм і дэпутатамі Галоўнага Трыбунала ВКЛ.

Хто такія дысідэнты?

Расія і Прусія імкнуліся абараніць правы сваіх адзінаверцаў. Але сойм 1766 г. адхіліў праект ураўнавання палітычных правоў дысідэнтаў і каталікоў. Расійская імператрыца Кацярына II вырашыла дабіцца гэтага з дапамогай канфедэрацый. Яна выдала 335 тыс. *злотых* на іх арганізацыю. У сакавіку **1767 г.** былі створаны дзве малаколькасныя канфедэрацыі: праваслаўна-пратэстанцкая ў Слуцку і пратэстанцкая ў Торуні.

Абмяркуйце, якія мэты ставілі канфедэраты.

Незадаволеная каталіцкая шляхта ў паветах у адказ стала ствараць уласныя канфедэрацыі. Яна імкнулася захаваць свае правы, спыніць рэформы і скінуць караля. Расія не жадала звяржэння Станіслава Аўгуста і адначасова старалася пазбегнуць канфлікту з каталіцкай шляхтай. Таму яна заключыла саюз з ёю і падштурхнула да стварэння каталіцкай канфедэрацыі ў Радаме (Польшча). Яе ўзначаліў Караль Станіслаў Радзівіл. На дапамогу канфедэратам Расія адправіла 40-тысячнае войска.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Кара́ль Станіслаў Радзівіл (1734—1790), віленскі ваявода, самы багаты магнат ВКЛ. Яго штогадовы прыбытак быў роўны гадавому даходу скарбу ВКЛ. Быў прыхільнікам захавання шляхецкіх вольнасцяў і незалежнасці Рэчы Паспалітай. Праславіўся сваёй шчодрасцю і свавольствамі. Ад сучаснікаў атрымаў мянушку Пане Каханку, бо гэты выраз быў яго любімым зваротам і прыслоўем.



▲ К. С. Радзівіл

Пад ціскам канфедэратаў і расійскага пасла сойм 1768 г. прыняў рашэнне аб ураўнаванні ў правах дысідэнтаў з каталікамі. Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай зацвярджаўся ў форме *«кардынальных правоў»*. Вечнае іх захаванне, а таксама непарушнасць межаў дзяржавы гарантавала Расія.



▲ Нормы дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай

? *Выкажыце меркаванне, чаму Расія выступіла гарантам захавання «кардынальных правоў» у Рэчы Паспалітай.*

Барская канфедэрацыя. Праціўнікі пастаноў сойма ў **1768 г.** стварылі *Барскую канфедэрацыю* (ад назвы мястэчка Бар ва Украіне). Яна выступала за незалежнасць дзяржавы і абарону каталіцкай веры. Удзельнікі канфедэрацыі патрабавалі адмаўлення Станіслава Аўгуста ад кароны. Яны разлічвалі на дапамогу замежных дзяржаў: Аўстрыі і Францыі. Да Барскай канфедэрацыі хутка далучылася значная колькасць беларускай і літоўскай шляхты, а таксама мяшчан і сялянства.

Правообладатель Издательский центр БГУ

У адказ Расія ўвяла свае войскі на беларускія землі. Гэта не перашкодзіла з'яўленню тут атрадаў канфедэратаў. Яны спадзяваліся на дапамогу Караля Станіслава Радзівіла. Аднак той не пайшоў на канфлікт з Расіяй, распусціў уласнае войска і перадаў ёй пад кантроль свае крэпасці.

На бок канфедэратаў перайшоў вялікі гетман ВКЛ Міхал Казімір Агінскі на чале 2-тысячнага войска. Канфедэраты здзейснілі шэраг удалых рэйдаў на ўсходнія беларускія землі і нават на тэрыторыю Расіі. Аднак сілы былі няроўныя. *12 верасня 1771 г.* у бітве каля в. Сталовічы (недалёка ад Баранавіч) яны пацярпелі паражэнне ад расійскай арміі. Ужо летам наступнага года недалёка ад Бабруйска расійскімі войскамі быў раззброены апошні атрад канфедэратаў.

Першы падзел Рэчы Паспалітай (1772). У Рэчы Паспалітай фактычна ішла грамадзянская вайна. Гэтымі абставінамі скарысталіся Прусія і Аўстрыя, якія ўвялі свае войскі на тэрыторыю Польшчы. Рэч Паспалітая не мела сіл абараніцца ад іх. Перашкодзіць замежным войскам магла толькі Расія, якая была саюзніцай Рэчы Паспалітай. Але Расія не жадала ўступаць у канфлікт з Прусіяй і Аўстрыяй. Замест гэтага яна пачала перагаворы з Прусіяй, да якіх далучылася і Аўстрыя. 5 жніўня **1772 г.** тры гэтыя дзяржавы падпісалі сакрэтную дамову аб падзеле некаторых тэрыторый Рэчы Паспалітай. Расія атрымала паўночныя і ўсходнія беларускія землі з насельніцтвам 1 млн 300 тыс. чалавек.

Знайдзіце на картасхеме на 2-м форзацы землі, якія адышлі да Расіі, Прусіі і Аўстрыі паводле ўмоў першага падзелу Рэчы Паспалітай. Як змянілася падчас гэтай падзеі тэрыторыя дзяржавы?

Для надання выгляду законнасці сваім дзеянням Аўстрыі, Прусіі і Расіі было патрэбна зацвярджэнне падзелу самой Рэччу Паспалітай. Пад пагрозай новай вайны ў наступным годзе быў скліканы сойм. У большасці паветаў шляхта ў інструкцыях паслам забараніла пагаджацца на падзел краіны. Аднак на самім сойме толькі тры паслы выступілі супраць: *Тадэвуш Рэйтан* і *Самуэль Корсак* ад Новагародскага ваяводства, *Станіслаў Багушэвіч* — ад Менскага.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Калі законныя сродкі барацьбы былі вычарпаны, Тадэвуш Рэйтан лёг у дзвярах залы. Ён не выпускаў паслоў з памяшкання, каб яны не дапусцілі падзелу Рэчы Паспалітай. Разарваўшы кашулю на грудзях, Рэйтан крыкнуў: «Забіце мяне, не забівайце Айчыну!» Тым не менш паслы сойма падпісалі дамову.



▲ Рэйтан на сойме 1773 г. Мастак *Я. Матэйка*. XIX ст.

Як вы мяркуеце, якія настроі імкнуўся перадаць аўтар карціны? Ацаніце дзеянні Т. Рэйтана. Ці можна лічыць яго патрыётам?

У 1775 г. Рэч Паспалітая заключыла новую дамову з усходняй суседкай. Згодна з гэтым дакументам Расія абяцала ахоўваць непарушнасць дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. Дамова прадугледжвала таксама стварэнне новага органа ўлады — *Пастаяннай Рады*. Праз

Правообладатель Издательский центр БГУ

Пастаянную Раду ў бліжэйшыя трынаццаць гадоў расійскі пасол уплываў на дзеянні караля і яго прыхільнікаў.



▲ Кірункі дзейнасці Пастаяннай Рады

? *Якім чынам Расія магла праз Пастаянную Раду ўплываць на становішча ў Рэчы Паспалітай?*

Спробы рэфармаваць палітычны лад Рэчы Паспалітай сустрэлі сур'ёзнае супрацьдзеянне суседніх краін. Расія, Аўстрыя і Прусія не былі зацікаўлены ў пераменах, якія маглі ўзмацніць Рэч Паспалітую. Гэтыя дзяржавы правялі першы падзел Рэчы Паспалітай. Частка беларускіх зямель была ўключана ў склад Расійскай імперыі.

1. Назавіце станоўчыя і адмоўныя вынікі рэформаў у Рэчы Паспалітай 1760-х гг.
2. Знайдзіце ў тэксце параграфа факты, якія пацвярджаюць выснову: «Правядзенне палітычных рэформаў было спынена ўмяшаннем Расіі і Прусіі».
3. Вызначце, у чым была сутнасць дысідэнцкага пытання. Прывядзіце доказы таго, што вырашэнне гэтай праблемы паўплывала на лёс Рэчы Паспалітай.
4. Ацаніце вынікі першага падзелу Рэчы Паспалітай. Чаму дзяржава працягвала падпісваць дамовы з Расіяй?
5. Абмяркуйце на ўроку, хто вінаваты ў першым падзеле Рэчы Паспалітай. Свае адказы абгрунтуйце.

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 27. Спробы палітычных рэформаў у Рэчы Паспалітай

Чаму рэформы 1764—1766 гг. былі часткова адменены? Калі адбыўся першы падзел Рэчы Паспалітай?

Якія рашэнні былі прыняты на Чатырохгадовым сойме? Якія прычыны выклікалі другі падзел Рэчы Паспалітай?

Чатырохгадовы сойм. Грамадства ў Рэчы Паспалітай было незадаволена залежнасцю ад Аўстрыі, Прусіі і Расіі. Спрыяльны час, каб вызваліцца ад яе, надышоў у 1788 г. У гэты час Расія і Аўстрыя ваявалі з Асманскай імперыяй. Адначасова Расійская імперыя вяла вайну са Швецыяй, адным з саюзнікаў якой была Прусія. З гэтай прычыны стасункі паміж Прусіяй і Расіяй вельмі абвастрыліся.

Міжнародная абстаноўка, такім чынам, давала магчымасць правесці рэформы дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. Гэта было зроблена на **Чатырохгадовым («Вялікім») сойме**, які сабраўся ў **1788 г.** і доўжыўся да **1792 г.** Гэты сойм быў ператвораны ў канфедэрацкі. Гэта значыць, што рашэнні на ім прымаліся большасцю галасоў. Маршалкамі сойма былі абраны прыхільнікі рэформаў, што спрыяла правядзенню пераўтварэнняў.

Вялікае ўражанне на паслоў сойма зрабіла прапанова Прусіі аб саюзе з Рэччу Паспалітай супраць Расіі. Першым сваім рашэннем сойм Рэчы Паспалітай павялічыў войска да 100 тыс. чалавек. Але з прычыны недахопу фінансавых сродкаў гэтая лічба была зменшана да 65 тыс. Потым сойм скасаваў Пастаянную Раду. Усе гэтыя дзеянні выклікалі гнеў расійскага ўрада. Паслу Рэчы Паспалітай у Пецярбургу было заяўлена: «Калі вы адвернецеся ад нас, можаце быць упэўненымі, што з'явіцца другі том падзелу».

З якой мэтай была створана Пастаянная Рада?

Як вы думаеце, чаму Расія была незадаволена рашэннямі Чатырохгадовага сойма?

На настроі ўдзельнікаў сойма Рэчы Паспалітай паўплывала і так званая чорная працэсія. Па Варшаве ў чорнай вопратцы прайшлі

Правообладатель Издательский центр БГУ

прадстаўнікі 141 горада, каб падаць пісьмовае прашэнне каралю. У ім мяшчане дамагаліся палітычных правоў і права набываць зямлю. Іх патрабаванні былі часткова задаволены. Мяшчане атрымалі асабістую недатыкальнасць, права абіраць паслоў на соймы і набываць зямельныя ўладанні.

151—158

Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Галоўным дасягненнем Чатырохгадовага сойма стала прыняцце **3 мая 1791 г.** Канстытуцыі Рэчы Паспалітай. Гэта была адна з першых у свеце канстытуцый — асноўных законаў дзяржавы. Канстытуцыя замацоўвала правы і свабоды грамадзян. Яна абвяшчала Рэч Паспалітую прававой дзяржавай з вяршэнствам закону і падзелам улады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую.

З урокаў сусветнай гісторыі ўспомніце, хто з еўрапейскіх мысліцеляў упершыню сфармуляваў ідэю падзелу ўлады.

Канстытуцыя стварала новы ўрад. У яго склад уваходзілі кароль, прымас і 5 міністраў. Гэта былі міністры паліцыі, унутраных спраў, замежных спраў, ваенны і фінансаў. Першым у гісторыі Рэчы Паспалітай міністрам замежных спраў быў прызначаны Іяхім Храптовіч.

Складзіце схему «Структура ўрада паводле Канстытуцыі 1791 г.».



▲ І. Храптовіч. Мастак *Я. Дамель*



Іяхім Храптовіч (1729—1812) — падканцлер ВКЛ з 1773 г. Прыхільнік «Фамілii». Быў паслом Рэчы Паспалітай у Францыі і Аўстрыі. З 1780 г. узначальваў каралеўскую партыю ў ВКЛ. Падтрымаў Канстытуцыю 3 мая 1791 г. Па рашэнні Таргавіцкай канфедэрацыі стаў канцлерам ВКЛ.

Упарадкоўвалася праца сойма. Права ліберум вета ліквідавалася. Прадугледжвалася аб'яднанне пад агульным кіраваннем войска і скарбу Польскага каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Канстытуцыя абвясціла Рэч Паспалітую ўнітарнай (адзінай) дзяржавай. Такім чынам, падзел Рэчы Паспалітай на Польшчу і ВКЛ ліквідаваўся. Гэта выклікала незадаволенасць прадстаўнікоў Вялікага Княства. Каб захаваць адзінства сярод прыхільнікаў рэформаў, было выдадзена «Узаемнае заручэнне абодвух народаў». Згодна з ім у супольных органах кіравання мусіла засядаць роўная колькасць прадстаўнікоў Кароны і Княства. Гарадамі, дзе былі павінны праходзіць соймы, абвяшчаліся Варшава і Гародня. Гарадскому насельніцтву надаваліся шырэйшыя правы, але для сялян захоўваўся прыгон.

Канстытуцыя 3 мая 1791 г. была прынята грамадствам, яе падтрымалі практычна ўсе павятовыя соймікі ВКЛ.


USTAWA
RZĄDOWA.
PRAWO UCHWALONE.
Dnia 3 Maia, Roku 1791.
w WARSZAWIE,
u P. Dworow Konsyl: Nadw: J. K. Mci i Dyrektora Druk: Korp: Kad:

▲ Тытульная старонка Канстытуцыі 3 мая 1791 г.



▲ Абвяшчэнне Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Мастак *Я. Матэйка.* XIX ст.

? *Як было ўспрынята абвяшчэнне Канстытуцыі? Якія настроі ў грамадстве паказаны на карціне? Як вы думаеце, чаму ў сучаснай Польшчы і Літве 3 мая адзначаюць як нацыянальнае свята?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Таргавіцкая канфедэрацыя. Рэалізаваць пастановы сойма і палажэнні Канстытуцыі 3 мая не ўдалося. Шэраг настроеных супраць рэформаў магнатаў у Пецярбургу склалі акт канфедэрацыі. Ён быў абвешчаны ў **маі 1792 г.** у мястэчку Тарговіца (цяпер тэрыторыя Украіны).

Канфедэраты абапіраліся на дапамогу Расіі, якая адразу ўвяла ў Рэч Паспалітую 100-тысячнае войска. Армія Рэчы Паспалітай паспрабавала абараніць краіну. Але ў маі — ліпені 1792 г. расійскія войскі занялі большую частку тэрыторыі Беларусі. У такіх абставінах у паветах ВКЛ сталі арганізоўвацца канфедэрацыі ў падтрымку таргавічан. Расійская імператрыца Кацярына II настойвала, каб кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі далучыўся да Таргавіцкай канфедэрацыі. Ён выканаў гэта патрабаванне. Улада ў дзяржаве перайшла да канфедэрацыі. Яна адмяніла ўсе пастановы Чатырохгадовага сойма і запатрабавала вярнуць шляхце ранейшыя правы і свабоды.

158—159

Другі падзел Рэчы Паспалітай (1793). Карыстаючыся момантам, напачатку 1793 г. свае войскі на землі Рэчы Паспалітай увяла Прусія. 23 студзеня **1793 г.** Расія і Прусія падпісалі дамову аб чарговым падзеле Рэчы Паспалітай.

Знайдзіце на картасхеме на 2-м форзацы тэрыторыі, якія паводле ўмоў другога падзелу Рэчы Паспалітай адышлі да Расіі.

Расійская імперыя атрымала цэнтральныя землі Беларусі і частку Правабярэжнай Украіны. Гэтая тэрыторыя складала 250 тыс. кв. км. Мяжа прайшла па беларускіх землях па лініі Друя — Пінск.

Умовы другога падзелу Рэчы Паспалітай былі зацверджаны на сойме ў Гародні. Пасяджэнне праходзіла ў абстаноўцы пагроз, прымусу і дэманстрацыі Расіяй ваеннай сілы. Паслы сойма доўгі час адмаўляліся падпісаць патрабаванні Расіі і Прусіі. Аднак 17 верасня 1793 г. пагадненне паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй аб другім падзеле было падпісана.

Яшчэ большы супраціў паслоў сойма выклікала дамова Рэчы Паспалітай з Прусіяй. 23 верасня 1793 г. расійскія войскі абкружылі

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Каралеўскі замак у Гародні, дзе ў 1793 г. сабраўся апошні сойм Рэчы Паспалітай

Гарадзенскі сойм 1793 г. увайшоў у гісторыю як апошні сойм Рэчы Паспалітай. Ён адбыўся ў каралеўскім замку. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай будынак быў ператвораны ў вайсковы шпіталь. Цяпер у палацы знаходзіцца гісторыка-археалагічны музей.

каралеўскі замак, дзе праходзіў сойм. Яны збіраліся не выпускаць паслоў, пакуль не будзе прынята дамова з Прусіяй. Расійскія вайскоўцы размясціліся ў зале пасяджэнняў, а адзін з афіцэраў сядзеў побач з каралём. У знак пратэсту супраць гвалту паслы сойма некалькі гадзін маўчалі. Урэшце ўначы 24 верасня было прынята рашэнне, што маўчанне паслоў азначае згоду на дамову з Прусіяй.

Праз месяц была прынята саюзная дамова з Расіяй. Рэч Паспалітая дазваляла ўвядзенне і знаходжанне расійскіх войскаў на сваёй тэрыторыі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Такім чынам, у 1788—1792 гг. у краіне былі здзейснены спробы рашучых палітычных рэформаў. Аднак суседнія дзяржавы не жадалі ўзмацнення Рэчы Паспалітай. Гэта прывяло да адмены пераўтварэнняў і да другога падзелу Рэчы Паспалітай.

1. Знайдзіце ў тэксце параграфа факты, якія пацвярджаюць вывад: «У 1788 г. склаліся знешнія і ўнутраныя ўмовы для правядзення рэформаў у Рэчы Паспалітай».
2. Калі адбыўся Чатырохгадовы сойм Рэчы Паспалітай? Пералічыце прынятыя на ім рашэнні. На ваш погляд, якія з гэтых рашэнняў былі найбольш важнымі для ўмацавання Рэчы Паспалітай? Патлумачце сваю думку.
3. Калі і чаму ўзнікла Таргавіцкая канфедэрацыя? З якой прычыны Расія садзейнічала канфедэратам? Ці карысталіся яны падтрымкай у ВКЛ?
4. Як вы думаеце, чаму Канстытуцыя 3 мая 1791 г. мае афіцыйную назву «Закон аб урадзе»? Якія новыя органы дзяржаўнага кіравання былі створаны згодна з ім?

5*. Уявіце сябе шляхцічам, які жыў у XVIII ст. Складзіце апавяданне-ўспамін пра свой удзел у сойме 1793 г.

§ 28. Паўстанне 1794 г. на беларускіх землях

Якія наступствы для Рэчы Паспалітай мелі яе першы і другі падзелы?

Як паўстанцы спрабавалі адстаяць Рэч Паспалітую?

Пачатак і ход паўстання на беларускіх землях. Другі падзел Рэчы Паспалітай і прысутнасць у краіне расійскіх войскаў выклікалі вялікае незадавальненне ў грамадстве. Неўзабаве выбухнула моцнае паўстанне. Яно было абвешчана 24 сакавіка **1794 г.** на галоўнай плошчы Кракава. Яго кіраўніком стаў ураджэнец Беларусі Тадэвуш Касцюшка. Паўстанцы выступалі за вяртанне Канстытуцыі 3 мая і працяг рэформаў. Яны хацелі аднавіць Рэч Паспалітую ў межах, якія існавалі да 1772 г. Патрыятычна настроеныя паўстанцы жадалі, каб замежныя краіны не ўмешваліся ва ўнутраныя справы іх дзяржавы. Таму дэвізам паўстання сталі словы: «Вольнасць, цэласнасць, незалежнасць».

Як вы разумееце гэты дэвіз?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка (1746—1817) — палітычны і вайсковы дзеяч. Нарадзіўся ў фальварку Мерачоўшчына каля Косава ў Слонімскім павеце. Скончыў Варшаўскае ваеннае вучылішча ў чыне капітана. Для далейшай адукацыі накіраваўся ў Францыю. У 1776 г. выехаў у Амерыку, дзе ўзяў актыўны ўдзел у барацьбе за незалежнасць Злучаных Штатаў. У 1783 г. атрымаў там чын брыгаднага генерала. За службу быў узнагароджаны ордэнам Цынцыната, пажыццёвай пенсіяй і зямельным надзелам. Падрабязней пра яго лёс вы можаце даведацца з кнігі Я. Юхо і У. Емяльянчыка «Нарадзіўся я ліцвінам» (1994).



▲ Т. Касцюшка. Мастак *Ж. Б. Мазес*

? *Пры дапамозе тэксту параграфа растлумачце, чаму Т. Касцюшка лічыцца нацыянальным героем ЗША і Польшчы.*

У другой палове красавіка паўстанне ахапіла землі сучаснай Літвы і захаду Беларусі. У ноч на 23 красавіка 1794 г. войскі ВКЛ і мяшчане захапілі расійскі гарнізон у Вільні. Для кіравання паўстаннем у сталіцы Княства была створана самастойная *Найвышэйшая Рада ВКЛ*. На чале яе стаў прыхільнік ідэй Французскай рэвалюцыі палкоўнік ***Якуб Ясінскі***. Аднак вярхоўная ўлада ў паўстанні належала Тадэвушу Касцюшку. У параўнанні з польскімі паўстанцамі Рада выступала з больш рашучымі патрабаваннямі. Напрыклад, яна прапаноўвала адмяніць паншчыну і пашырыць правы мяшчан.

З ліста аўстрыйскага пасла ў Рэчы Паспалітай

Віленская рэвалюцыя не ўзяла за ўзор кракаўскі ці варшаўскі паўстанцкі маніфест. Замест гэтага яна абвясціла свой уласны акт… галоўнай мэтай якога была ліквідацыя трона і апора на французскія ўзоры [Французскую рэвалюцыю]…

Правообладатель Издательский центр БГУ

Успомніце з урокаў па сусветнай гісторыі, хто такія якабінцы.

Кіраўніка паўстання палохалі погляды «віленскага якабінца» Я. Ясінскага. Касцюшка абвінаваціў Ясінскага ў дзеяннях, накіраваных супраць «саюзу братніх народаў». У выніку 4 чэрвеня 1794 г. Ясінскі быў адхілены ад кіраўніцтва паўстаннем у ВКЛ.

Як вы лічыце, што з праграмы Рады і поглядаў Я. Ясінскага не задавальняла кіраўнікоў паўстання?

161—163

Для прыцягнення да паўстання сялян *7 мая 1794 г.* Касцюшка падпісаў *Паланецкі ўніверсал*. Гэты дакумент абяцаў вызваліць сялян ад прыгону, але не абяцаў ім зямлі. Ад пана маглі пайсці толькі тыя, хто зможа з ім разлічыцца і выплаціць дзяржаўныя падаткі. Аднак на практыцы ўніверсал так і не пачаў дзейнічаць, бо шляхта не жадала адмены прыгоннага права.

Як вы думаеце, ці маглі задаволіць сялян такія ўмовы вызвалення? Свой адказ растлумачце.

Тадэвуш Касцюшка ўвёў у абарачэнне першыя папяровыя грошы ў Рэчы Паспалітай. Яны замянілі паўстанцам медныя і срэбныя манеты.



Грашовая банкнота 1794 г.

Параўнайце афармленне грошай паўстанцаў і сучасных беларускіх банкнот. У чым іх адрозненне і падабенства?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Агульная колькасць паўстанцаў у ВКЛ складала каля 25 тыс. чалавек. Сярод іх былі шляхціцы, духавенства, мяшчане і сяляне-*касінеры*. Так іх празвалі, бо часцей за ўсё яны былі ўзброены косамі. Спачатку поспех быў на баку паўстанцаў. Акрамя Вільні яны захапілі ўладу ў Гародні, Бярэсці, Новагародку і іншых гарадах. На задушэнне паўстання расійская імператрыца Кацярына II паслала войска пад камандаваннем А. Суворава. У вырашальнай *бітве пад Мацяёвіцамі* 10 кастрычніка 1794 г. армія паўстанцаў была разбіта, а паранены Т. Касцюшка трапіў у палон. Кіраўніком паўстання замест яго стаў Тамаш Ваўжэцкі.



▲ Жаўнеры Т. Касцюшкі. Малюнак XIX ст.

? *Прадстаўнікі якіх саслоўяў паказаны на малюнку?*



Тамаш Ваўжэцкі (1759—1816) — палітычны дзеяч. Паходзіў з браслаўскай шляхты. Быў вялікім харужым ВКЛ. З'яўляўся прыхільнікам рэформаў і актыўна падтрымліваў іх на сойме 1788—1792 гг. У 1792 г. удзельнічаў у вайне з Расіяй. Падчас паўстання 1794 г. стварыў і ўзначаліў вялікі атрад, за што быў прызначаны генерал-лейтэнантам. Пасля паражэння паўстання трапіў у расійскі палон. У 1796 г. быў памілаваны расійскім імператарам Паўлам I і вярнуўся на радзіму.



▲ Т. Ваўжэцкі. Мастак *Я. Дамель*

Расійскія войскі хутка задушылі супраціўленне паўстанцкіх атрадаў. 4 лістапада 1794 г. яны ўзялі ўмацаванае прадмесце Варшавы — Прагу. Падчас штурму загінула каля 10 тыс. паўстанцаў, сярод іх і Якуб Ясінскі. Праз два дні Варшава капітулявала.

Па карце ў атласе вызначце, якая частка беларускіх зямель была ўцягнута ў ваенныя дзеянні.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Прычыны паражэння паўстання. Да паражэння паўстання прывяло некалькі прычын. Не апошнюю ролю адыграла адсутнасць адзінства сярод паўстанцаў. Іх пазіцыі аслабляў канфлікт Тадэвуша Касцюшкі з Найвышэйшай Радай ВКЛ, якая не выконвала загады кіраўніка. Да таго ж асноўную масу ўдзельнікаў паўстання складалі шляхціцы. Спробы прыцягнуць сялян і мяшчан не мелі асаблівага поспеху, бо шляхта не жадала пашыраць іх правы. Таму яны неахвотна далучаліся да паўстання. На яго ход паўплывалі таксама перамогі расійскіх войскаў і дзеянні царскіх улад. Яны абяцалі сялянам дараваць удзел у паўстанні і раздаць ім зямлю іх паноў-паўстанцаў.

Складзіце схему «Прычыны паражэння паўстання».

Трэці падзел Рэчы Паспалітай (1795). Расія, Аўстрыя і Прусія вырашылі, што надышоў зручны момант для ліквідацыі Рэчы Паспалітай. 24 кастрычніка **1795 г.** у Пецярбургу яны падпісалі дамову аб апошнім падзеле Рэчы Паспалітай. Расія атрымала землі на захадзе Беларусі, частку Літвы і Украіны. У выніку амаль усе беларускія землі былі ўключаны ў склад Расійскай імперыі. *25 лістапада 1795 г.* Станіслаў Аўгуст Панятоўскі падпісаў у Гародні акт адмовы ад трона.

Знайдзіце на картасхеме на 2-м форзацы тэрыторыі, якія адышлі да Расіі паводле трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай. Як вы ацэньваеце вынікі падзелаў для беларускіх зямель?

171—173

Паўстанне 1794 г. было рэакцыяй розных пластоў грамадства Рэчы Паспалітай на другі падзел сваёй краіны і прысутнасць у краіне расійскіх войскаў. Паўстанцы ў ВКЛ адрозніваліся больш рашучымі дэмакратычнымі патрабаваннямі. Яны падтрымлівалі ідэі Французскай рэвалюцыі. Сярод іх былі не толькі прадстаўнікі шляхты, але таксама мяшчане і сяляне. Але паўстанцы не здолелі супрацьстаяць моцнай расійскай рэгулярнай арміі. У выніку трэцяга падзелу Рэч Паспалітая спыніла сваё існаванне.

1. Ахарактарызуйце паўстанне 1794 г. у Рэчы Паспалітай па плане: 1) прычыны; 2) удзельнікі; 3) ход падзей; 4) вынікі.
2. Карыстаючыся тэкстам параграфа і дадатковымі крыніцамі, параўнайце погляды Тадэвуша Касцюшкі і Якуба Ясінскага.

Правообладатель Издательский центр БГУ

3. Як вы лічыце, ці здольная была Рэч Паспалітая самастойна пераадолець палітычны крызіс? Абгрунтуйце свой адказ.

4*. Падрыхтуйце віртуальную экскурсію па краінах свету, якія звязаны з Тадэвушам Касцюшкам. Як ён і іншыя кіраўнікі і ўдзельнікі паўстання 1794 г. ушаноўваюцца ў Беларусі?

§ 29. Культура

Што такое Асветніцтва? Якія былі яго характэрныя рысы?

У чым заключаліся асаблівасці культуры Асветніцтва на беларускіх землях? Чаму творы дзеячаў гэтага часу запатрабаваны і цяпер?

Асаблівасці Асветніцтва ў Беларусі. XVIII ст. стала часам узаемапранікнення культур барока і *Асветніцтва*. Пад уплывам ідэй вальнадумства і першынства розуму грамадства пачало вызваляцца з-пад усеагульнага кантролю царквы. З мая **1776 г.** пачало выходзіць першае перыядычнае выданне ў Беларусі — «Газета Гродзеньска». Павялічылася цікавасць да мінулага беларускіх зямель, культуры яе насельніцтва, захавання традыцый і звычаяў.


GAZETA GRODZIENSKA PARTYKULARNA

Zaſtępująca Zwyczayną Piſaną. 1776. Roku.

Z Warſzawy d. 24. Czerwca.

Nieprzyjaźne Dworowi naſzemu ſerca złośliwie lub opacznie nayzbawienniey-ſze tłumaczące intencye, głoſić pod ſamym bokiem Jego ważą ſię: iż już niemal wſzyſcy Poſłowie in ordine do Seymu przyſzłego ſą ukartowani, a nie pamiętając na tylokrotnie ſamego Nayiaśnieyſzego Pana oświadczenia: iż ſobie życzy jak nayuczciwſzych i naygodnieyſzych mieć Poſłow, biorąc tak chwalebne i zbawienne życzenia za krok dla Majeſtatu nayragnanieyſzy, myśli uformowane przez partykularnych partye i poczynione zamachy, o których z *Lubeck* i *Wołynia* nayświeższe dochodzą nas pogłoſki, gdy tym czaſem z ſtrony Dworu o żadnych podobnych nieſłychać imprezach, owſzem ſama Moſkwa ſtateczne czyni obietnice: iż na Seymiki nie wyſzle Giemeyna.

Tak głośno o zawartym między *Anſtryą* i *Roſyą* Aliantie przeciw Królowi Pruſkiemu pogłoſka, już pełznąć zaczyna, ile kiedy ſama ſpokoyność Króla Pruſkiego zupełnym już cieſzącego ſię zdrowiem, pokazuje że była fałſzywa, a przecież polityka Monarchy tego zawſze była ſtateczna uprzedzać ſwych nieprzyiaciół, owſzem przeciwne tu o pokoju dochodzą nas pogłoſki: że tak ſprzymierzone Gabinety, jako ſtanowe poſtronne Potencye naywięcey teraz około przywrócenia generalnego pracują pokoju. Rzecz tylko nie pojęta: że gdy Ceſarzowa Jmć zawarłſzy na fundamencie obietnicy Króla Pruſkiego powrócenia *Polſzcze* z ſwey ſtrony nieprzyiaznych zaborow niedawno w *Warſzawie* Konwencyą oddaje *Polſzcze* z ſwojey ſtrony nad Traktat zagarnione kawałki, Król Pruſki żadnego do tey reſtytucyi nie czyni przygotowania, owſzem na nowo zagarnionych obywatelow ciemiężyć przed ſię bierze. Piſzą albowiem z *Bydgoſzczy*: iż tam świeżo ogłoſzono: że Król Pruſki wſzyſtkich Duchownych Dobra na ſiebie odbiera; i że każdemu o nie konkurować wolno. Wdowy zaś uboższe podobnym oſtrzeżono Uniwerſałem, aby ſię do *Berlina* wſzyſtkie zgromadzały, mający tam znaleść letką dla ſiebie robotę, a zapłatę z groſzy ciężkiey monety i ſzklankę wody na dzień, któraby zaś niechciała na tak oſobne i Bogomyślne piſać ſię życie, 15. reiſch talarow zapłaci.

Z Petersburga wiadomość mamy: iż Xiąże Naſtępca już z kraju ſwego wyjechał, i odwiedziwſzy on fortece i porty nad-morſkie, udać ſię ma do *Berlina*, z tamtąd ma nayprzód zwiedzieć niektóre Cyrkuły Niemieckie, a potym podobno na daſzą udać ſię wojaż; Powſzechną tey podróży potrzebę rozerwanie Xcia Jmci w ſmutku dają przyczynę.

Wyſzedł w tych tu dniach od Kommiſſyi nad ſzpitalami przełożoney Uniwerſał, którym to naprzód zadziwia ſię: że zlecone Luſtracye ſzpitalow in ordine ſprzedania dobr ich, lub ſkończyć omni meliori modo na Wojewodzkie Łazarety nie ſą uſkutecznione. Odſyła potym na inſzy czas rzeczone Luſtracye, a na fundamencie zlecenia Króla Jmci i Rady nieuſtającey, jakoby według Konſtytucyi 1688. takoż względem bogich czyni dyſpozycyą: Po wſzyſtkich miaſtach Magiſtraty, a po wſiach Dziedzice lub konomowie in ſpatio niedziel czterech zrewidować powinni ſwych żebrakow, to jeſt:

▲ Газета Гродзеньска. № 1. 1776 г.

Як выхад газеты мог паўплываць на свядомасць жыхароў? Што зараз з'яўляецца асноўнай крыніцай інфармацыі?

Праваднікамі ідэй Асветніцтва на беларускіх землях сталі адукаваныя шляхціцы, якія мелі дэмакратычныя погляды. Яны былі патрыёты сваёй краіны і шукалі шляхі яе выратавання. Яны лічылі, што гэтымі шляхамі павінны стаць адукацыя насельніцтва і рэформы.

Прадстаўнікі якіх саслоўяў выступалі носьбітамі ідэй Асветніцтва ў Заходняй Еўропе?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Дзейнасць Адукацыйнай камісіі. Развіццё навукі. Для пашырэння ідэй Асветніцтва ў грамадстве найперш патрабавалася змяніць сістэму адукацыі. Пад кіраўніцтвам *Станіслава Канарскага* ў 1740—1760-я гг. была праведзена школьная рэформа. Мэтай яе было набліжэнне школы да патрэб рэальнага жыцця. Спачатку ў піярскіх, а потым і ў езуіцкіх школах сталі выкладаць польскую мову, прыродазнаўчыя навукі, гісторыю, геаграфію, замежныя мовы. Пазней уводзіліся фізічнае выхаванне, фехтаванне і танцы.

Якія падзеі маглі садзейнічаць правядзенню рэформы?



173—175

У **1773 г.** было створана першае ў Еўропе міністэрства асветы — **Адукацыйная камісія**. Задачай камісіі было вызваліць школу ад рэлігійнага ўплыву, зрабіць яе свецкай і дзяржаўнай. Адукацыйная камісія зацвердзіла адзіную для ўсіх школ праграму навучання. Галоўнае месца ў ёй адводзілася грамадскім і прыродазнаўчым навукам, замежным мовам. Тэалагічныя (рэлігійныя) прадметы выключаліся з праграмы.

Як вы мяркуеце, чаму новыя падручнікі ў другой палове XVIII ст. былі створаны менавіта па гісторыі і філасофіі?

Былі створаны новыя падручнікі, у першую чаргу па гісторыі і філасофіі. Замест завучвання тэкстаў на памяць вучняў вучылі разважаць. Шмат увагі стала надавацца фізічнаму выхаванню і развіццю практычных навыкаў вучняў (напрыклад, у галінах земляробства, аховы здароўя).

У краіне ствараліся школы трох ступеняў: пачатковыя (парафіяльныя пры касцёлах і цэрквах), сярэднія (акруговыя і падакруговыя) і вышэйшая. Вышэйшай стала пераўтвораная з Віленскай акадэміі Галоўная школа ВКЛ (пазней Віленскі ўніверсітэт) на чале з Марцінам Пачобут-Адляніцкім. Большасць школ была створана на аснове былых езуіцкіх школ і калегіумаў. Пасля забароны ордэна езуітаў уся яго маёмасць у Рэчы Паспалітай перайшла да Адукацыйнай камісіі. У той жа час на землях, далучаных да Расіі, езуіцкія калегіумы працягвалі дзейнічаць.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Марцін Пачобут-Адляніцкі (1728—1810) — астраном, асветнік. Ён не толькі стварыў Галоўную школу ВКЛ, але і быў яе першым рэктарам амаль 20 гадоў. У Вільні заснаваў астранамічную абсерваторыю, вядомую ва ўсёй Еўропе, дзе назіралі за рухам Сонца і зорак. Пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле былі вызначаны геаграфічныя каардынаты гарадоў ВКЛ, а таксама месцазнаходжанне планеты Меркурый.



▲ М. Пачобут-Адляніцкі. Мастак *Ю. Аляшкевіч*



◀ Медыцынская акадэмія ў Гародні. Малюнак *Н. Орды*. XIX ст.

Асноўным прынцыпам навучання стала яго даступнасць для прадстаўнікоў усіх саслоўяў. Характэрнай рысай асветы гэтага часу стала адкрыццё прафесійных школ. У 1770-я гг. у Гародні і Паставах па ініцыятыве А. Тызенгаўза былі арганізаваны вышэйшая медыцынская, акушэрская, ветэрынарная, чарцёжная і рысавальная школы. У Гародні пры медыцынскай школе (акадэміі) існавалі шпіталь, заалагічны сад, анатамічны кабінет. Пры ёй жа прафесар *Жан Эмануэль Жылібер* заклаў і першы ў Рэчы Паспалітай батанічны сад.

Палацава-паркавыя комплексы. Мастацтва. Найбуйнейшымі цэнтрамі культурнага жыцця Беларусі заставаліся магнацкія двары. Пры іх захоўваліся багатыя бібліятэкі, калекцыі мастацкіх твораў, працавалі друкарні, тэатры, капэлы.

Правообладатель Издательский центр БГУ



◀ Палацава-паркавы комплекс у Свяцку. Гродзенская вобласць. Канец XVIII ст.

? *З дапамогай тэксту вучэбнага дапаможніка і выявы апішыце парк пры палацы. Што вам у ім спадабалася?*



▲ Роспіс касцёла ў Будславе. 1780-я гг.

? *З дапамогай ілюстрацыі і слоўніка ў канцы вучэбнага дапаможніка вызначце розніцу паміж стылямі барока і класіцызму.*

Магнаты сапернічалі з каралеўскім дваром і паміж сабой за самую шыкоўную рэзідэнцыю. Архітэктура іх палацаў спалучала элементы барока з вытанчанымі рысамі ракако. Але паступова на змену гэтым стылям прыходзілі строгія пабудовы *класіцызму*, узорам для якіх была антычнасць. Палацы маглі ўзводзіць у горадзе (як палац Агінскіх у Слоніме, Тызенгаўза ў Гародні). Рэзідэнцыі ў стылі класіцызму найчасцей будаваліся сярод маляўнічай прыроды (палац Чартарыйскіх у Воўчыне, Валовічаў у Свяцку, Храптовічаў у Шчорсах). Архітэктары стваралі ў адзіным стылі вонкавае і ўнутранае ўбранне, мэблю і нават паркі. З дрэў і кустоў фарміраваліся алеі парку, пераходы, лабірынты, нават цэлыя будынкі. Дадатковую прыгажосць комплексам надавалі вадаёмы.

Правообладатель Издательский центр БГУ

У мастацтве ўплыў французскага Асветніцтва адчуваўся мацней, чым у архітэктуры. Жывапіс набыў больш рэалістычныя рысы. У гэты час пачалі свой творчы шлях заснавальнікі беларускай і літоўскай мастацкай школы *Францішак Смуглевіч* і *Ян Рустэм*. У манументальным жывапісе ўсё часцей выкарыстоўваліся аптычныя ілюзіі (падманкі). У канцы XVIII ст. у архітэктуры і мастацтве на змену барока канчаткова прыйшоў класіцызм.

Прыгонны тэатр. Надзвычайнае развіццё ў гэты час атрымалі тэатры пры магнацкіх дварах. Тэхнічнае абсталяванне тэатра Міхала Казіміра Агінскага ў Слоніме было адным з найлепшых у Еўропе. Нясвіжскі тэатр з аматарскага ператварыўся ў прафесійны. Быў заснаваны тэатр у Слуцку. Акрамя згаданых прыгонныя тэатры існавалі ў Гародні ў А. Тызенгаўза, у Ружанах і Дзярэчыне ў Сапегаў, у Свіслачы ў Тышкевіча. Разам з заходне-



▲ Будынак тэатра М. К. Агінскага ў Слоніме

Правообладатель Издательский центр БГУ

еўрапейскімі прафесійнымі артыстамі і музыкантамі там выступалі і прыгонныя. Іх навучалі ў спецыяльных школах пры тэатрах. Вучняў туды набіралі з маёнткаў уладальнікаў. Пад кіраваннем балетмайстраў з Францыі і Італіі былі створаны балетныя школы ў Нясвіжы і Слуцку. Выхаванцы тэатральнай школы А. Тызенгаўза сталі зоркамі каралеўскага балета ў Варшаве.

У прыдворных тэатрах ставіліся оперна-балетныя спектаклі не толькі французскіх, італьянскіх кампазітараў, але і мясцовых аўтараў. Аднымі з першых былі опера «Агатка» Мацея Радзівіла на музыку Яна Голанда, оперы і музычныя драмы Міхала Казіміра Агінскага. З вуснаў герояў-сялян іх твораў загучала жывая беларуская мова.

У другой палове XVIII ст. у культуры беларускіх зямель адбыліся вялікія змены. Звыклая сармацкая шляхецкая культура і яе традыцыі адыходзілі ў мінулае. Пад уплывам ідэй Асветніцтва ў грамадстве павялічыўся прэстыж адукаванасці. Аднак вышэйшыя пласты грамадства амаль цалкам паланізаваліся. У гэтых умовах беларускія народныя традыцыі ў побыце і мастацтве захоўваліся толькі ў сялянскім асяроддзі. Памяць пра гістарычныя падзеі перадавалася з пакалення ў пакаленне праз казкі, легенды, паданні. Народная культура пранікала ў літаратуру і мастацтва і значна іх узбагачала.

1. Назавіце адметныя рысы Асветніцтва ў Беларусі.
2. Ахарактарызуйце дзейнасць Адукацыйнай камісіі па плане: 1) час узнікнення; 2) мэта стварэння; 3) мерапрыемствы ўстановы; 4) значэнне.
3. Якія пласты грамадства захоўвалі беларускія народныя традыцыі? Чаму менавіта гэтыя пласты?
4. Як вы думаеце, чаму Слонім называлі ў той час сядзібай муз? Аргументуйце свой адказ. Пры неабходнасці скарыстайцеся дадатковымі крыніцамі інфармацыі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Падагульненне да IV раздзела

I. Адкажыце на пытанні пры дапамозе картаў атласа, картасхем і тэксту вучэбнага дапаможніка.

1. Які горад быў цэнтрам гаспадарчых рэформаў А. Тызенгаўза?
2. У якіх населеных пунктах працавалі вотчынныя мануфактуры ў другой палове XVIII ст.? Якім магнацкім родам яны належалі?
3. Як мянялася тэрыторыя Рэчы Паспалітай падчас падзелаў? Якія краіны ў іх удзельнічалі? Да якой дзяржавы адышлі беларускія землі?
4. Дзе пачало выходзіць першае на беларускіх землях перыядычнае выданне?
5. Каму належалі палацава-паркавыя комплексы і прыгонныя тэатры, якія з'явіліся на беларускіх землях у другой палове XVIII ст.? Дзе яны знаходзіліся?

II. Успомніце, якія падзеі адбыліся ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. Падрыхтуйце 5 пытанняў для гістарычнай віктарыны па асноўных падзеях гісторыі Вялікага Княства Літоўскага таго часу.

III. Каго з гістарычных дзеячаў другой паловы XVIII ст. можна назваць сапраўдным патрыётам? Прапануйце 2—3 імёны для абмеркавання на ўроку. Растлумачце свой выбар. Зрабіце больш падрабязнае паведамленне пра аднаго з іх.

IV. Складзіце апавяданне пра наступныя падзеі і з'явы другой паловы XVIII ст.: 1) правядзенне рэформаў соймам 1764 г.; 2) дзейнасць Чатырохгадовага сойма; 3) шляхецкія канфедэрацыі; 4) прыгонныя тэатры на беларускіх землях; 5) мастацкія стылі, якія нарадзіліся і дасягнулі найбольшага развіцця ў XVIII ст.

V. Вызначце прычыны і вынікі наступных падзей: 1) з'яўленне магнацкага прадпрымальніцтва; 2) рэформы А. Тызенгаўза; 3) паўстанне Т. Касцюшкі; 4) падзелы Рэчы Паспалітай.

VI. Параўнайце партрэты гістарычных асоб з § 25—28. Чым яны адметныя? Ці можна па знешнім выглядзе вызначыць, хто з іх быў прыхільнікам рэформаў, а хто выступаў за захаванне старых традыцый?

VII. Прывядзіце доказы таго, што другая палова XVIII ст. была для Рэчы Паспалітай часам надзей і расчараванняў. Прыдумайце ўласную назву гэтага перыяду.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Наш край у XVI—XVIII стст.

Гісторыя — гэта спадчына, падмурак і вопыт, абапіраючыся на якія, народы будуюць сваё далейшае жыццё. Памятайце: гісторыя Беларусі мае сваю спецыфіку. Пры гэтым яна цесна звязана з гісторыяй суседніх краін, з'яўляючыся, такім чынам, арганічнай часткай еўрапейскай і сусветнай гісторыі.

У гэты час беларускія землі зазнавалі і вялікія ўзлёты, і самыя крывавыя войны. Але беларускі народ з мужнасцю і гонарам прайшоў праз самыя цяжкія выпрабаванні, перадаўшы нам, нашчадкам, свае найлепшыя традыцыі.

Спадзяёмся, што гісторыя будзе цікавіць вас не толькі на школьных занятках. Магчыма, у далейшым вы пажадаеце даведацца больш пра гісторыю сваёй мясцовасці, сям'і. Вы перадасце ўласныя веды родным і блізкім, каб не прыпынялася сувязь пакаленняў, не згубілася памяць пра людзей і падзеі, важныя для кожнага з нас. Шчыра жадаем вам далейшых поспехаў у вывучэнні нашай мінуўшчыны.

Для лепшага разумення гісторыі таго перыяду, што вы вывучаеце, правядзіце даследаванне па тэме «Лёс маёй мясцовасці ў XVI—XVIII стст.» (для выканання выкарыстайце вучэбны дапаможнік і дадатковы матэрыял).

1. Вызначце, у склад якіх адміністрацыйных адзінак уваходзіла ваша мясцовасць у азначаны час.

2. Складзіце каляндар (ці летапіс) падзей, якія найбольш паўплывалі на лёс вашай мясцовасці ў XVI—XVIII стст.

3. Як паўплывалі культурныя змены XVI—XVIII стст. на развіццё вашай мясцовасці? Ці захаваліся ў вашай мясцовасці гістарычныя і архітэктурныя помнікі XVI—XVIII стст.? Даведайцеся пра іх лёс.

4. Якія знакамітыя асобы XVI—XVIII стст. звязаны з вашай мясцовасцю? Складзіце паведамленне пра іх дзейнасць.

5. Распрацуйце і намалюйце герб вашай мясцовасці, які будзе адлюстроўваць асаблівасці яе развіцця ў XVI—XVIII стст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Выніковае падагульненне

І. Адкажыце на пытанні пры дапамозе картаў атласа, картасхем і тэксту вучэбнага дапаможніка.

1. З якімі краінамі мелі палітычныя і эканамічныя сувязі беларускія землі ў XVI—XVIII стст.?
2. Якія гарады і падчас якіх ваенных канфліктаў былі разбураны ў XVI—XVIII стст.?
3. Пералічыце населеныя пункты, што перажывалі эканамічны росквіт у XVI—XVIII стст. Што гэтаму спрыяла?
4. Якія гарады сталі рэлігійнымі цэнтрамі ў XVI—XVIII стст. і ў чым гэта выяўлялася?
5. Дзе і якую адукацыю было магчыма атрымаць на беларускіх землях у XVI—XVIII стст.?
6. Якія тэрытарыяльныя змены адбыліся з Вялікім Княствам Літоўскім на працягу XVI—XVIII стст.? Якія падзеі на гэта паўплывалі?

ІІ. Намалюйце «стужку часу» і пазначце ў храналагічным парадку (на выбар): 1) даты ваенных канфліктаў XVI—XVIII стст.; 2) гады кіравання манархаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай у XVI—XVIII стст.; 3) час панавання мастацкіх стыляў на беларускіх землях у XVI—XVIII стст.; 4) даты шасці найважнейшых падзей XVI—XVIII стст. у гісторыі беларускіх зямель (на вашу думку); 5) даты рэформаў, што праводзіліся ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай у XVI—XVIII стст.

ІІІ. Размясціце гістарычныя паняцці і з'явы XVI—XVIII стст. па слупках:

1) дзяржаўныя пасады (сістэма кіравання); 2) становішча шляхты; 3) становішча сялян; 4) ваенныя канфлікты; 5) гарадское жыццё; 6) рэлігійнае становішча; 7) архітэктурныя стылі.

Аброк, канцлер, чынш, сарматызм, батлейка, Контррэфармацыя, паншчына, гетман, ракако, манарх, падскарбі, дзякла, дым, канстытуцыя, грош, запрыгоньванне, калегіум, валока, сенат, класіцызм, ліберум вета, магдэбургскае права, магістрат, магнат, кашталян, мануфактура, мястэчка, дысідэнт, павет, Асветніцтва, загоны, прывілей, касінеры, Адраджэнне, Рэфармацыя, даніна, канфесія, ваяводства, барока, сойм, унія, фальварак, федэрацыя, фрэска, цэх, юрыдыка.

Растлумачце свой адказ.

Правообладатель Издательский центр БГУ

IV. Складзіце «медыяазбуку»* на выбар: 1) кіраўнікі ВКЛ і Рэчы Паспалітай у XVI—XVIII стст.; 2) культурныя дзеячы ВКЛ у XVI—XVIII стст.; 3) вучоныя і асветнікі беларускіх зямель у XVI—XVIII стст.; 4) помнікі архітэктуры XVI—XVIII стст. на беларускіх землях; 5) веравызнанні на беларускіх землях.

V. Падрыхтуйце даведнік для замежнага гандляра ці дыпламата XVI—XVIII стст., які б дапамог яму даехаць з іншых краін да любога населенага пункта Беларусі. Складзіце прэзентацыю, прысвечаную аднаму з гэтых месцаў. Вынікі свайго даследавання прапануйце аднакласнікам.

VI. Паразважайце, якія змены адбыліся ў XVI—XVIII стст. у наступных галінах:

1) кірункі знешняй палітыкі; 2) правы шляхты і кіраўніка дзяржавы; 3) правы сялян і мяшчан; 4) знешні выгляд гарадоў; 5) архітэктурныя стылі; 6) рэлігійнае становішча розных колаў насельніцтва; 7) сістэма навучання; 8) мастацтва.

VII. Прывядзіце 5—6 доказаў таго, што на падзеі на беларускіх землях паўплывалі з'явы і працэсы сусветнай гісторыі. Якія асаблівасці мелі гэтыя падзеі на тэрыторыі Беларусі? Свой адказ пацвердзіце прыкладамі.

VIII. Падрыхтуйце 5—6 пытанняў для гістарычнай віктарыны па асноўных падзеях гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ў XVI—XVIII стст.

IX. Якія свае веды і ўменні вы б змаглі выкарыстаць у XVI—XVIII стст.? Ці хацелі б вы пражыць у той эпосе тыдзень, месяц, год?

*«Медыяазбука» прадугледжвае падбор слоў па тэме па магчымасці на кожную літару алфавіта. Выконваецца заданне ў форме прэзентацыі. На кожным слайдзе павінны быць літара і ілюстрацыя да пэўнага паняцця, гістарычнай асобы, падзеі і інш. (магчыма і слоўнае апісанне).

Правообладатель Издательский центр БГУ

Тэрміналагічны слоўнік

Адраджэ́нне (Рэнесанс) — эпоха ў гісторыі культуры Еўропы, у тым ліку ў ВКЛ у XVI ст., для якой характэрны свецкі характар культуры, інтарэс да чалавека і яго дзейнасці.

Адукацы́йная каміся́ — установа, створаная для арганізацыі школьнай асветы і кіравання ёю ў Рэчы Паспалітай.

Асве́тніцтва — грамадскі і культурны рух у XVIII ст., прыхільнікі якога выступалі за першынство розуму, адукацыі і навукі ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы.

Баро́ка — мастацкі стыль канца XVI—XVIII ст., які характарызуецца ўрачыстасцю, ускладненасцю формаў, параднасцю, пышным дэкорам.

Батле́йка — лялечны народны тэатр у выглядзе драўлянай скрыні са сцэнай, пашыраны на беларускіх, украінскіх і польскіх землях. Першапачаткова ў ім ставіліся біблейскія сцэнкі падчас калядных святаў. Назва паходзіць ад месца нараджэння Ісуса Хрыста — Віфлеема (Бетлеема).

Белару́ска-літо́ўскае летапіса́нне — комплекс пісьмовых помнікаў, прысвечаных гісторыі ВКЛ і створаных на беларускіх і літоўскіх землях.

Белару́ская наро́днасць — этнічная супольнасць, якая склалася ў XIV—XVI стст., калі беларускія землі ўваходзілі ў склад ВКЛ; першы этап фарміравання беларускага народа.

Вало́ка — зямельная мера, роўная прыблізна 21,36 га, і адзінка падаткаабкладання ў ВКЛ, уведзеная падчас аграрнай рэформы сярэдзіны XVI ст.

Вало́чная паме́ра — аграрная рэформа ў ВКЛ у XVI — першай палове XVII ст.; комплекс мерапрыемстваў па ўдасканаленні сістэмы землекарыстання і абкладання сялян павіннасцямі.

Ваяво́да — намеснік вялікага князя, адміністрацыйны, ваенны, гаспадарчы і судовы кіраўнік ваяводства.

Ваяво́дства — найбуйнейшая адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў ВКЛ у XV—XVIII стст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Ві́ленскае баро́ка — умоўная назва своеасаблівага стылю ў культавай архітэктуры беларускіх зямель, для якога характэрны пластычнасць аб'ёму, шмат'ярусныя ажурныя вежы, пышнае аздабленне фасадаў.

Гало́ўны Трыбуна́л Вялі́кага Кня́ства Літо́ўскага — найвышэйшы апеляцыйны суд ВКЛ, які пачаў працаваць у 1582 г.

Гаспада́р — ганаровае званне вялікіх князёў літоўскіх.

Гва́лты (згоны) — адпрацовачная павіннасць, неадкладныя работы, выкліканыя стыхійнымі бедствамі, пажарамі, паводкамі і інш.

Ге́тман — адна з найвышэйшых службовых пасад у ВКЛ; кіраўнік войска ВКЛ (вялікі гетман) і яго намеснік (польны гетман), член Паноў-Рады.

Гі́льдыя (купецкае брацтва) — у ВКЛ прафесійнае аб'яднанне гандляроў аднаго горада для абароны сваіх прафесійных інтарэсаў.

Грош — грашовая адзінка ў ВКЛ, часцей за ўсё ў выглядзе срэбнай манеты.

Дзя́кла — прадуктовы падатак у ВКЛ, які сяляне выплачвалі свайму землеўласніку.

Дзяржа́ўца — кіраўнік малога намесніцтва (дзяржавы).

Дысідэ́нт (літаральна — нязгодны) — назва ўсіх хрысціян-некаталікоў у Рэчы Паспалітай.

Езуі́ты — члены каталіцкага манаскага ордэна Таварыства Ісуса, які дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі з 1569 г.

Заго́ны — назва казацкіх атрадаў у войску Багдана Хмяльніцкага.

Залаты́я шляхе́цкія во́льнасці — комплекс выключных палітычных, асабістых і іншых правоў шляхецкага саслоўя ў Рэчы Паспалітай. Галоўнымі сярод іх былі правы выбару караля і ліберум вета.

Запрыго́ньванне сяля́нства — працэс ператварэння свабодных сялян у прыгонных; страта імі асабістай свабоды.

Зло́ты (залаты) — грашовая і лікавая адзінка ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Яго курс у розныя часы значна мяняўся.

Знаць — прывілеяваная група насельніцтва, якая вылучалася старажытнасцю свайго паходжання, заслугамі перад дзяржавай і высокім становішчам у грамадстве.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Інкарпара́цыя — далучэнне зямель адной дзяржавы да тэрыторыі іншай.

Інтэрве́нцыя — гвалтоўнае ўварванне без абвяшчэння вайны войска адной ці некалькіх дзяржаў у іншую дзяржаву.

Інтэрме́дыя — невялікая п'еса, звычайна камічнага ці побытавага характару на беларускай ці польскай мовах, якая разыгрывалася ў перапынку паміж дзеямі спектакля.

Іслам — адна з сусветных рэлігій, якую на беларускіх землях вызнавалі татары.

Іўдаі́зм — рэлігія яўрэйскага народа.

Каза́кі — асабіста свабоднае насельніцтва паўднёвых (украінных) зямель Рэчы Паспалітай. Іх асноўнай павіннасцю з'яўлялася ваенная служба і абарона межаў дзяржавы. Характэрнай рысай казакаў была адданасць праваслаўнай веры.

Калегіум — езуіцкая (альбо створаная па яе ўзоры) сярэдняя навучальная ўстанова.

Канстыту́цыя — збор найважнейшых пастаноў, прынятых соймам.

Канфедэра́цыя — часовы саюз шляхты ў Рэчы Паспалітай, які заключаўся дзеля дасягнення пэўных палітычных мэтаў.

Канфе́сія — кірунак, плынь у межах той ці іншай рэлігіі. У хрысціянстве існуюць такія канфесіі, як каталіцтва, праваслаўе, уніяцтва, пратэстантызм.

Ка́нцлер — кіраўнік канцылярыі вялікага князя і Паноў-Рады, захавальнік дзяржаўнай пячаткі, член Паноў-Рады, адна з найвышэйшых службовых пасад у ВКЛ.

Касіне́ры — сяляне, узброеныя косамі, удзельнікі паўстання 1794 г.

Кірма́ш — форма арганізацыі гандлю, буйны́ з'езд купцоў і гандляроў, які праводзіўся ў гарадах, звычайна некалькі разоў на год.

Класіцы́зм — мастацкі стыль, заснаваны на выкарыстанні антычнай спадчыны як ідэальнага ўзору. Для яго характэрны строгія геаметрычныя абрысы, выкарыстанне калон і трохкутнага порціка. Панаваў на беларускіх землях у апошняй чвэрці XVIII — першай палове XIX ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Контррэфарма́цыя — рэлігійна-палітычны рух у другой палове XVI—XVII ст., накіраваны супраць Рэфармацыі.

Лі́беру́м ве́та (свабоднае «забараняю») — права пасла аднаасобна спыніць працу сойма ці сойміка. У час дзеяння гэтага права ўсе соймавыя рашэнні былі павінны прымацца аднагалосна.

Магдэбу́ргскае пра́ва — сістэма кіравання гарадскіх паселішчаў, якая прадугледжвала вялікую ступень іх самастойнасці. Узнікла ў г. Магдэбург-на-Майне (Германія).

Магістра́т — выбарны орган улады ў гарадах з магдэбургскім правам.

Магна́т — буйны́ землеўласнік, прадстаўнік знаці, які займаў высокую пасаду і адыгрываў значную ролю ў грамадска-палітычным жыцці дзяржавы.

Мана́рх — адзінаўладны спадчынны ці выбарны пажыццёвы кіраўнік дзяржавы.

Мануфакту́ра — прадпрыемства, дзе выкарыстоўваецца падзел працы і ручная рамесная праца.

Маршала́к зе́мскі (найвышэйшы) — адна з найвышэйшых пасад ВКЛ. Арганізоўваў працу велікакняжацкай Рады і сойма і сачыў за парадкам на іх пасяджэннях.

Мы́та — грашовая пошліна, якая спаганялася з гандляроў за правоз тавараў праз дзяржаўную мяжу, а таксама за права гандлю ў гарадах.

Място́чка (ад старабеларускага слова «места» — горад) — невялікае аграрна-гандлёвае паселішча, якое спалучала ў сабе рысы горада і вёскі.

Наме́снік — прадстаўнік вялікага князя ў пэўнай вобласці дзяржавы (намесніцтве).

Паве́т — адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў Вялікім Княстве Літоўскім, звычайна складала частку ваяводства.

Павято́вы со́ймік — мясцовы орган улады ў ВКЛ у XVI—XVIII стст., у працы якога маглі браць удзел усе шляхціцы павета.

Падска́рбі зе́мскі — адзін з найвышэйшых ураднікаў ВКЛ, адказваў за дзяржаўны скарб.

Па́ншчына — адпрацовачная павіннасць сялян, апрацоўка панскай зямлі ўласнымі прыладамі працы і цяглавай жывёлай.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Паны́-Ра́да — орган дзяржаўнай улады ў Вялікім Княстве Літоўскім. Складаўся з вышэйшых дзяржаўных ураднікаў (паноў).

Пасо́льская ізба́ — ніжняя палата сойма Рэчы Паспалітай. Складалася з выбарных прадстаўнікоў (паслоў) ад шляхты кожнага павета.

Паспалі́тае руше́нне — шляхецкае апалчэнне, абавязковая ваенная павіннасць землеўласнікаў у ВКЛ. Збіралася напярэдадні ці ў час вайны.

Паспо́льства — сярэдні пласт гарадскога насельніцтва.

Пастая́нная Ра́да — орган выканаўчай улады, першы агульны ўрад ВКЛ і Польшчы.

Пата́ш — прадукт перапрацоўкі попелу, які выкарыстоўваецца для вырабу ўгнаенняў.

Пія́ры — каталіцкі манаскі ордэн, мэтай якога было выхаванне юнацтва праз стварэнне шырокай сеткі калегіумаў.

Праваслаўныя бра́цтвы — рэлігійна-дабрачынныя арганізацыі праваслаўнага насельніцтва ў ВКЛ, створаныя для абароны веры і правоў праваслаўных.

Прывіле́й — дакумент, які надае асобе, пэўнай сацыяльнай групе ці адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы выключныя правы ў той ці іншай сферы.

Пры́мас (ад лац. «першы») — ганаровы тытул кіраўніка Каталіцкага касцёла ў Рэчы Паспалітай.

Ракако́ — мастацкі стыль, які сфарміраваўся ў межах барока і для якога ўласцівая асаблівая ўвага да дэкаратыўнасці, вытанчанасці.

Ро́каш — від узброенай шляхецкай апазіцыі каралеўскай уладзе ў Рэчы Паспалітай у XVI—XVIII стст.; канфедэрацыя, накіраваная супраць манарха.

Рэспубліка́нцы — шляхецкая палітычная групоўка ў Рэчы Паспалітай у канцы XVII — пачатку XVIII ст. Яе прыхільнікі дамагаліся рэальнай палітычнай роўнасці шляхты і магнатаў. Гэта было магчымым пры абмежаванні правоў вышэйшых дзяржаўных ураднікаў і магнатаў.

Рэфарма́цыя — рэлігійны, сацыяльны і палітычны рух, накіраваны супраць засілля Каталіцкага касцёла ва ўсіх сферах жыцця.

Сарматы́зм — сістэма поглядаў шляхецкага саслоўя ў Рэчы Паспалітай. Яна грунтавалася на канцэпцыі паходжання шляхты ад стара-

Правообладатель Издательский центр БГУ

жытнага племя сарматаў. Тым самым абгрунтоўваліся яе асаблівыя маральныя якасці, надзвычайныя становішча і правы ў дзяржаве.

Сармáцкі партрэ́т — парадная выява, якая падкрэслівае высакароднае паходжанне шляхціца і яго заслугі перад дзяржавай.

Сенáт — найвышэйшая палата сойма. Складалася з найвышэйшых духоўных і свецкіх службовых асоб, прызначаных каралём пажыццёва на свае ўрады.

Слабадá — 1) поўнае альбо частковае вызваленне сялян ад павіннасцяў на пэўны тэрмін, як правіла, на некалькі гадоў; 2) паселішча, дзе жылі людзі, якія атрымалі такое вызваленне.

Сойм — найвышэйшы орган прадстаўнічай шляхецкай улады ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

Стáраста — намеснік вялікага князя, кіраўнік адміністрацыі ў старастве і павеце.

Стáраства — дзяржаўнае намесніцтва сярэдніх памераў у ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Часам перадавалася ў часовае карыстанне феадалам за службу. У такім выпадку трымальнік староства аддаваў чацвёртую частку прыбыткаў на ўтрыманне войска.

Статýт Вялі́кага Кня́ства Літóўскага — асноўны закон ВКЛ.

Сяля́не-слýгі — катэгорыя сялян, якія заставаліся асабіста вольнымі і выконвалі службы, якія патрабавалі большай кваліфікацыі, чым павіннасці іншых катэгорый сялян.

Талакá — народны звычай калектыўнай працы. Землеўласнікі-феадалы выкарыстоўвалі яе для таго, каб прымусіць сялян выконваць тэрміновыя сезонныя работы: жніво, касьбу і інш.

Ýнія — аб'яднанне, саюз. Вылучаюцца наступныя яе віды: 1) асабістая — саюз дзяржаў, на чале якіх стаіць адзін чалавек (манарх); 2) міждзяржаўная — саюз дзвюх ці некалькіх дзяржаў; 3) рэлігійная (царкоўная) — саюз дзвюх ці некалькіх канфесій (цэркваў), якія належаць да адной рэлігіі.

Урáд — дзяржаўная пасада.

Урáднік — чалавек, які займае кіроўную пасаду на дзяржаўнай альбо прыватнай службе.

«Устáва на валóкі» — адзін з галоўных дакументаў аграрнай рэформы XVI ст. — валочнай памеры.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Фальва́рак — феадальная панская гаспадарка, заснаваная на працы залежных сялян і арыентаваная на вытворчасць збожжа на продаж.

Фальва́ркава-па́ншчынная сістэ́ма — сістэма вядзення гаспадаркі, якая грунтавалася на нясенні залежнымі сялянамі паншчыннай павіннасці ў фальварку.

Федэра́цыя — адзіная саюзная дзяржава, створаная на добраахвотнай аснове, з адзіным заканадаўствам, агульнымі органамі ўлады і кіравання.

Фрэ́ска — роспіс вадзянымі фарбамі па вільготнай тынкоўцы.

Цэх — аб'яднанне рамеснікаў адной ці сумежных спецыяльнасцяў у гарадах для абароны сваіх прафесійных інтарэсаў.

Чынш — фіксаваны грашовы падатак.

Шко́льны тэа́тр — тэатр, які дзейнічаў пры навучальных установах (школах, калегіумах і інш.).

Шля́хта — прывілеяванае саслоўе ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Яе галоўнымі правамі і прывілеямі былі ўдзел у палітычным жыцці і валоданне зямельнымі маёнткамі, а асноўнай павіннасцю — нясенне ваеннай службы.

Шышы́ — сяляне-партызаны, якія дзейнічалі на беларускіх землях у часы вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг.

Эканó мія (сталовая эканомія) — буйны́ дзяржаўны маёнтак, прыбыткі з якога ішлі на ўтрыманне каралеўскага двара і асабістыя патрэбы караля («на стол»).

Юрыды́ка — частка горада, якая знаходзілася пад уладай магната ці царкоўнай арганізацыі і не падпарадкоўвалася адміністрацыйнай і судовай уладзе магістрата.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Асноўныя даты і падзеі XVI—XVIII стст.

1492 г.	Прывілей вялікага князя літоўскага Аляксандра. Пашырэнне правоў Паноў-Рады
1500—1503 гг.	Вайна з Рускай дзяржавай
5 жніўня 1506 г.	Бітва пад Клецкам
1508 г.	Мяцеж М. Глінскага
1512—1522 гг.	Вайна з Рускай дзяржавай
8 верасня 1514 г.	Бітва пад Оршай
6 жніўня 1517 г.	Выданне Ф. Скарынам у Празе першай друкаванай беларускай і ўсходнеславянскай кнігі
1529 г.	Зацвярджэнне I Статута Вялікага Княства Літоўскага
1534—1537 гг.	Вайна з Рускай дзяржавай
1553 г.	Заснаванне ў Берасці М. Радзівілам Чорным першай кальвінісцкай абшчыны (збору) на беларускіх землях
1557 г.	Выданне «Уставы на валокі» — асноўнага дакумента аграрнай рэформы (валочнай памеры)
1558—1583 гг.	Лівонская вайна
1563 г.	Захоп Полацка войскамі Івана Грознага
Студзень 1564 г.	Бітва пад Чашнікамі
1566 г.	Зацвярджэнне II Статута Вялікага Княства Літоўскага
1 ліпеня 1569 г.	Абвяшчэнне Люблінскай уніі — аб'яднанне Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага ў Рэч Паспалітую абодвух народаў

Правообладатель Издательский центр БГУ

1579 г.	Вызваленне Полацка Стафанам Баторыем
1579 г.	Стварэнне Віленскай езуіцкай акадэміі
Студзень 1582 г.	Заключэнне Ям-Запольскага перамір'я з Расійскай дзяржавай
1588 г.	Зацвярджэнне III Статута Вялікага Княства Літоўскага
1596 г.	Берасцейскі царкоўны сабор і заключэнне Берасцейскай царкоўнай уніі
1600—1629 гг.	Вайна Рэчы Паспалітай са Швецыяй
1605 г.	Бітва пад Кірхгольмам
1606, 1610 гг.	Выступленні гараджан у Магілёве
1609 г.	Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай ў Расійскую дзяржаву
1618 г.	Дэвулінскае перамір'е з Расійскай дзяржавай
1623 г.	Антыўніяцкае паўстанне ў Віцебску
1632—1634 гг.	Смаленская вайна
1634 г.	Палянаўскае перамір'е з Расійскай дзяржавай
1648—1651 гг.	Казацка-сялянская вайна на беларускіх землях
31 ліпеня 1649 г.	Бітва пад Лоевам
6 ліпеня 1651 г.	Бітва пад Лоевам
1651 г.	Белацаркоўскі дагавор запарожскіх казакаў з Рэччу Паспалітай
1654—1667 гг.	Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай
1655 г.	Кейданская унія

Правообладатель Издательский центр БГУ

Лістапад 1656 г.	Віленскае пагадненне
30 студзеня 1667 г.	Андросаўскае перамір'е з Расійскай дзяржавай
1700—1721 гг.	Паўночная вайна
28 верасня 1708 г.	Бітва пры в. Лясной
1764 г.	Пачатак эканамічных і палітычных рэформаў у Рэчы Паспалітай
1767 г.	Стварэнне праваслаўна-пратэстанцкай канфедэрацыі ў Слуцку і пратэстанцкай у Торуні
1768 г.	Стварэнне Барскай канфедэрацыі
1772 г.	Першы падзел Рэчы Паспалітай
1773 г.	Стварэнне ў Рэчы Паспалітай першага ў Еўропе міністэрства асветы — Адукацыйнай камісіі
1776 г.	Выхад у свет першага перыядычнага выдання на беларускіх землях — «Газеты Гродзеньскай»
1788—1792 гг.	Дзейнасць Чатырохгадовага сойма
3 мая 1791 г.	Зацвярджэнне Канстытуцыі Рэчы Паспалітай
Май 1792 г.	Стварэнне Таргавіцкай канфедэрацыі
1793 г.	Другі падзел Рэчы Паспалітай
1794 г.	Паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі
1795 г.	Трэці падзел Рэчы Паспалітай

Правообладатель Издательский центр БГУ

Спіс рэкамендаванай літаратуры

Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. — Мінск, 1993.

Белазаровіч, В. А. Гісторыя Беларусі: другая палова XVI — канец XVIII ст.: 8-ы кл: хрэстаматыя: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. А. Белазаровіч. — Мазыр, 2015.

Беларускія летапісы і хронікі. — Мінск, 1997.

Бохан, Ю. М. Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV — канцы XVI ст. / Ю. М. Бохан. — Мінск, 2008.

Варонін, В. А. Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага: 7-ы кл.: дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / В. А. Варонін. — Мінск, 2010.

Вялікае Княства Літоўскае: энцыкл.: у 3 т. — Мінск, 2005—2010.

Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. — Мінск, 2009. — Т. 2.

Галенчанка, Г. Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар / Г. Я. Галенчанка. — Мінск, 1993.

Гарады і вёскі Беларусі: энцыкл.: у 15 т. — Мінск, 2004—2011.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Ю. Бохан [і інш.]; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 2007—2011. — Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага княства Літоўскага. — 2008.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Ю. Бохан [і інш.]; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 2007—2011. — Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII—XVIII стст.). — 2007.

Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. — Мінск, 1987—1994. — Т. 2: Другая палова XVI — канец XVIII ст. — 1988.

Емяльянчык, У. Паланэз для касінераў / У. Емяльянчык. — Мінск, 1994.

Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі: ад старажытнасці да пач. XX ст. — Мінск, 1995.

Кудраўцава, С. А. Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай: 8-ы кл.: дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / С. А. Кудраўцава. — Мінск, 2010.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыкл. давед. — Мінск, 1995.

Мяснікоў, А. Ф. Сто асоб беларускай гісторыі: гіст. партрэты / А. Ф. Мяснікоў. — Мінск, 2008.

Прокошина, Е. С. Казимир Лыщинский / Е. С. Прокошина, В. Ф. Шалькевич. — Минск, 1986.

Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск, 2001.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. — Мінск, 1993—2003.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Змест

Прадмова 3
РАЗДЗЕЛ І. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI ст. 5
§ 1. Развіццё дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага 6
§ 2. Палітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага 12
§ 3. Гаспадарчае развіццё 19
§ 4. Змены ў грамадстве 26
§ 5. Царква і рэлігія 33
§ 6. Культура 39
Падагульненне да І раздзела 45
РАЗДЗЕЛ ІІ. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XVI — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII ст. 47
§ 7. Лівонская вайна 48
§ 8. Утварэнне Рэчы Паспалітай 54
§ 9. У дзяржаве «абодвух народаў» 60
§ 10. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст. 66
§ 11. Сельская гаспадарка 73
§ 12. Гарадское жыццё 79
§ 13. Рэфармацыя і Контррэфармацыя 87
§ 14. Берасцейская царкоўная унія 93
§ 15. Культура 100
§ 16. Этнічныя працэсы 107
Падагульненне да ІІ раздзела 112
РАЗДЗЕЛ ІІІ. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVIII ст. 115
§ 17. Казацка-сялянская вайна 1648—1651 гг. на беларускіх землях 116
§ 18. Беларускія землі ў вайне Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. 122
§ 19. Асаблівасці развіцця беларускіх зямель у апошняй трэці XVII ст. 129
§ 20. Паўночная вайна 1700—1721 гг. на беларускіх землях 135

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 21. Грамадска-палітычнае жыццё ў першай палове XVIII ст. ... 141
§ 22. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў першай палове XVIII ст. ... 147
§ 23. Адукацыя, навука і грамадска-палітычная думка ... 153
§ 24. Літаратура і мастацтва ... 158
Падагульненне да III раздзела ... 165
РАЗДЗЕЛ IV. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII ст. ... 167
§ 25. Эканамічнае развіццё ... 168
§ 26. Палітычны крызіс у Рэчы Паспалітай ... 174
§ 27. Спробы палітычных рэформаў у Рэчы Паспалітай ... 181
§ 28. Паўстанне 1794 г. на беларускіх землях ... 186
§ 29. Культура ... 191
Падагульненне да IV раздзела ... 197
Наш край у XVI—XVIII стст. ... 198
Выніковае падагульненне ... 199
Тэрміналагічны слоўнік ... 201
Асноўныя даты і падзеі XVI—XVIII стст. ... 208
Спіс рэкамендаванай літаратуры ... 211

Правообладатель Издательский центр БГУ

(Назва ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі)

Вучэбны год	Імя і прозвішча навучэнца	Клас	Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні	Адзнака навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам
20 / 20				
20 / 20				
20 / 20				
20 / 20				
20 / 20				
20 / 20				

Правообладатель Издательский центр БГУ

Вучэбнае выданне

Варонін Васіль Аляксеевіч
Скеп'ян Анастасія Анатольеўна
Мацук Андрэй Уладзіміравіч
Краўчанка Вольга Віктараўна

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ
XVI—XVIII стст.

Вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Галоўны рэдактар *Н. Г. Шчарбакова*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Камп'ютарная вёрстка і тэхнічнае рэдагаванне *А. У. Смалюк*
Карэктары *В. Р. Ермаковіч, А. Ф. Каравай, Н. Б. Кучмель*

Падпісана ў друк 05.09.2017. Фармат 70×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 15,79+0,29 форз. Ул.-выд. арк. 9,10+0,40 форз. Тыраж 20 340 экз. Заказ .

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных
выданняў № 1/159 ад 27.01.2014. Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». Пасведчанне аб дзяржаўнай
рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Правообладатель Издательский центр БГУ